№№59–60
(2787–2788)

18 красавіка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Народная Воля

На простор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

Ангела Меркель — пра Беларусь

Федэральны канцлер Германіі спадарыня Меркель выказала сваю заклапочанасць тым, як развіваецца сітуацыя ў Беларусі, і заявіла, што трэба знаходзіць шляхі падтрымкі дэмакратычнай апазіцыі ў Беларусі, трэба як мага больш распаўсюджваць інфармацыю пра Беларусь, каб людзі, якія сёння знаходзяцца ў беларускіх турмах паводле палітычных матываў, не адчувалі сябе ў адзіноце.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА: «У любым выпадку з'езд адбудзецца»

На 20 красавіка прызначаны з'езд Аб'яднанай дэмакратычнай партыі. Аднак яшчэ ў мінулы аўторак (калі нумар газеты рыхтаваўся да друку) пытанне аб памяшканні так і не было вырашана.

— Тэхнічнае пытанне пераўтварылася ў палітычнае, — сказаў "Народнай волі" старшыня АГП **Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА**. — Мы выканалі ўсё, чаго ад нас патрабуюць закон і статут. Партыя зарэгістравана ў Міністэрстве юстыцыі, на працягу некалькіх месяцаў праходзілі справаздачна-выбарчыя сходы, абласныя канферэнцыі, на з'езд вылучана 220 дэлегатаў. Аднак за 5 дзён да мерапрыемства нам так ніхто і не даў адказу, дзе мы можам правесці з'езд. Гарадскія ўлады парушылі закон. Бо павінны былі даць альбо станоўчы, альбо адмоўны адказ яшчэ ў панядзелак. Мы звярталіся да розных суб'ектаў гаспадарання і атрымалі 23 адмовы ў памяшканні. Хоць, натуральна, што дэ-факта пытанне вырашалася на ўзроўні Мінгарвыканкама. Я гэта расцэньваю толькі як правакацыю. Беларускія ўлады зрабілі ўсё, каб ці то сарваць з'езд, ці то стварыць максімальныя перашкоды ў яго арганізацыі і правядзенні. Аднак у любым выпадку з'езд адбудзецца, але гэта ўжо будзе мерапрыемства, якое не ўмяшчаецца ў дзеючае заканадаўства. Адказнасць за гэта мы ўскладаем на гарадскія ўлады, аб чым я і праінфармаваў генеральнага пракурора Рыгора Васілевіча і міністра юстыцыі Віктара Галаванава.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

КАМЕРТОН
от Сергея Ваганова

НесЧАСТНЫЙ случай

На прошлой неделе газета "Знамя юности" отмечала свое 70-летие.

Я работал в этой газете почти 15 лет. С начала 60-х годов прошлого века.

Было несколько звонков от давних коллег, получивших красочные приглашения: "Пойдешь?" Накануне торжества я уже уверенно отвечал, что не пойду. Мне передали слова некой дамы, очевидно, отвечавшей за рассылку приглашений: "Нет, его не приглашаем. Он ведь печатается в "Народной воле"..."

Один из позвонивших настаивал:

— Брось, будь выше этого. В конце концов это частный случай...

Случай, подумал я, скорее несчастный.

...Где-то в конце 60-х или начале 70-х годов редакция "Знамени юности" в полном составе отчитывалась в ЦК комсомола. Отчет принимал только ставший секретарем ЦК молодой человек из провинции. Он сидел, сложа на груди короткие руки, изредка поворачивая в сторону Чанина, нашего главного редактора, голову с высокой густоволосой прической, придававшей ему женоподобный вид:

— Неправильная у вас кадровая политика, Виталий Дмитриевич, — вдруг прервал свое монументальное молчание новоиспеченный куратор. — Не слишком ли много в белорусской газете евреев?

Чанин молча собрал свои бумаги и, ни слова не говоря, направился к выходу. За ним встала и ушла вся редакция. Все ушли — и евреи, и неевреи, и партийные и беспартийные...

Молодежь не знает, наверное, что в те годы бушевало пламя беспощадной борьбы с сионизмом, риск поломать судьбу и даже сгинуть без памяти и следа был чрезвычайно велик.

...Умер Чанин. Умерло много славных людей из той "Знаменки". Секретарь же после комсомольской сделал партийную карьеру, был замечен еще в нескольких гадостях, потом попал в лукашенковскую обойму...

Я внимательно прочитал номер, выпущенный к упомянутому юбилею. Вся история газеты свелась, в сущности, к трем десятилетиям — 60—80-м годам прошлого века. С придыханием и даже неким недоумением вспоминается ее тогдашняя популярность. Юбилярам кажется, что просто время было такое, без интернета и ток-шоу по всем каналам ТВ, которые-де и увели нынешнего читателя от газет...

Интернета действительно не было. Были Талант и Совесть.

Не диссидентство, тут выпячивать грудь незачем, и даже не вольнодумство, хотя его было в избытке. Только талант и совесть, обостренное чувство правды и справедливости...

Вальяжно расположившись аж на трех фотографиях, старший товарищ, почему-то представленный читателям юбилейного номера в качестве "товарного знака", учит: "Журналист должен стремиться к двум вещам: достойно зарабатывать на жизнь и неутомимо делать себе журналистское имя".

Пусть не вводит в заблуждение слово "достойно" — контекст очевиден.

А вот о совести старший товарищ сказать постеснялся.

Сказать о совести — значит признать несчастье, которое случилось с белорусской журналистикой. Потому что без таланта и совести настоящей журналистики не бывает.

Сказать о совести — значит признать несчастье, которое случилось с белорусской культурой. Потому что без таланта и совести не бывает настоящей культуры.

Сказать о совести — значит признать несчастье, которое случилось со страной. Потому что без настоящей культуры, в конце концов, может не стать страны. Кто не верит, пусть вспомнит тех, кто загонял Культуру на тот свет, в Куропаты и Соловки, и тех, кто при слове "культура" хватался за пистолет...

Не различия во взглядах, не приверженность разным экономическим, политическим, социальным и эстетическим устремлениям разделили журналистов, писателей, музыкантов, ученых, не говоря уже о политиках.

Разделение произошло по линии совести.

Конформизм, публичная демонстрация лояльности при скрытом от посторонних ушей поношении власти, доносительство, стремление возвыситься самим за счет унижения других...

Вот уже и до "Калыханкі" добрались. Наверное, думают, что отомстили "оппозиционеру" Буравкину.

Отомстили детям — будущему страны.

Вот о чем рассказал бы я молодым журналистам сегодняшней "Знаменки", если бы они меня позвали на свое, только на свое, как им, наверное, показалось, торжество.

Еще рассказал бы о том, что всякий раз, когда в Минск наведывается заезжий гость, я, знакомя его с городом, обязательно показываю Дом печати на главном проспекте. Вроде и не блещет особой стариной (хотя вполне может быть памятником двух советских эпох), а вот что-то притягивает к нему, заставляет думать о скоротечности и в то же время — о непрерывности бытия. Впрочем, я знаю что притягивает — окно на третьем этаже в торце старого, еще довоенного здания. За этим окном — упомянутые 15 лет жизни, которых только и хватило на то, чтобы более-менее освоиться в журналистике...

Еще я упомянул бы про самое удивительное от тех лет — рождение свежего номера газеты. От утренней, в спорах и ругани, планерки, дневной, в бесконечных телефонных трелях, стуке машинок и тарахтении телетайпа, суматохи до всенощного бдения над газетными полосами, торопливой беготни в газетный цех и того счастливого момента, когда, расслабившись на сиденье такси, протягиваешь таксисту пахнущую типографской краской газету:

— Завтрашняя...

— Завтрашняя?!

Вот, собственно, и все, по совести говоря.

kamerton_41@mail.ru

ДЗІКУНСТВА

Ужо больш за дзесяць гадоў запар месячная пенсія Станіслава Шушкевіча складае 3200 рублёў

Днямі наш карэспандэнт пацікавіўся ў Станіслава Шушкевіча, ці не змянілася што-небудзь з яго пенсіяй? Вось яго адказ:

— Памер маёй пенсіі застаецца ранейшым — 3200 рублёў у месяц, хаця, згодна з законам, павінен быць роўным 75 працэнтам ад аклада сённяшняга старшыні парламента.

Але, як вядома, закон — не для ўсіх закон. 9 верасня 1997 года А.Лукашэнка падпісаў Дэкрэт №16, па якім закон не адмяняецца, але фактычна перастае дзейнічаць, а мая пенсія *"ўпарадкоўваецца"* і захоўваецца ў памеры, які яна мела на дзень увядзення згаданага дэкрэта ў дзеянне — 11 верасня 1997 года. Пасля дэнамінацыі і акруглення яна складае сёння, паўтараю, **3200** рублёў у месяц.

Усхваляючы сённяшнюю ўладу, Мікалай Іванавіч Дземянцей, які ўзначальваў Вярхоўны Савет у два разы больш кароткі тэрмін, чым я, атрымоўвае пенсію ў 200 разоў большую. Такім чынам, яшчэ раз пацвярджаецца, што цынізм, помста, уседазвол сталі складнікамі дзяржаўнай палітыкі сённяшняй улады ў Рэспубліцы Беларусь. Як і належыць, усе суды, да якіх я звяртаўся, — ад раённага да Вярхоўнага і Канстытуцыйнага — пацвердзілі правільнасць такога падыходу.

Дарэчы, пасля прызначэння новага старшыні Канстытуцыйнага суда я звярнуўся да яго з такім вось лістом:

Старшыні Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь сп. Міклашэвічу П.П.

Паважаны Пётр Пятровіч, я ведаю, што зварот асобных грамадзян у Канстытуцыйны суд не можа быць падставай для абавязковага яго разгляду, таму спадзяюся на разгляд майго пытання па Вашай ініцыятыве.

Мая пенсія, прызначаная Законам, прынятым Вярхоўным Саветам РБ у 1994 годзе, была "ўпарадкавана" дэкрэтам прэзідэнта ў 1997 годзе. Яе памер пасля "ўпарадкавання" складае 3200 рублёў у месяц. Адным з аўтараў дэкрэта аб "упарадкаванні" быў Ваш папярэднік на пасадзе старшыні Канстытуцыйнага суда — Васілевіч, таму чакаць ад яго якога-небудзь тлумачэння па гэтым пытанні было бессэнсоўным.

Пытанне простае, ці можа лічыцца канстытуцыйным дэкрэт, які насуперак закону робіць дзяржаўную пенсію за асобыя заслугі перад народам (так сказана ў дэкрэце) насмешкай над здаровым сэнсам, правам і чалавекам?

Буду Вам вельмі ўдзячны, калі Вы дасцё адказ на гэту заяву.

У пацвярджэнне таго, што месячная пенсія С.Шушкевіча складае 3200 рублёў (лічы паўтара долара), ён прадставіў рэдакцыі даведку, падпісаную начальнікам упраўлення сацыяльнай абароны адміністрацыі Цэнтральнага раёна г.Мінска Л.Аўдзеевай. У ёй лічбы за 2003—2007 гады. Дакладней, лічба — 3200 рублёў, памер месячнай пенсіі былога старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, прафесара, члена-карэспандэнта Нацыянальнай Акадэміі навук Станіслава Станіслававіча Шушкевіча.



Управление социальной защиты
Администрации Центрального района г.Минска

УПРАВЛЕНИЕ СОЦИАЛЬНОЙ ЗАЩИТЫ

СПРАВКА о размере получаемой пенсии 22.01.2008 г. № 20

Шушкевич Станислав Станиславович, проживающий по адресу: г. Минск, пр-т [illegible], д.78, кв.14 получил пенсию с января 2003 года по декабрь 2007 года в сумме 191996 (сто девяносто одна тысяча девятьсот девяносто шесть) рублей,

в том числе:

Год	2003	2004	2005	2006	2007
Январь	3196	3200	3200	3200	3200
Февраль	3200	3200	3200	3200	3200
Март	3200	3200	3200	3200	3200
Апрель	3200	3200	3200	3200	3200
Май	3200	3200	3200	3200	3200
Июнь	3200	3200	3200	3200	3200
Июль	3200	3200	3200	3200	3200
Август	3200	3200	3200	3200	3200
Сентябрь	3200	3200	3200	3200	3200
Октябрь	3200	3200	3200	3200	3200
Ноябрь	3200	3200	3200	3200	3200
Декабрь	3200	3200	3200	3200	3200
Итого	38396	38400	38400	38400	38400

Пенсия назначена в соответствии со ст.116 закона Республики Беларусь "О Верховном Совете Республики Беларусь".

Начальник управления (подпись) Л.М.Авдеева
М.П.

Дзікунства, што і казаць. Таму вось які ліст накіраваў С.Шушкевіч "сацыяльным абаронцам".



"Сацыяльным абаронцам" Аўдзеевай і Дорахавай.

1. 22 студзеня 2008 года я атрымаў ад вас даведку аб маёй пенсіі за апошнія 5 гадоў, у якой сцвярджаецца, што пенсія ў памеры 3200 рублёў у месяц прызначана мне на падставе арт. 116 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь".

Паважаныя дзяржаўныя чыноўнікі, нельга так зняважліва ставіцца да Вярхоўнага Савета. Вярхоўны Савет прыняў Закон аб прызначэнні мне пажыццёвай пенсіі ў памеры 75% ад аклада дзеючага старшыні парламента.

Прашу выправіць дапушчаную вамі памылку (яна абражае Вярхоўны Савет) і выдаць мне даведку без памылак.

2. Лістом № 153 ад 1 лютага г.г. вы прапануеце мне прасіць сацыяльную пенсію, якая, як вы растлумачылі, перавышае тую, што мне налічваецца, а менавіта складае больш за 3200 рублёў у месяц. Тым самым вы раіце мне адмовіцца ад прызначанай мне Вярхоўным Саветам персанальнай пенсіі.

Дарагія мае чыноўнікі, не ганьбіце мяне, калі ласка, перад прыпіханнымі мяне чалавечую годнасць толькі стрэшўным розум, можна адмовіцца ад персанальнай пенсіі першай асобы ў дзяржаве і прасіць замяніць яе сацыяльнай пенсіяй па ўзросту. Па логіцы рэчаў сацыяльная не можа быць большай, і вы штурхаеце мяне на стрэлы. Да і працоўнай кніжкі ў мяне няма – яна засталася у Сакратарыяце Вярхоўнага Савета.

Таму, дзяржаўныя, высвятліце, нарэшце, на падставе чаго вы налічваеце мне больш за дзесяць гадоў запар так званую персанальную пенсію за асобыя заслугі, якая бясспрэчна з'яўляецца ганьбай як для сістэмы дзяржаўнай сацыяльнай абароны, так і для ўсіх інстытуцый улады, і вышліце, калі ласка, даведку без памылак на мой адрас. Ён ранейшы:

Мінск, 220035, п/с 181.

Са спачуваннем, Станіслаў Шушкевіч

Дарэчы, прадстаўляем на суд чытачоў фрагменты яшчэ з аднаго ліста.



МІНІСТЭРСТВА САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
(Мінсацабароны Беларусі)
220010, г. Мінск, вул. Савецкая, 9
Тэл. 22-61-87, Факс (0172) 22-62-55

МИНИСТЕРСТВО СОЦИАЛЬНОЙ ЗАЩИТЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
(Минсоцзащиты Беларуси)
220010, г.Минск, ул. Советская, 9
Тел. 22-61-87, Факс. (0172) 22-61-55

[illegible] 1998 № [illegible]
На № ___ от ___

Управление социальной защиты Минского горисполкома

О пенсионном обеспечении лиц, имеющих особые заслуги перед народом Республики Беларусь

Доводим до сведения и руководства Указ Президента Республики Беларусь от 29 декабря 1997 г. № 655 «О пенсионном обеспечении и медицинском обслуживании лиц, имеющих особые заслуги перед народом Республики Беларусь»:

«В связи с большим личным вкладом бывших руководителей республики в развитие экономики и социальной сферы Республики Беларусь постановляю:

1. Установить Аксенову Александру Никифоровичу, Дементею Николаю Ивановичу, Кебичу Вячеславу Францевичу, Ковалеву Михаилу Васильевичу, Полякову Ивану Евтеевичу и Соколову Ефрему Евсеевичу пенсии в размере 75 процентов заработной платы Премьер-министра Республики Беларусь.

Сохранить за этими лицами и их членами семей медицинское и санаторно-курортное обслуживание.

Финансирование расходов на указанные цели осуществлять за счет средств республиканского бюджета.

....

В связи с изложенным сообщаем.

1. В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 декабря 1997 г. № 655 пенсии, выплачиваемые Дементею Н.И., Полякову И.Е., Соколову Е.Е., с 29 декабря 1997 г. исчисляются в размере 75 процентов заработной платы Премьер-министра Республики Беларусь по данным о заработной плате Премьер-министра, имеющимся в органах социальной защиты.

В дальнейшем перерасчет пенсий лицам, перечисленным в Указе Президента Республики Беларусь от 9 декабря 1997 г. № 655, следует производить после представления органам социальной защиты новых данных о размере заработной платы Премьер-министра Республики Беларусь со дня ее изменения.

Выплата пенсий, назначенных в соответствии с Указом № 655, производится независимо от факта работы либо занятия предпринимательской деятельностью.

Ліст, з фрагментамі якога вы азнаёміліся, быў падрыхтаваны ў Міністэрстве сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь і адрасаваны Упраўленню сацыяльнай абароны Мінскага гарвыканкама. Няцяжка здагадацца, што з'явіўся ён пасля ўказа прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 1997 года №655 "Аб пенсіённым забеспячэнні і медыцынскім абслугоўванні асоб, якія маюць асобыя заслугі перад народам Рэспублікі Беларусь". Заўважым, даны ўказ шырока не афішаваўся, таму ліст Міністэрства сацыяльнай абароны — гэта своеасаблівае тлумачэнне для тых структур, якія павінны былі прыняць указ для выканання. Нельга не прыкмеціць у ім такую дэталь. Пералічваецца шэраг прозвішчаў асоб, якія яшчэ ў былыя савецкія часы займалі высокія партыйныя і дзяржаўныя пасады, але сярод іх няма экс-старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава Станіслававіча Шушкевіча. Можна па-рознаму ставіцца да былога кіраўніка дзяржавы (як, дарэчы, і да кожнага з пералічаных ва ўказе), але ж афіцыйна ніхто не пазбаўляў яго права атрымліваць пенсію як чалавек, які ў свой час займаў у краіне вышэйшую пасаду. Ён што, здзейсніў злачынства і ў адпаведнасці з пэўным законам пазбаўлены ранейшых рэгалій? Не. Пры падрыхтоўцы ўказа дапушчана памылка, выпадкова знікла прозвішча С.Шушкевіча? Думаецца, справа абсалютна не ў гэтым. У чым? У адносінах аднаго чалавека да другога. Усім вядома, хто ў нас падпісвае ўказы. Як і тое, якіх светапогляду прытрымліваўся і прытрымліваецца С.Шушкевіч.

Калі Станіслаў Станіслававіч Шушкевіч атрымае адказ ад сп.П.П.Міклашэвіча, мы абавязкова папросім яго азнаёміць з ім чытачоў "Народнай волі".

Няўжо ж і далей спадару Шушкевічу будзе штомесяц налічвацца пенсія ў памеры 3200 рублёў, што эквівалентна прыкладна 1,5 долара?

Трымайцеся!

Знакаміты кінарэжысёр Ігар Дабралюбаў перанёс цяжкі інсульт.

Пад канец мінулага года Ігар Міхайлавіч перамог першы інсульт. Ужо планаваў з жонкай правесці лета на прыродзе пад Мінскам. Але 31 снежня здарыўся яшчэ адзін інсульт — больш цяжкі.

Справіцца з хваробай Ігару Міхайлавічу дапамагаюць сям'я, сябры, калегі, з якімі ён зрабіў не адзін дзесятак фільмаў ці якім дапамагаў у прафесіі.

"Народная воля" зычыць рэжысёру знакамітага фільма "Белыя Росы" хутчэйшага выздараўлення. Трымайцеся, шаноўны Ігар Міхайлавіч!

Сустрэнемся з Акуліным, Хатэнка, Вярцінскім і Федарэнкам

Цыкл цікавых імпрэзаў ладзіцца зараз на сядзібе ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны". На сустрэчы са знанымі творцамі прыходзяць аматары нацыянальнай літаратуры. Яны ўжо сустракаліся з паэтамі Сяргеем Законнікавым і Эдуардам Акуліным. А 17 красавіка змогуць паслухаць і пагутарыць з паэткай Антанінай Хатэнка, 24 красавіка — паэтам Анатолем Вярцінскім, 29 красавіка — празаікам Андрэем Федарэнкам.

Сардэчна запрашаем, дарагія госці, па адрасе: Мінск, вул.Румянцава, 13.

Пачатак — у 18.00.

Уваход вольны.

Ірына МАРАЧКІНА.

Адвядзём пагрозу

Як вядома, з 24 красавіка 2008 года ўступае ў сілу Указ прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №533, у адпаведнасці з якім памер арэнднай платы для большасці грамадскіх недзяржаўных арганізацый, якія не займаюцца камерцыйнай дзейнасцю, непамерна павышаецца. Гэты ўказ закране і ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны". Так, напрыклад, толькі за памяшканне, якое займае ТБМ па вул.Румянцава, 13 у Мінску, трэба будзе плаціць 846,5 еўра ў месяц. А яшчэ аплата камунальных паслуг, тэлефона, інтэрнета і гэтак далей.

Што рабіць у гэтым выпадку? Самае простае - - гэта сабраць датэрмінова з'езд, закрыць ТБМ і разбегчыся па хатах, дзе, седзячы на кухнях, можна колькі заўгодна лаяць дзеючую ўладу, якая адным указам знішчае больш за 1000 розных грамадскіх арганізацый.

Я прапаную іншы шлях.

Давайце разам збіраць подпісы грамадзян Беларусі да адпаведных уладных структур з просьбай захаваць для ТБМ былыя памеры арэнднай платы. Гэтыя структуры нам вядомыя, і адпаведныя бланкі зваротаў будуць надрукаваны ў "Народнай волі" і "Нашым слове" і змешчаны на сайце ТБМ. Бланкі таксама можна атрымаць у сядзібе ТБМ па адрасе: Мінск, вул.Румянцава, 13. Калі мы збяром 40--50 тысяч подпісаў, то вынік можа быць станоўчым, такія прэцэдэнты ўжо не раз былі.

Алег ТРУСАЎ,
старшыня ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны".

Народная Воля http://www.nv-online.info
18 КРАСАВІКА 2008 г.

Фракцыя ў БСДП

У Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) з'явіўся аргкамітэт па стварэнні фракцыі "За ўнутрыпартыйную дэмакратыю ў БСДП".

У яго склад увайшлі прадстаўнікі Мінскай гарадской, Магілёўскай і Мінскай абласных партыйных арганізацый.

Стваральнікаў фракцыі не задавальняе стыль кіраўніцтва БСДП, які дэманструюць некаторыя сённяшнія кіраўнікі прэзідыума, адхіленне ад прыняцця партыйных рашэнняў сябраў партыі, якія працуюць у арганізацыйных структурах, не зарэгістраваных і не пастаўленых на ўлік у органах юстыцыі, атмасфера інтрыг, паклёпаў і ўнутранай барацьбы.

Фракцыя ствараецца дзеля аздараўлення БСДП, дзеля будучыні сацыял-дэмакратыі Беларусі і не прымае магчымыя абвінавачванні ў расколе ці разбурэнні партыі.

Віктар КРЫВАЛЬ,
член аргкамітэта.

Мянцюк аб'яўлены ў вышук

Аб'яўлены ў вышук Раман Мянцюк, віноўнік ДТЗ на дарозе Мінск—Мікашэвічы 2 сакавіка.

Пра гэта паведаміў журналістам намеснік міністра ўнутраных спраў Беларусі Віктар Філістовіч.

Як паведамляе БелаПАН, Філістовіча ў гісторыі з ДТЗ на дарозе Мінск—Мікашэвічы здзівіла, што ўсе асудзілі дзеянні супрацоўнікаў, але не вадзіцеля аўтамабіля "Фольксваген-Гольф" Рамана Менцюка, які і ўчыніў ДТЗ. Пры гэтым намеснік міністра прызнаў, што дзеянні супрацоўнікаў міліцыі былі непрафесійнымі, аднак "у іх не было злоснага намеру".

Нагадаем, 2 сакавіка супрацоўнікі ДАІ ўдзельнічалі ў затрыманні п'янага вадзіцеля аўтамашыны "Фольксваген-Гольф" на дарозе Мінск—Мікашэвічы. Па версіі сведак затрымання, яны спрабавалі спыніць аўтамабіль, які рухаўся са значным перавышэннем хуткасці да Мінска, з дапамогай шчыта з грамадзянскіх аўтамабіляў, у якіх знаходзіліся людзі. У дачыненні да чатырох міліцыянераў распачата крымінальная справа па ч.1 арт.424 Крымінальнага кодэкса (злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі).

Саслізнула з падаконніка

У Карме супрацоўнікі МНС выратавалі 30-гадовую жанчыну, якая саслізнула з падаконніка другога паверха і вісела, учапіўшыся рукамі за раму.

Хлопчык, які пазваніў у Кармянскі аддзел па надзвычайных здарэннях (Гомельская вобласць), паведаміў, што маці мыла акно і саслізнула з падаконніка, але паспела схапіцца рукамі за раму і цяпер вісіць над зямлёй.

Як паведаміў БелаПАН прэс-сакратар абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, ратавальнікі паспяшаліся на дапамогу, і праз лічаныя хвіліны пад нагамі жанчыны апынулася лесвіца: *"Хаця вышыня і не была вялікай, удары або, чаго горш, пералом быў бы жанчыне гарантаваны".*

КАНСУЛЬТАЦЫЯ

У Мінску пачаўся чарговы этап барацьбы са спадарожнікавымі антэнамі

Шмат хто з мінскіх уладальнікаў спадарожнікавых антэн днямі атрымаў па пошце "прадпісанні" ад жыллёва-камунальных служб — "у тэрміновым парадку" падаць дакументы, што дазваляюць усталяванне "талерак" і кандыцыянераў.

У прыватнасці, такія паперы прыйшлі жыхарам Савецкага і Першамайскага раёнаў ад кіраўніцтва іх "жыллёва-эксплуатацыйных участкаў".

У выпадку невыканання прадпісання ў належны тэрмін жыллёвыя службы пагражаюць прыцягненнем да адміністрацыйнай адказнасці. Гаворка ідзе пра арт.21.13 КаАП — "Парушэнне архітэктурнага рашэння фасаду будынка альбо пабудовы".

Сітуацыю каментуюць юрысты ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў".

Юрысты БАЖ не раз падкрэслівалі, што нормы новага Адміністрацыйнага кодэкса могуць распаўсюджвацца толькі на падзеі, якія адбыліся пасля ўступлення кодэкса ў сілу — г.зн. 1 сакавіка 2007 года. Такім чынам, калі ў артыкуле 21.13 КаАП размова ідзе пра адказнасць за парушэнне архітэктурнага рашэння фасадаў будынкаў — у тым ліку за ўсталяванне спадарожнікавых антэн, то нормы заканадаўства могуць распаўсюджвацца толькі на тых, хто збіраецца іх усталяваць, а не на тых, хто паспеў зрабіць гэта раней.

"Закон не мае адваротнай сілы, калі пагаршае прававы стан суб'ектаў. У дадзеным выпадку ультыматыўнае патрабаванне ўладаў зняць антэны відавочна парушае інтарэсы грамадзян і дзейнічае насуперак іх інтарэсам. Таму з пункту гледжання заканадаўства можна сцвярджаць, што патрабаванне зняць ужо ўсталяваныя антэны неправамоцнае", — адзначае кіраўнік Цэнтра прававой дапамогі СМІ пры БАЖ Міхаіл Пастухоў.

Аддзяленне амбасады ЮАР з'явіцца ў Мінску

Пра гэта паведаміў Надзвычайны і Паўнамочны пасол Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі ў Беларусі па сумяшчальніцтве Бекі Ланга.

Сёння функцыянуе амбасада ЮАР у Маскве.

БеСТ прададуць туркам?

Буйнейшы аператар мабільнай сувязі ў Турцыі паведаміў аб намеры набыць беларускую дзяржаўную кампанію "БеСТ" — адзінага ў Беларусі аператара сотавай сувязі стандарта GSM, які цалкам належыць дзяржаве.

"Савет дырэктараў Turkcell прыняў рашэнне правесці неабходную падрыхтоўку і прадставіць акцыянерам Беларускай тэлекамунікацыйнай сеткі ("БеСТ") свае прапановы аб набыцці кантрольнага пакета акцый кампаніі", — гаворыцца ў афіцыйнай заяве, размешчанай на сайце кампаніі турэцкай кампаніі.

Інфармацыя аб намеры турэцкага інвестара набыць акцыі ЗАТ "БеСТ" дагэтуль у Беларусі нікім афіцыйна не пацвярджалася.

У ЗАТ "БеСТ" верагоднасць здзелкі з Turkcell не каментуюць.

У лютым на пасяджэнні калегіі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі было заяўлена, што ў ЗАТ "БеСТ" складваецца крытычная сітуацыя як з выкананнем паказчыкаў па паслугах сувязі, так і з фінансавым станам.

Упершыню аб разглядзе магчымасці продажу пакета акцый аператара мабільнай сувязі ЗАТ "БеСТ" А.Лукашэнка публічна заявіў на прэс-канферэнцыі 12 красавіка 2007 года.

Яшчэ тры станцыі метро

Праз тры гады ў Мінску павінны адкрыцца тры новыя станцыі метро — "Міхалава", "Пятроўшчына" і "Грушаўка".

Яны стануць працягам Маскоўскай лініі ў бок "Паўднёвага Захаду" і будуць размешчаныя ўздоўж праспекта Дзяржынскага, паведамляе агенцтва "Минск-Новости".

Бясплатны прафесійны бокс

28 красавіка ў Палацы спорту пройдзе турнір прафесійных баксёраў.

Галоўнай падзеяй спаборніцтваў стане бой паміж срэбным прызёрам Алімпіяды ў Афінах мінчуком **Магамедам Арыпгаджыевым** і ўкраінцам **Васілём Кондарам**. Яны пазмагаюцца за тытул чэмпіёна Еўропы сярод краін, якія не ўваходзяць у Еўрасаюз. Як паведамляе агенцтва "Минск-Новости'", уваход на спаборніцтвы будзе бясплатным.

Цыганскі барон гандлюе алкаголем

Цыганскага барона з Беларусі пакаралі штрафам у Наўгародскай вобласці Расіі.

Праваахоўныя органы выявілі, што Міхаіл Янаш незаконна ўстанавіў гандлёвую кропку на тэрыторыі табара ў горадзе Чудава і рэалізоўваў алкагольныя напоі.

Як паведамляе агенцтва Regnum, цыганская грамада на чале з Янашам "эмігравала" з Беларусі каля 20 гадоў таму. Расійскія ўлады выдзелілі ім зямельныя ўчасткі ў вёсцы Прыдарожнае. Аднак праз некаторы час беларускія цыганы пачалі ўжо без дазволу захопліваць зямлю нават у раённым цэнтры.

Быць альбо не быць заводу гербіцыдаў?

Беларускі ўрад прыме канчатковае рашэнне па будаўніцтве завода гербіцыдаў у Пухавіцкім раёне. Пра гэта заявіла галоўны санітарны ўрач краіны Валянціна Качан.

Як паведамляе БЕЛТА, яна таксама выказала меркаванне, што сітуацыя з запланаваным будаўніцтвам прадпрыемства і масавымі пратэстамі мясцовых жыхароў *"падагравае эмоцыямі, а не разумным сэнсам".*

ПЕЧАЛЬНАЯ ИСТОРИЯ

Игры Фемиды на берегах Двины

В Полоцке во второй раз судят Евгению Бочурную, которая уже отбыла в тюрьме два года по данному обвинению.

ИЗ ПИСЬМА ДИРЕКТОРА ООО "ВИТОРЖЬЕ" ЕВГЕНИИ МИХАЙЛОВНЫ БОЧУРНОЙ В ГЕНЕРАЛЬНУЮ ПРОКУРАТУРУ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ:

"Я находилась под стражей с 31 марта 2006 года по 27 декабря 2007 года и освобождена в связи с применением статьи 7 Закона РБ "Об амнистии некоторых категорий лиц, совершивших преступления".

4 января 2008 года я вновь заключена под стражу на основании документально неподтвержденного указания начальника ГОВД г.Новополоцка Жегланова без официального предъявления мне обвинения.

Постановление Президиума Витебского областного суда содержит прямое указание на ужесточение наказания, так как ***"исходя из объема обвинения, следует признать, что назначенное обвиняемой наказание не соответствует принципам уголовной ответственности в силу мягкости и при новом судебном разбирательстве суду следует учесть данное обстоятельство"****.*

Задача поставлена и четко изложена. За работу, господа в мантиях! И ни капли сомнения, мягкотелости, будьте решительны и тверды! Забудем прошлое, забудем некогда гремевшие на всю страну витебские дела с трагическим финалом. У нас свой путь, своя стезя. Мы нашли ее. О нас уже знают, нас ставят в пример. Расправились с предпринимательницей из Витебска Дворяниновой, поставим на колени и Бочурную. Они первые, но не последние. И пусть ломают перья журналисты, пусть возмущаются юристы. Мы в Придвинском крае хозяева. И никто нам не указ.

Да, журналисты ломали перья. О деле Евгении Бочурной писали многие газеты: от "Витебского курьера" до "Союзного Вече". Но в "Союзном Вече" (№35 за 2007 год) статья Николая Бастова "Большие проблемы малого бизнеса" в белорусском варианте не появилась. Некто убоялся публикации, в которой утверждалось, что *"болезнь, выкашивающая малый бизнес, докатилась и до братской Белоруссии, причем в изощренной форме",* и изъял ее, поставив второстепенный материал. А жаль. В ней было много интересных откровений. Например, таких:

"Евгению Бочурную доставили в СИЗО №2 города Витебска в автозаке как матерую преступницу, в сопровождении более 10 вооруженных милиционеров. Надо было еще подогнать пару бронетранспортеров со спецназом, а к ноге женщины привязать гирю.

После того как брат Бочурной отказался оговаривать сестру и давать против нее показания, следователь Малышев вынес в отношении него постановление о привлечении в качестве подозреваемого и пригрозил, что против него также возбудит уголовное дело, и они с сестрой "будут перестукиваться через стенки в СИЗО и ИВС".

В Витебске, похоже, вообще страх потеряли. Дошло до того, что подполковник милиции Малышев 16 августа 2006 года в присутствии свидетелей, в том числе и работников контрольно-ревизионного управления, заявил: ***"Указ Президента мне не указ. Я сам здесь указываю, что и как делать, какие вопросы отражать проверяющим КРУ в актах"****. Складывается впечатление, что город вышел из состава Беларуси...*

Как говорят, в Витебске и Витебской области теперь при малейшем намеке предприниматели тут же изыскивают средства, чтобы откупиться от представителей закона. Они понимают, что в случае сопротивления не спасет ничто. Ни законы, ни адвокаты, ни Конституция, ни публикации в республиканских СМИ, ни голодовки...

В Витебске не действуют даже протесты Верховного суда".

Так кто же она, Евгения Бочурная, которую доставили в СИЗО десять вооруженных милиционеров? Какое жуткое преступление совершила? Как дошла до этого?

А дошла до этого, когда в 1991 году сделала ставку на неликвиды. Да, да, на те неликвиды, которые мертвым грузом осели на складах и не находили покупателя. На них давно махнули рукой, не зная, что с ними делать. А Евгения Михайловна нашла им применение, нашла тех, кому они нужны. Сама жизнь выдвинула на авансцену экономической жизни страны специалистов, досконально знающих рынок и умеющих торговать. Бочурная с ее двумя высшими образованиями и природным коммерческим чутьем была именно таким человеком.

Так состоялось общество с ограниченной ответственностью "Виторжье". Сюда потянулись не только плюшкины, сидевшие на ресурсах, но и товаропроизводители. Предложений было много. Всем нравилась гибкая политика фирмы. Она сочетала и безналичный расчет, и бартер, здесь готовы были рассмотреть любое партнерское предложение, сулящее обоюдную выгоду. Поэтому покупатель пошел, как говорится, косяком. Пришлось открывать магазины по всей Витебской области, выходить на рынки России и Украины, поглядывая на страны Запада.

Евгению Бочурную хвалили, ставили в пример. Как лучший предприниматель страны она выступала со статьями в солидных журналах, принимала участие в представительных форумах. Фирма "Виторжье" стала членом Национальной ассоциации промышленников и предпринимателей, членом Торгово-промышленной палаты, стала налогоплательщиком с миллионными отчислениями в бюджет...

И вдруг в средствах массовой информации страны в декабре 2005 года появляется краткая информация:

"Директор одного из новополоцких ООО подозревается в мошенничестве в особо крупном размере. Как считают сотрудники ОБЭП, 51 -летняя руководительница путем обмана и злоупотреблением доверия на протяжении 2004 года "развела" несколько десятков предприятий. Она заключала фиктивные хоздоговора на поставку товарно-материальных ценностей. Бытовая химия, кондитерские изделия, ткани и другие товары реализовывались в розницу, а деньгами директор распоряжалась по своему усмотрению. На сегодняшний день речь идет о сумме более 115 миллионов рублей..."

И хоть фамилия не была названа, но в городе над Двиной сразу догадались, над кем грянул гром. Коллеги по бизнесу знали: у Евгении Бочурной давно возникли проблемы. Они начались еще с 2001 года. Пал знаменитый бартер, зачеты и прочие уродливые явления белорусской экономики. А с ними "легли" и предприятия, которые в своей деятельности использовали их. У фирмы "Виторжье" образовалась большая кредиторская задолженность — свыше миллиарда рублей. Чтобы увеличить доходы, директор организовала производство мягкой мебели, пошив швейных изделий, ремонт автомобилей, возобновила торговлю продуктами питания. Евгения Михайловна искала пути спасения предприятия и своего доброго имени. С этой целью в сентябре 2005 года провела собрание кредиторов фирмы, на котором был составлен план по погашению долгов на протяжении 2006—2007 годов. И план этот стал выполняться.

Но претвориться в жизнь ему не дали. Через два месяца на "Виторжье" началась внеплановая проверка финансово-хозяйственной деятельности. Бухгалтерские документы были изъяты. Все проверялось тщательным образом, однако нарушений законодательства не было выявлено. А что непрошеные гости нашли, об этом Евгения Михайловна сама прекрасно знала: кредиторская задолженность действительно была велика.

Казалось бы, беда миновала, надо работать, исправлять ситуацию. Но весь горизонт уже закрыли мрачные тучи. Сотрудникам ОБЭП города Новополоцка не давала покоя мысль о долгах фирмы. Но печаль их была не о том, как вернуть деньги, а как завернуть. Завернуть дело, громкое, на всю страну! Сразу пойдут благодарности от начальства, посыплются звездочки, начнутся повышения по службе. Забегая вперед, скажем, так оно и получилось. Получилось, после того как следственное управление УВД Витебской области возбудило в отношении директора "Виторжье" ... пять уголовных дел! Это и мошенничество, и хищение путем злоупотребления служебным положением, и должностной подлог... Вот тогда и повезли Бочурную в СИЗО десять вооруженных милиционеров.

Евгения Михайловна, доказывая свою невиновность, написала более 50 жалоб в органы власти области и республики. Она, в частности, заявляла:

"Виторжье" сотрудничало с 629 поставщиками. Во всех договорах с ними предусматривалось, что споры по неисполненным каким-то обязательствам разрешает Хозяйственный суд. С января 2001 года по сентябрь 2005 года только 44 предприятия обратились туда с просьбой о взыскании задолженности. И в то же время фирма выплатила государству налогов на сумму около 500 миллионов рублей...

Выходит, в обычной кредиторской задолженности, полностью или частично нами погашенной, следствие видит мошенничество, хищение, злоупотребление служебным положением. При этом оно не установило ни одного факта, подтверждающего, что я каким-то образом причастна к этим преступлениям. Попытки следствия переквалифицировать образовавшуюся кредиторскую задолженность можно расценить так: под меня идет активный "подбор" уголовных статей. При этом следственная группа разослала кредиторам ООО "Виторжье" требования представить заявления от работников данных предприятий, что я лично приезжала к ним, заключала договора, обещала оплату, получала товар, реализовывала его, а деньги присваивала. Если руководители предприятий-кредиторов отказываются подписывать эти заявления, местные органы милиции принуждают их к этому, угрожают возбуждением уголовных дел по мошенническим действиям в сговоре со мной. Так поступили с руководителем предприятия "Рубон" из Верхнедвинска, консервного комбината из Жлобина, комбината стройматериалов из Гродно и многих других. Доходило до абсурда: руководителя "Рубона" вынуждали дать ложное показание, что я похитила древесные обрезки, реализовала их по спекулятивной цене, а деньги присвоила. На самом деле "Виторжье" закупало эти обрезки для отопления собственной котельной.

Работники Новополоцкого ОБЭП фальсифицируют акты ревизий, изъяли всю бухгалтерскую документацию фирмы, системные блоки компьютеров. Сделали они это с грубым нарушением Уголовно-процессуального кодекса, без предъявления копий и описи изъятых документов. Однажды, воспользовавшись тем, что я поехала в Витебск, они проникли на территорию фирмы, вызвав даже подъемник МЧС, выломали замки и двери в кабинетах офиса, забрали записные книжки работников, тетрадь регистрации исходящих данных, даже вытряхнули бумаги из мусорки.

Обыски прошли не только в офисе, но и у меня дома, в квартирах наших родственников. В моей квартире был сейф, когда его вскрыли, увидели, что там лежат только два партийных билета, мой и мужа".

Муж Евгении Михайловны Владимир Журба, кстати, тоже организатор фирмы "Виторжье", после ареста жены и суда над ней не сидел сложа руки. В одном из кабинетов я увидел гору папок. Показывая их, Владимир Петрович пояснил:

— Вы знаете, я написал около 200 жалоб и обращений на неправомерные действия милиции, прокуратуры, судов, на которые получил формальные отписки. И тогда мы пошли другим путем: стали вести свое расследование. Пока шло судебное следствие, мы снимали копии, ксерокопировали и заводили дела. Каждая строка в них подтверждена подлинными документами, диктофонными записями и стенограммами 63 судебных заседаний. Кроме того, поскольку у нас изъяли документацию и не вернули до сих пор, мы на предприятиях брали дубликаты нормальных накладных, все подсчитывали, проверяли, подшивали документ к документику. И выяснилась неприглядная картина. В 89 томах уголовного дела работниками следственной группы и КРУ вложены 183 сфальсифицированных договора (без печатей, без подписей, без указания цен и способов расчета) и 124 сфальсифицированных накладных (без печатей, без подписей, без голограмм и с фиктивными номерами). В деле имеется недостоверный акт инвентаризации. Всего выявлено 1200 сфабрикованных доказательств. Представляете, 1200! Следствие говорит: вы украли, а между тем выясняется, что не мы, а нам должны. Мы еще в 2005 году рассчитались с рядом кредиторов, а жену обвиняют в неуплате, в хищении. Не надо быть юристом, сразу видно, что следствие по статье 210-й Уголовного кодекса не проводилось. Просто следователь собрал кредиторскую задолженность, собрал оборотно-сальдовые ведомости и поступление товаров за пять лет, включил в обвинение и сказал: злоупотребляла, обманывала, создала лжеструктуры, похитила на одном предприятии 10 тысяч кусков мыла, на другом 10 тысяч шпингалетов, на третьем пять тонн гвоздей. И обвинение готово!

А какая "работа" подготовительная проведена? Вот, смотрите, заявления, их 187, все они подписаны начальником ГОВД города Новополоцка Жегловым. Чего он требует? А он требует от руководителей предприятий заявлений о привлечении Бочурной к уголовной ответственности. Здесь и заранее подготовленные пустографки. Ставь фамилию и заполняй, обвиняй во всех грехах руководительницу "Виторжье". Мы недавно показывали набор всех этих липовых документов прокурору Витебской области господину Дыско. Он только делал удивленное лицо, но они его явно не заинтересовали. Не заинтересовало его даже то, что сотрудники ОБЭП обвинили мою жену в "хищении" транспортных услуг, пени, государственной пошлины, торговой наценки, процентов за пользование чужими денежными средствами. Как это можно похитить? — ума не приложу. А прокурор области только повторял и повторял: у вашей жены 1,5 миллиарда долга. Откуда он взял эту цифру, я не знаю.

— А какова реальная цифра?

— По моим расчетам около 300 миллионов.

— И вы не считаете себя виноватыми?

— Я не говорю, что мы святые, мы наделали много ошибок. Возможно, и товар брали не тот, который надо было брать. Возможно, и реализовывали его плохо. Что поделаешь, такая наша экономика. Но мы не уклонялись от погашения кредиторской задолженности, в чем обвинили мою жену, применив 242 статью Уголовного кодекса, которая на практике не применяется. И не дай Бог, она пойдет в ход с недоброй руки представителей витебской Фемиды. Вы же знаете, сколько кредиторской задолженности у работников агропромышленного комплекса. Речь идет об 11 триллионах рублей. Сколько руководителей сельхозпредприятий могут загреметь на нары! Плохой пример заразителен, только дай отмашку.

ИЗ ГАЗЕТЫ "БЕЛОРУСЫ И РЫНОК" ОТ 17.09.2007 ГОДА.

МНЕНИЕ О ДЕЛЕ Е.М.БОЧУРНОЙ ЗАСЛУЖЕННОГО ЮРИСТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ВАЛЕРИЯ ФАДЕЕВА:

"За просроченные долги, если нет других нарушений, предприниматели во всем мире рассчитываются деньгами или имуществом, но никак не свободой".

Солидарен с Валерием Фадеевым и его коллега, правозащитник Николай Мекеко. Недавно от лица международной организации он подготовил экспертное юридическое заключение по делу руководительницы "Виторжье", которое занимает почти сто печатных страниц. И там сделан однозначный вывод: *"предъявленное обвинение Бочурной Евгении Михайловне является юридически несостоятельным и носит явно выраженный заказной характер, построено на предположениях и фальсификации материалов уголовного дела. В действиях Бочурной Евгении Михайловны отсутствует состав преступления, в связи с чем уголовное дело в отношении нее должно быть прекращено на основании п.2 ст.29 УПК Республики Беларусь, либо постановлен оправдательный приговор".*

Прочитав это, я спросил Николая Михайловича: на чем основаны такие утверждения?

— Исключительно на материалах дела. Вы обратите внимание на игры местной Фемиды: три года прокуратура Витебской области совместно со следственными органами и судом пытаются найти статью в Уголовном кодексе, чтобы осудить предпринимателя республиканского масштаба. Проводится своего рода эксперимент над человеком. Сначала посадили его, а потом начали примерять статьи: одну, вторую, третью, четвертую, пятую.

— Как это можно назвать, Николай Михайлович?

— Неквалифицированным подходом следствия и суда к своим действиям. Вот появляется уголовное дело, явно видно, что хищения нет. 210-я статья ну никак сюда не подходит. Шесть тысяч договоров и только по 200 несвоевременная оплата. Это чуть больше трех процентов. О чем можно говорить? Да любое предприятие возьмите сегодня, они не в состоянии выполнять все те обязательства, которые берут на себя.

— Выходит, руководитель следственной группы управления внутренних дел Витебского облисполкома господин Малышев, который потом пошел на повышение, сел в лужу?

— Есть набор бумажек, но хищения нет. В этом убедился и сам прокурор, который на первоначальном этапе поддерживал обвинение, настаивая на применении 210-й статьи и прося для Бочурной 10 лет лишения свободы. Получился прокол. Что делать? Надо искать другую статью. А как искать? Надо переквалифицировать предъявленное обвинение. А переквалификация требует отправления дела назад, суд не наделен правом переквалификации, если изменяются существенные обстоятельства, изменяется само обвинение. Но у нас все возможно. И судья, отменив статью 210, применяет 424-ю. Бочурная получает шесть лет колонии с конфискацией имущества.

Проходит определенное время, появляется кассационная жалоба на противозаконные действия суда и на то, что со статьей 424-й тоже вышла промашка. Налицо противоречие, когда говорится, что Бочурная действовала в интересах своего предприятия, а статья утверждает обратное. Естественно, судебная коллегия Витебского областного суда пропустить этого не могла. И тут же переквалифицировала действия Евгении Михайловны на статью 242-ю (уклонение от погашения кредиторской задолженности), смягчив наказание до двух лет.

И опять, обратите внимание, 27 декабря 2007 года руководительница "Виторжье" выходит по амнистии на свободу, а за день до этого Президиум областного суда удовлетворил протест прокурора области и вынес постановление: быстренько вернуть Бочурную обратно. То есть отменили приговор и определение в полном объеме и отправили дело на новое рассмотрение по первой инстанции.

И вот на что я хочу обратить внимание. Ответственно говорю: общие суды в хозяйственных делах дилетанты. Отсюда и ляпы такие. Они многих терминов не знают, не знает их и государственный обвинитель. Он представления не имеет о кредиторской и дебиторской задолженности, о расчетах, о проводке и прохождении денег. Но приходит и поддерживает обвинение. Ему задают вопросы, а он молчит, краснеет и бледнеет, не имея представления, о чем идет речь, либо срывается на крик.

— О чем красноречиво свидетельствуют судебные заседания, которые проходят сейчас в Полоцке.

— Да, Бочурную опять обвиняют в хищении. Но для того, чтобы обвинить человека в этом, нужны три момента: время, место и способ хищения. Их нет. И не было. Три года искали — не нашли. А теперь снова берутся за старое. Далее. Из материалов дела усматривается, что полная ревизия всей хозяйственной деятельности ООО "Виторжье" не проводилась. Проведена была выборочная, которая устраивала следствие. Не проводилась даже выборочная инвентаризация. И, главное, все цифры в актах КРУ и обвинения перепутаны, умножены в несколько раз. А раз нет полной ревизии, нельзя говорить о правомерных или неправомерных действиях Бочурной. Более того, размер хищения определить невозможно, невозможно определить недостачу — их никто не проверял. Куда ни кинь — везде клин. Тогда зачем огород городить, когда и материалов-то настоящих нет? Но у нашего следствия все возможно...

ИЗ ГАЗЕТЫ "СОЮЗНОЕ ВЕЧЕ" №35 ЗА 2007 ГОД

"Был бы человек — статья найдется. Все уже зашло слишком далеко, и те, кто отправил ее в тюрьму, понимают, что если она выйдет, они могут сесть...

Вышеизложенное похоже на бред сумасшедшего. Складывается впечатление, что следователи и судьи Витебска имеют три класса образования и не разбираются в законодательстве. Но это на первый взгляд. Если копнуть глубже, то становится понятно, что витебские "деятели" умышленно поставили себя над законом".

Игры Фемиды на берегах Двины продолжаются.

Евгений СОЛОВЬЕВ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
18 КРАСАВІКА 2008 г.

Разгон

Падзеі, пра якія расказваецца ніжэй, адбыліся неўзабаве пасля прыходу да ўлады прэзідэнта А.Лукашэнкі

(Працяг. Пачатак у №№55—56.)

Юрась БЕЛЕНЬКІ

Хлопцы, ці патрэбны вам лідэр?

...З моманту ўтварэння апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце XII склікання мы вызначылі галоўную задачу, якой падпарадкоўвалася ўся наша далейшая дзейнасць: дасягнуць незалежнасці, збудаваць дэмакратычную беларускую дзяржаву. Найвялікшы крок на шляху да гэтай мэты мы зрабілі 25 жніўня 1991 года, калі Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь атрымала статус канстытуцыйнага закона.

У Вярхоўным Савеце мы, апазіцыя БНФ, фактычна былі лакаматывам, які цягнуў усіх астатніх. Праца ў апазіцыі БНФ над новымі законамі ішла ўвесь час, у ёй удзельнічалі як непасрэдна дэпутаты, так і эксперты, пераважна з сяброў Фронту. Апазіцыя БНФ распрацавала і прапанавала ў ВС законы аб уласнасці, аб зямлі, аб грамадзянстве, аб банках і банкаўскай дзейнасці і г.д. Па прынцыповых момантах, у асноўным у сувязі са стварэннем дзяржаўных інстытутаў незалежнай Беларусі, і ішло змаганне паміж камуністычна-наменклатурнай большасцю і апазіцыяй БНФ.

Мы сапраўды "валаклі" за сабой Вярхоўны Савет. Зянон Пазьняк дык зусім працаваў на знос. Я не ведаю, ці спаў ён калі. Часам даводзілася за ноч рабіць пэўныя законапраекты, бо ў нас была толькі ноч, між тым як наменклатура ў сваіх структурах, можа, месяц рыхтавала нейкі праект, а потым, парушаючы рэгламент, выносіла яго на пленарнае пасяджэнне. Паводле ўзроўню падрыхтаванасці да працы ў парламенце Зянон Пазьняк на галаву, а то і на дзве пераўзыходзіў астатніх дэпутатаў. Ён не толькі стварыў апазіцыю БНФ у Вярхоўным Савеце, але і быў яе кіраўніком, распрацоўваў стратэгію і тактыку.

Да 1994 года Кебіч без цяжкасцяў узяў наменклатурную большасць Вярхоўнага Савета пад свой кантроль — амаль усе гэтыя дэпутаты працавалі ў структурах выканаўчай улады, у непасрэдным падначаленні прэм'еру. Эканамічная, асабліва грашова-крэдытная, палітыка Кебіча выклікала шмат нараканняў: абсалютна відавочна, яна несла вялікую шкоду Беларусі і праводзілася на карысць Расіі. У выніку нашэсця пустой грашовай масы з Усходу вынішчаўся беларускі таварны рынак, разбуралася эканоміка. Усе настойлівыя патрабаванні апазіцыі БНФ аб увядзенні нацыянальнай валюты адкідаліся як камуністычнай большасцю, так і ўрадам. Людзі ў Беларусі пераважна проста не разумелі, што адбываецца. Нават даводзілася чуць, што, маўляў, чаго гэта апазіцыя так крычыць ля мікрафона?

На адным з пасяджэнняў Вярхоўнага Савета дэпутат Уладзімір Новік, які на сённяшні дзень працуе намеснікам старшыні праўлення Беларусбанка, заявіў, што Расія вядзе супраць Беларусі фінансавую вайну. Я б ацаніў дзеянні РФ у дачыненні да Беларусі як агрэсію, скіраваную на падрыў эканамічнай, палітычнай, інфармацыйнай, культурнай і іншых сфераў жыцця, каб паставіць краіну ў сваю поўную залежнасць і акупаваць яе.

Пасля прыходу на пасаду прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі Масква стала дзейнічаць больш нахабна і нахрапіста. Пачалі рыхтаваць антыканстытуцыйны рэферэндум па ліквідацыі дзяржаўнасці беларускай мовы і гістарычнай нацыянальнай сімволікі. Адразу рабіліся захады, каб павялічыць залежнасць беларускай эканомікі ад расійскай, адсячы заходнія інвестыцыі. Лукашэнка і не хаваў, якая сіла стаіць за ім. Да прыкладу, выступаючы ў Педагагічным універсітэце, ён дзякаваў ФСБ за тое, што яно дало яму інфармацыю пра БНФ.

А. Лукашэнку мы добра ведалі. Чатыры гады мы былі з ім дэпутатамі Вярхоўнага Савета. Гэты чалавек ніколі не пісаў сваіх выступаў і гаварыў ад мікрафона на любыя тэмы — абы што-небудзь сказаць.

Аднойчы — не памятаю, з якой прычыны — некаторы час сярод апазіцыі ВС адсутнічаў яе прызнаны лідэр Зянон Пазьняк. Да нас прыйшоў А.Лукашэнка і сказаў: *"Ребята, может, вам лидер нужен? Берите меня"*. Калі мы яму адмовілі, ён пайшоў у фракцыю камуністаў, але, атрымаўшы адмову, ён узначаліў фракцыю "Камуністы за дэмакратыю". Але і там не прыжыўся.

Падчас прэзідэнцкай выбарчай кампаніі 1994 года я зайшоў у будынак на Карла Маркса, 38, дзе тады месціліся камісіі Вярхоўнага Савета. І тут мяне агаломшылі навіной: моладзевая камісія пайшла ў каманду Лукашэнкі. Ёю тады кіраваў А.Лябедзька. Літаральна праз 10 хвілін на калідоры сустракаю сябра гэтай камісіі Сяргея Бердаўцава. "Хлопцы, што вы робіце? — пытаюся. — Хіба вы не ведаеце, хто такі Лукашэнка?" І чую ў адказ завучаную кніжную фразу: "Разумееш, ён прахадны, ён цягач. Ён выцягне нас на алімп улады. Мы возьмем яго ў рамкі. Ты ж разумееш, не ён жа будзе кіраваць краінай". Памятаю, я адказаў: "Хлопцы, вы не разумееце, хто за ім стаіць. Вы першыя будзеце, хто з гэтага алімпа зляціць".

А.Лукашэнка насуперак Канстытуцыі і дзейнаму заканадаўству ініцыяваў правядзенне рэферэндуму па наданні расійскай мове статусу дзяржаўнай і па замене гістарычнай беларускай сімволікі на сталінска-савецкую. Заканадаўства забараняла выносіць моўнае пытанне на рэферэндум. Цынічнае ігнараванне закону сведчыла: адбываецца найгоршае, людзі, што прыйшлі да ўлады, пачалі разбураць краіну. Трэба было змагацца з навалай.

Мы выкарысталі ўсё, каб прымусіць Вярхоўны Савет і прэзідэнта выконваць прынятыя імі ж законы і Канстытуцыю. Прычым рабілі мы гэта строга ў рамках рэгламенту. Калі ж стала зразумела, што ўсе нармальныя сродкі вычарпаныя і мы грукаем у зачыненыя дзверы, нам засталося адно: пайсці на крайнія захады, каб звярнуць увагу беларускай грамадскасці на тое, як у нашай дзяржаве адкрыта парушаецца заканадаўства.

Вярхоўны Савет праглынуў указ прэзідэнта аб зняцці з пасады галоўнага рэдактара "Народнай газеты" дэпутата ВС Іосіфа Сярэдзіча, насуперак Канстытуцыі прыняў да абмеркавання пытанне аб рэферэндуме.

Пра галадоўку загадзя вялася гаворка, але не на звычайным пасяджэнні. Мы ж пэўна ведалі, што памяшканне праслухоўваецца, а таму проста выйшлі з будынка на вуліцу і абмяркоўвалі, што рабіць, калі ідзе страшэнны наступ. Нельга сказаць, што рашэнне прымала спецыяльна падабранае вузкае кола. Папросту трэба было тэрмінова нешта рабіць. Дамовіўшыся пра галадоўку, мы вырашылі паведаміць сябрам апазіцыі. У апазіцыі БНФ было каля 30 чалавек, а ў галадоўцы ўдзельнічалі 19. Для Вярхоўнага Савета яна сталася поўнай нечаканасцю, як, дарэчы, і для некаторых нашых аднадумцаў. Потым некаторыя крыўдавалі, што мы ім наперад не сказалі.

У той памятны дзень 11 красавіка, калі мы пачалі сваю акцыю і засталіся адны, прыкладна а 21-й гадзіне ў Авальнай зале з'явіўся кіраўнік Службы аховы прэзідэнта дэпутат ВС Міхаіл Цесавец разам з чалавекам, якога мы не ведалі (потым высветлілася, што гэта быў кіраўнік падраздзялення аховы прэзідэнта Вячаслаў Каралёў).

Каралёў паводзіў сябе падкрэслена нахабна, на просьбы паказаць дакументы рэагаваў цынічна. Казаў: пачакайце да 14 траўня, "пасля 14-га мы з вамі з усімі разбярэмся". Цесавец і Каралёў патрабавалі ад нас, каб мы пакінулі памяшканне, бо тут міна. Мы разрагаталіся. Рэч у тым, што ў дзяжурнага міліцыянера зафіксаваўся нумар тэлефона, з якога паступіў ананімны званок пра закладзеную міну. Выявілася, што тэлефон — засакрэчаны. Такія нумары маюць толькі спецыяльныя службы КДБ і міліцыі. Таму цалкам выключана, што тэлефанавалі з апазіцыі. Відавочна, улады дзейнічалі паводле плана, а галадоўка яго касавала — мы ж сарвалі першае галасаванне па незаконным рэферэндуме.

Калі Цесавец з Каралёвым зноў зайшлі ў залу пасяджэнняў, разам з імі былі каротка стрыжаныя хлопцы ў скуранках. Мы звярнуліся да Каралёва: "Вы зайшлі ў будынак Вярхоўнага Савета, пакіньце яго, вы парушаеце закон". Цесавец, як міліцыянер і як дэпутат, ведаў, што ён таксама пераступае закон. Голас у яго дрыжэў.

Мы растлумачылі хлопцам у скуранках — нам потым сказалі, нібы гэта былі афіцэры КДБ, — што карыстаемся дэпутацкай недатыкальнасцю, знаходзімся ў зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета, і калі яны ўжывуць сілу, то парушаць закон. Яны адмовіліся дапамагаць Цесаўцу і не сталі нас чапаць. Тады Цесавец і Каралёў вырашылі асабіста паказаць прыклад. Цесавец паспрабаваў цягнуць Гюнтэра, які сядзеў побач са мной. Мы сашчапілі рукі. Гюнтэр зусім маленькі, а Цесавец — добры бамбіза. Ён учапіўся за Гюнтэра і цягнуў яго, але не змог вырваць.

Крыху пазней прыйшлі сапёры на чале з двума палкоўнікамі. Мы дамовіліся, што пакуль яны будуць правяраць адну частку залы, мы застанемся ў другой, а потым памяняемся месцамі. За дзве гадзіны яны зрабілі сваю працу і склалі акт, што мінаў у зале няма. Акт падпісалі афіцэры, салдаты і дэпутаты Трусаў і Гюнтэр. Мы падзякавалі сапёрам за добрасумленную работу, яны пажадалі нам усяго найлепшага і сышлі.

Упэўненыя, што небяспека прамінула, мы леглі спаць. Усе заснулі, апроч В.Голубева. Нечакана ён пачуў характэрныя, вядомыя з часоў службы ў войску, гукі, калі цішком перасоўваюцца людзі са зброяй, і ўбачыў, як па балконе забегалі нейкія людзі. У зале было цёмна, гарэла ўсяго некалькі лямпачак. Голубеў падышоў да дзвярэй, адчыніў іх і ўбачыў салдатаў з аўтаматамі, у рэспіратарах, у вялікіх спецыяльных касках. Ён убег у залу і крыкнуў: "Аўтаматчыкі! Пад'ём!"

Нягледзячы на стому — была гадзіна трэцяя ночы, — мы імгненна падскочылі і пачалі спрытна апранацца. Адразу запалілася святло, адчыніліся дзверы, і мы ўбачылі ўзброеных салдатаў-аўтаматчыкаў. Яны стаялі ва ўсіх дзвярах ужо ў рэспіратарах. Зноў увайшлі Цесавец з Каралёвым і заявілі, што калі праз пяць хвілін мы не пакінем залу, яны пусцяць у ход сілу. І ўсё. Пры гэтым у Цесаўца калаціліся рукі.

Я быў пэўны, што яны хацелі пусціць газ, атруціць нас сонных.

Мы шчыльна прытуліліся адзін да аднаго і працягвалі сядзець на сваіх месцах. Літаральна праз тры хвіліны зноў рэзка расчыніліся ўсе дзверы, і ў залу з дзікімі крыкамі ўварваліся ўзброеныя людзі. Спачатку ў залу ўскочыла група ў чорных трыко. Другім эшалонам беглі апранутыя ў чорныя курткі. Замыкалі шэрагі аўтаматчыкі спецназу. Першы з тых, хто нападаў, з разбегу наскокам ударыў дзвюма нагамі З. Пазьняка. Яму сталі ціснуць на вочы. Астатнія "героі" з усіх бакоў накінуліся на нас. Ігар Гермянчук сарваў з аднаго маску — той упаў тварам долу. А міліцыю, якая мелася нас ахоўваць, спецназ прыціснуў па перыметры да сценаў Авальнай залы. Кажуць, быў батальён. Аўтаматчыкі скінулі рэспіратары — відаць, вырашылі газ не ўжываць.

Дэпутатаў потым каго неслі, а каго цягнулі. Я дакладна памятаю, як на мяне ззаду наляцелі, схапілі за горла і так сціснулі, што я закрычаў ад болю. Потым вельмі моцна залалі левую руку, павалаклі з залы тварам ледзь не па зямлі. У гэты момант дэпутатаў Вярхоўнага Савета сталі збіваць дубінкамі, і ў Авальнай зале ўпершыню за ўсю яе гісторыю пачуўся мат. У кроў разбілі твар Лявону Баршчэўскаму, Валянціну Голубеву. Збілі Шута, Садоўскага. Брыдкаслоўе не спынялася. Я дасюль не магу зразумець, адкуль у нападнікаў прарэзалася гэткая звярыная жорсткасць. Калі валаклі дэпутата Крыжаноўскага, то гэты пасівелы чалавек спрабаваў казаць ім: "Хлопцы, вы ж мне за сыноў маглі б быць, вы ж беларусы". Пасля слова "беларусы" яны накінуліся на яго з яшчэ большай лютасцю, сагнулі і павалаклі на вуліцу.

Мяне, калі цягнулі, пару разоў спрабавалі біць нагамі, але ўдары прыйшліся па мяккіх тканках і па плашчы. У двары, куды нас выцягнулі, стаялі маладыя салдаты з аўтаматамі. Журналісты потым казалі, што была і ваенная тэхніка. Памятаю, мяне закінулі ў міліцэйскі "газік". Наздзекаваўшыся, "пераможцы" адвезлі мяне і яшчэ двух дэпутатаў на вул. Першамайскую і выкінулі на скрыжаванні з вул. Захарава. Мы адразу рушылі да штаб-кватэры БНФ на Варвашэні, 8. Як толькі сабраліся, адразу з нечай разумнай парады паднялі генпракурора В.Шаладонава. Той па тэлефоне сабраў калегію. Адразу ж узбудзілі крымінальную справу. Гэта паламала планы Лукашэнкі. Назаўтра, пасля збіцця, ён казаў, што мы былі з жанчынамі, п'яныя. Верагодна, ён не сумняваўся, што план ажыццявілі: падкінулі бутэлькі з гарэлкай атручаным газам дэпутатам і завялі на іх крымінальную справу. А насамрэч пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу па факце збіцця парламентароў.

У медкамісію я не звяртаўся, і дарэмна. Следчы потым пытаўся: "Навошта вы прамаўчалі?" Ну, балела трохі тут і там, але я тады падумаў, што ісці ў медкамісію не варта. Ну, парвалі мне плашч, гузікі павырывалі...

Раніцой нас не пускалі ў залу Вярхоўнага Савета. Ідучы ў залу, я ўбачыў перад сабой В. Шаладонава: яму заступіў шлях нейкі міліцэйскі маёр. І ён, і астатнія ў форме і ў цывільным паводзілі сябе, як Каралёў: адпускалі абразлівыя рэплікі, трымалі рукі ў кішэнях, размаўлялі з гэткай прыблатнёнай інтанацыяй. Відавочна, іх паставілі загадзя і далі ім адпаведны загад. Яны патрабавалі дэпутацкае пасведчанне. Шаладонаў пайшоў на іх проста корпусам. "Якое, — кажа, — дэпутацкае пасведчанне, чаму не пускаеце ў парламент?" Прадушыў корпусам таго маёра, адхіліў яго, і мы тады за Шаладонавым прайшлі ў залу.

Там адбывалася пленарнае пасяджэнне. Як толькі мы з'явіліся, узнік М.Цесавец з нейкімі сваімі людзьмі. На яго кінулася адразу група дэпутатаў. Памятаю, першым падскочыў, здаецца, Лявонцій Зданевіч. Падляцеў да Цесаўца і выгукнуў: "Ідзі адсюль!" І той, напалоханы, парачкаваў да дзвярэй. Людзі Цесаўца не заступіліся за яго. Я бачыў, што ўся большасць Вярхоўнага Савета проста напалоханая. Яны не маглі схаваць страху. Калі мы прайшлі ў залу, пачалося абмеркаванне начнога здарэння.

Памятаю, праз пару месяцаў пасля нашага збіцця Лукашэнка зладзіў для ўсяго Вярхоўнага Савета на чале з Грыбам банкет. Яны разам адзначылі завяршэнне працы ВС XII склікання, сфатаграфаваліся з Лукашэнкам.

Якая магла быць урачыстасць пасля таго, што адбылося? Парламент захапілі войскі, дэпутатаў па-бандыцку збілі... У вачах астатніх народных абраннікаў чытаўся страх. Без нас яны ператварыліся ў нейкую запалоханую масу. Як толькі нас у ВС не стала, з імі можна было рабіць што заўгодна. Аб дэпутатаў проста выціралі ногі. Выкінулі Вярхоўны Савет з будынка на К.Маркса — забралі яго пад рэзідэнцыю прэзідэнта.

Начныя падзеі з 11 на 12 красавіка мелі палітычныя наступствы. Пасля фактычнага разгону парламента ўзброенымі людзьмі Лукашэнка па сутнасці перастаў быць легітымным прэзідэнтам краіны. Прынамсі, прадстаўнікі сённяшняй псеўдаапазіцыі нідзе не згадваюць пра разгон парламента і ганебны рэферэндум 1995 года., бо шмат хто з іх падтрымаў гэтую брутальную акцыю і ганебны рэферэндум. Яны зазвычай пішуць пра "дзяржаўны пераварот у выніку рэферэндуму 1996 года".

Ноч на 12.04.95 у Вярхоўным Савеце. М.Цесавец і В.Каралёў хапаюць і спрабуюць цягнуць дэпутата Барыса Гюнтара.

Ігар ГЕРМЯНЧУК

Праверана: мінаў няма

Выступ на пасяджэнні №95 Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12 красавіка 1995 г. (Стэнаграма пасяджэння №95 Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь XII склікання *(серада, 12 красавіка 1995 г.). Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 968. Воп. 1. Спр. 3431.)*

[Хачу давесці] да вашага ведама тое, што мы, пацярпелы бок, учора тут назіралі, як гэта адбывалася. Сапраўды, існуе відэастужка. Усе з'яўленні [палкоўніка Цесаўца] фіксаваліся на дзве відэакамеры з гэтых бакоў. Усе з'яўленні іншых людзей у гэтую залу таксама фіксаваліся. Усё тое, што адбывалася тут, зафіксавана на відэастужку і там усё будзе вельмі ясна.

Такім чынам, упершыню Цесавец з'явіўся ў 21 гадзіну. Ён з'явіўся не адзін. Ён прыйшоў разам з нейкім, па паводзінах я назваў бы яго — тыпам. Аказалася, па словах Цесаўца, гэта начальнік управы аховы прэзідэнта Каралёў. Ён паводзіў сябе такім чынам, што дэпутат Трусаў [кажа]: "Пакажыце пасведчанне, хто вы". Ён кажа: "Пасля 15 мая мы з вамі разбяромся. Я вам пакажу, хто я". Так заяўляў гэты чалавек, якога Цесавец назваў, што ён шэф аховы прэзідэнта Каралёў. Цесавец заявіў нам падчас гэтага візіту ў 21.00, што ў 20.11 паступіў званок аб тым, што Дом урада заміраваны. "Усіх ужо эвакуавалі з Дому ўрада, — сказаў Цесавец. — Цяпер мы вымушаны эвакуаваць вас". Спаслаўся на тое, што была размова ў яго з Грыбам, і Мечыслаў Іванавіч нібы, так сказаць, згадзіўся з тым, што дэпутатаў трэба эвакуаваць.

У 22.20 Цесавец заявіўся з палкоўнікам грамадзянскай абароны, які сказаў, што будынак замініраваны і патрабуецца яго абследаванне сапёрамі. Мы сказалі, што мы — калі ласка — не супраць, праводзьце любыя работы, якія вы тут хочаце, мы гатовы стаць у тое месца, на той пятачок тэрыторыі, які вы нам укажаце. Зноў жа Цесавец патрабаваў вызваліць памяшканне. Мы адмовіліся гэта зрабіць, сказалі, што мы гатовы [выконваць] любыя ўказанні людзей, якія будуць праводзіць абследаванне залы і паводзіць сябе так, як яны будуць патрабаваць, а залу мы не пакінем. Яны прапаноўвалі нам, Цесавец прапаноўваў нам, што знаходзяцца тут аўтобусы, вас адвязуць, а мы тым часам абследуем залу. Тады, калі Цесавец сказаў, што з Дому ўрада мы ўжо эвакуавалі ўсіх — гэта была няпраўда.

Як ужо тут згадвалася, мы з дэпутатам Навумчыкам стаялі вось на той пляцоўцы, і дзве жанчыны, якія працавалі тут, здымаючы тут стэнаграмы, — няцяжка іх адшукаць, мы іх ведаем, памятаем — яны могуць пацвердзіць, што яны выходзілі... ужо было позна, напэўна, 22.40.

У 23.35 Цесавец зноў заявіўся і гэтым разам ён заявіўся зноў жа з Каралёвым. Увайшлі яны не адны. З імі былі ўведзеныя прыкладна два дзесяткі людзей у цывільнай форме, маладых, частка з іх брытагаловыя. І прыкладна столькі, ну, можа быць, дзесятак міліцыянтаў альбо 15 міліцыянтаў у міліцэйскай форме, у чыне палкоўніка, маёра і ніжэй. Па-мойму, два падпалкоўнікі былі. Гэтыя людзі [прыйшлі] разам з Цесаўцом і Каралёвым.

Мы ўжо сядзелі ў гэтым сектары, у левым сектары прэзідыума, усе сядзелі, на гэтых трох-чатырох шэрагах размясціўшыся. Я сядзеў тут з Маркевічам. Хвіліну... Міліцыянты сталі ззаду, і Цесавец аддаў каманду: *"Выводите"*. Двое кінуліся на [Гюнтэра], які сядзеў з краю, відаць, як да [чалавека] самай невялікай камплекцыі. Пачалі яго цягнуць двое ў цывільнай форме. Дэпутат і калега з ім побач трымаў яго. Мы пачалі гаварыць: "Што вы робіце? Мы дэпутаты, мы знаходзімся тут, мы нічым не перашкаджаем рабіць абследаванне". Гэтыя хлопцы рэціраваліся. Ім стала неяк [няёмка], яны адчулі, што яны робяць не тое.

І тады Цесавец разам з Каралёвым (увогуле гэта прымітыўная публіка, як сведчыць гэты факт) схапіліся самі цягнуць дэпутата Гюнтэра. І я ім кажу: "Што, Цесавец, падымаем баявы дух?" Уявіце сабе: стаяць гэтыя хлопцы, якія, так сказаць, бачаць, як яны паводзяць [сябе], што так паводзіць нельга з дэпутатамі. І гэтыя тыпы, Цесавец з Каралёвым, падымалі такім чынам іх баявы дух. І калі я пачаў гаварыць пра ўсё гэта, Цесавец падскочыў да мяне, Маркевіч ухапіў мяне за руку, трымаючы, я ўхапіўся за сістэму Мечыслава Іванавіча — уключэння мікрафонаў. Цесавец спрабаваў мяне цягнуць, але бачыў, што нічога ў яго не атрымаецца.

Такім чынам, гэта была такая першая спроба малымі сіламі нас адсюль дэпартаваць. Увайшлі два палкоўнікі і сказалі, што, у прынцыпе, мы згодныя праводзіць, так сказаць, гэтае абследаванне наконт наяўнасці "взрывчатых веществ", як гаварыў тут міністр абароны, мы згодныя праводзіць. Толькі хай дэпутаты спачатку знаходзяцца ў гэтым сектары, мы абследуем гэты, а потым [няхай] перасядуць сюды. Мы згадзіліся. Яны абследавалі гэты сектар. Мы сюды пераселі і нікуды мы не хадзілі, нікому мы не перашкаджалі. Сапраўды, тут ляжалі спальнікі, якія яны маглі падымаць, што заўгодна рабіць, таму што мы ўжо рыхтаваліся ўсё ж такі спаць.

Яны абследавалі гэтае памяшканне. З імі, пакуль лейтэнант пісаў [акт] аб абследаванні памяшкання, там стаялі два палкоўнікі. З імі размаўляў дэпутат Трусаў. Пасля гэтага ўсе, якія ўдзельнічалі ў гэтым так званым пошуку міны, распісаліся на гэтым акце і папрасілі дэпутатаў засведчыць гэты акт, што і зрабілі па-мойму, Трусаў, Гюнтэр. Трусаў і Гюнтэр паставілі гэтыя подпісы. І тыя пайшлі. Такім чынам, яны выканалі сваю місію.

Калі міністр Кастэнка кажа, што яны там памыліліся, што ж гэта такое? Два палкоўнікі выконвалі важную функцыю ў зале Вярхоўнага Савета, бралі на сябе велічэзную адказнасць. Тым не менш [яны] паставілі свае подпісы. Вось такая была сітуацыя, яны ў жыцці, напэўна, не мелі такой адказнасці, як у гэтай сітуацыі мелі адказнасць. Яны паставілі гэтыя свае подпісы, і ўсе людзі, якія праводзілі гэтае абследаванне. І такім чынам уся публіка адсюль — і Каралёў, і ўся гэтая брыгада —удаліліся. І мінёры, сапёры таксама сышлі. Але ўсё ж такі мы ведалі, што гэтым справа не скончыцца, таму што як закончылася так званае размініраванне (гэтыя акты былі падпісаны ў 00.41) прыкладна каля гадзіны нам патэлефанавалі з вуліцы журналісты, што прыехаў лімузін, і прыехаў прэзідэнт, і прыехаў картэж. Акрамя таго, нам назвалі яшчэ прозвішчы, што прыбылі сюды, у Дом урада, Сініцын і Ціцянкоў.

Як з'явіліся журналісты тут? Безумоўна, як толькі пачалася сітуацыя з замініраваннем, мы адсюль пазванілі карэспандэнтам. І, безумоўна, гэта іх прафесійны абавязак, тут яны павінны быць, каля гэтага будынка, павінны быць, каб паведамляць навіны. І [я], як журналіст, калі б мае людзі не былі тут, выгнаў бы іх за гэта з работы.

Мы пакаліся спаць. Пазняк паклаўся тут, Антончык, Навумчык, Голубеў, Гермянчук, там недзе Кржыжаноўскі.

Старшыня: Ігар Іванавіч, на сёння хопіць...

Гермянчук І.І.: У 2 гадзіны 35 хвілін дэпутат Голубеў заўважыў, што там соваюцца нейкія людзі, што нейкі тупат у калідоры, ён пайшоў і прыадчыніў дзверы. І дэпутат Голубеў пасля гэтага крыкнуў: "Аўтаматчыкі! Пад'ём!" І ў той момант людзі, якія тут ажыццяўлялі [акцыю], зразумелі гэта нібыта як каманду. Зала адразу пасля гэтых слоў уключылася. Мы паўсноквалі. Голубеў расказвае, што там людзі з аўтаматамі ў касках, у камуфляжы, спецназ. Мы хуценька апрануліся, хто як мог, і селі зноў жа на гэтыя месцы.

У 2 гадзіны 44 хвіліны ўвайшлі Цесавец, Каралёў і трэці — такі велічэзны чалавек у *защитного* колеру форме, у *защитной* камуфляжнай кепцы, і Цесавец заявіў, што вам даецца пяць хвілін для таго, каб пакінуць залу. Мы сказалі, што мы не пакінем залу, што размініраванне праведзена, калі вы яшчэ раз хочаце правесці яго, калі ласка, праводзьце. Каралёў заяўляе, што ў вас ужо засталося тры хвіліны. І прыкладна пасля гэтых слоў яны пайшлі да дзвярэй. І мы бачылі, як усе дзверы ўжо адчыніліся, калі мы яшчэ сядзелі тут, да іх уваходу. І калі яны падышлі да дзвярэй, Цесавец даў каманду, і сюды ўварваліся.

Уварваліся праз усе дзверы, урываліся трыма шарэнгамі. Першая — гэта людзі ў нейкай чорнай спартыўнай альбо такой *шерстяной* форме з *чулками* на галаве — толькі вочы прарэзаныя. За імі ішлі спецназаўцы ў касках альбо [у рэспіратарах], альбо са шчытамі, з дубінкамі і аўтаматамі. І трэцяя шарэнга — аўтаматчыкі з аўтаматамі па ўсім перыметры залы. Яны кінуліся адразу вось у гэты сектар. Яны кінуліся трое (а тут сядзела тры чалавекі).

Старшыня: Колькі вам патрэбна часу?

Гермянчук І.І.: Тры хвіліны яшчэ.

Старшыня: Дайце дзве хвіліны. Ён ужо адну прагаварыў.

Гермянчук І.І.: Кінуліся і пачалі цягнуць. Я сядзеў у сярэдзіне. Я спрабаваў адцягнуць руку, і адцягнулі дэпутата Маркевіча. Калі тры бандыты круцілі галаву Пазьняку, я спрабаваў адцягнуць іх рукі і пачаў здымаць гэтыя іх капюшоны. І сарваў па меншай меры, пакуль яны да мяне дацягнуліся, чатыры капюшоны. У адзін з момантаў мяне перагрэлі гумавай палкай. Да мяне дабраліся, мяне схапілі, я вырываўся. Яны перакінулі мяне ў нейкія іншыя рукі, і потым, калі я зноў вырваўся, мяне падхапілі шэсць чалавек і нейкі сёмы бандыт... ішоў зверху, неслі мяне сем чалавек, а ён зверху кулаком мне разбіваў нос, раскрывавіў нос. І занеслі ў машыну пятым чалавекам, ва "ўазік" укінулі ўперад нагамі.

Такім чынам, гэтыя людзі паводзілі сябе па-бандыцку. Маскі ім патрэбны былі не толькі [каб] схаваць твары, а каб проста не адчуваць ніякіх тармазоў.

Таму я хачу заявіць, што [мы] працягваем галадоўку і патрабуем, каб Пракуратура Рэспублікі Беларусь узбудзіла крымінальную справу па гэтым факце бандытызму, які адбыўся ў гэтай зале супраць дэпутатаў Вярхоўнага Савета. Мы спадзяёмся, што генеральны пракурор выканае сваю місію і адновіць законнасць у гэтай краіне. Як сказаў доктар, які нас потым абследаваў: "Дык што, калі дэпутатаў б'юць, дык што рабіць простаму чалавеку?" Мы засведчылі тыя пабоі, якія нанесены нам. Мы маглі б паказаць тое, што паказваў вам дэпутат Шут, але будзем спадзявацца, што ў вас, можа, хоць хопіць трошкі сумлення".

Валянцін ГОЛУБЕЎ

Галадоўка

...Практычна ніхто з дэпутатаў не падтрымліваў агучанай на сесіі ВС 21 сакавіка 1995 г. ідэі А.Лукашэнкі правесці рэферэндум. На ім для А.Лукашэнкі галоўнымі былі пытанні не пра мову і інтэграцыю з Расіяй, хоць менавіта яны "раскручваліся" прэзідэнтам і сродкамі масавай інфармацыі. Галоўнае — змяніць дзяржаўную сімволіку і дабіцца права аднаасобна распускаць Вярхоўны Савет. Думаю, шмат хто з дэпутатаў гэта бачыў.

Калі 10 красавіка 1995 г. стала зразумела, што назаўтра ВС, хутчэй за ўсё, прыме прапанову прэзідэнта прызначыць дату рэферэндуму, то каля 18-й гадзіны ў пакоі 363 (былы пакой Народнага кантролю БССР, які потым стаў штабам апазіцыі) ВС сабраліся ўсе дэпутаты ад апазіцыі і тыя, хто нас падтрымліваў, — можа, чалавек 20 ці болей. Абмяркоўвалі сітуацыю прыблізна да паловы на восьмую вечара: шукалі сродкі і спосабы, каб не толькі прыцягнуць увагу грамадскасці, але і блакаваць рашэнне наконт прызначэння рэферэндуму.

Гучалі самыя розныя прапановы, што рабіць. Гаварылі З.Пазьняк, С.Антончык — практычна ўсе. Дакладна памятаю: толькі адзін чалавек — дэпутат з Гродна Мікола Маркевіч — высунуў ідэю правесці галадоўку. Аднак яе неяк адразу адмялі, як несур'ёзную. Гучалі прапановы пакінуць сесію ВС і сысці, каб прэзідэнцкі варыянт прымалі без нас. Гаварылі пра тое, каб прыняць чарговую заяву, выступіць у друку супраць ВС і Лукашэнкі, звярнуцца да беларускага народу з нейкім заклікам. Але нам хацелася зрабіць так, каб нашыя дзеянні зразумелі ў грамадстве, а не ўспрымалі як акт адчаю. Таму мы прыкідвалі розныя варыянты, што рабіць заўтра. У спадзеве, што за ноч прыдумаецца які-небудзь эфектыўны крок, вырашылі раней прыйсці ў Вярхоўны Савет і яшчэ параіцца перад сесіяй.

Я паехаў дахаты, а недзе каля гадзіны ночы мне ў дзверы пазваніў З.Пазьняк з С.Антончыкам. Яны з парога сказалі: "Валянцін, ёсць размова". З.Пазьняк прапанаваў на наступны дзень адразу з раніцы на адкрыцці сесіі зрабіць заяву аб пачатку галадоўкі сяброў фракцыі БНФ на знак пратэсту супраць прызначэння антыканстытуцыйнага рэферэндуму. І мы ўтрох, седзячы ў мяне на кухні недзе гадзіны да трэцяй ночы, накідалі для Пазьняка праект тэксту выступу.

Гэтая заява мала чым рознілася ад іншых, з якімі мы раней адкрыта выступалі супраць большасці ў ВС, асабліва пасля восені 1993 г., калі ВС забараніў рэферэндум аб даверы ВС і правядзенні датэрміновых выбараў. Тады за рэферэндум мы сабралі неабходную колькасць подпісаў выбарцаў: 442 тысячы. ВС у адпаведнасці з законам проста абавязаны быў прызначыць дату рэферэндуму, але гэтага не зрабіў. Такім чынам, з аднаго боку, парламент меў "вопыт" непрызначэння даты — а значыць, і самога рэферэндуму, а з другога — паказаў Лукашэнку, як можна узурпаваць уладу.

(Працяг на 4-й стар.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
18 КРАСАВІКА 2008 г.

Разгон

Падзеі, пра якія расказваецца ніжэй, адбыліся неўзабаве пасля прыходу да ўлады прэзідэнта А.Лукашэнкі

(Працяг. Пачатак на 3-й стар.)

Але ў той заяве апазіцыі гучалі словы, што мы вычарпалі ўсе магчымасці і аб'яўляем галадоўку ў якасці скрайняга сродку ўздзеяння на дэпутатаў. Мы хацелі такім чынам паўплываць не на грамадства, а менавіта на сам ВС і яго дэпутатаў, зрабіць большасць дэпутатаў калі не сваімі прыхільнікамі, то прымусіць іх задумацца і пра лёс краіны, і пра свой уласны лёс. Таму мы абвясцілі галадоўку не на вуліцы, не ў сваіх кабінетах, не на сядзібе БНФ, а ў цэнтры залы ВС, проста на яго пасяджэнні.

Напярэдадні М.Грыб паведаміў, што пытанне аб прызначэнні даты рэферэндуму будзе пастаўленае на галасаванне зранку 11 красавіка. У нас заставалася адзіная магчымасць змагацца: сарваць такое галасаванне. І сапраўды, як толькі мы абвясцілі галадоўку, М.Грыб адразу прапанаваў абмяркоўваць іншыя пытанні парадку дня, а не дату рэферэндуму.

Шкада, але З.Пазьняк, перакананы антыкамуніст і нацыяналіст, нават у тактычных мэтах не мог адступіць і прапанаваць ВС кампраміс, аб'яднанне дзеля дасягнення агульнай мэты. Ён не адзін і да сёння цалкам перакананы, што большасць народу за сценамі парламента нас падтрымлівала. На жаль, усё было не так проста, і вельмі шмат людзей, якія прагаласавалі на прэзідэнцкіх выбарах за А.Лукашэнку, гатовыя былі падтрымліваць усе ягоныя дзеянні, бараніць яго ад усіх.

Паводле дамоўленасці, мы з С.Антончыкам меліся прыйсці ў будынак ВС раней, каб папярэдзіць усіх сяброў апазіцыі да пачатку пасяджэння, пагаварыць з імі: маўляў, калі яны не згодныя з тэкстам заявы, то ніхто не будзе іх няволіць да ўдзелу ў галадоўцы. Але на гэты раз ніхто не выступіў супраць.

І вось З. Пазьняк перад самым адкрыццём сесіі падышоў да першага мікрафона і папрасіў слова. Ён трымаў тэкст, які сам дапрацаваў і ні з кім не абмяркоўваў і не ўзгадняў. З.Пазьняк зрабіў заяву, пайшоў і сеў каля трыбуны. Да яго далучыліся астатнія дэпутаты апазіцыі. Лявон Баршчэўскі быў хворы, дрэнна сябе адчуваў, але ён таксама выйшаў і сеў разам з усімі.

Першы пункт у парадку дня — аб прызначэнні рэферэндуму, прапанаванага прэзідэнтам. Сярод іншых пытанняў мусіў разглядацца лёс "Народнай газеты" і звальненне яе рэдактара Іосіфа Сярэдзіча. Ён пазней падыходзіў да нас і прасіў, каб мы спынілі часова сваю акцыю, маўляў, давайце спачатку з вашым удзелам прагаласуем за газету, а потым вы працягнеце галадаваць.

Наш учынак агаломшыў прысутных. Пасля заявы З.Пазьняка павісла здзервянелае маўчанне — яна сталася для дэпутатаў поўнай нечаканасцю. Калі б Пазьняк сказаў ім, што нам трэба разам клапаціцца пра краіну, то, можа, хто яшчэ да нас бы далучыўся. Тым не менш адразу стала зразумела, што дэпутаты рашэння наконт прызначэння рэферэндуму ў той дзень не прымуць.

Усё выглядала неяк ірэальна. Выступалі дакладчыкі, а ў цэнтры залы сядзела вакол трыбуны на прыступках група і займалася сваёй справай. Старшыня ВС М.Грыб, як мне здаецца, унутры быў супраць рэферэндуму. Але ён знаходзіўся ў дваістай сітуацыі і адпаведна сябе паводзіў. Я думаю, што ён выкарыстоўваў любыя магчымасці, каб гэты рэферэндум не прызначыць. З другога боку, ён, здаецца, не хацеў адкрыта выступаць супраць Лукашэнкі. Калі б М.Грыб цалкам нас падтрымліваў, то ён бы ўначы, ведаючы, што ў зале сядзяць дэпутаты і там вядзецца пошук бомбы, прыехаў бы на месца падзей.

Наколькі я памятаю, у той дзень пытанне пра рэферэндум ВС увогуле больш не абмяркоўваў. У сесіі былі звычайныя перапынкі: а 12-й гадзіне і паміж 14-й і 16-й — на абед. Мы засталіся адны ў зале, амаль ніхто з дэпутатаў да нас не падыходзіў. Усе чакалі, што ж будзе. Закончылася сесія недзе а 18-й гадзіне, здаецца, раней, чым звычайна. Тады ў зале былі карэспандэнты — натуральна, яны ведалі, што пачалася галадоўка. Інфармацыя адразу пайшла за мяжу, у тым ліку і ў Расію. Некаторыя з нас чакалі, што расійскія сродкі масавай інфармацыі паведамяць пра акцыю ў ВС. Дарэмна. У будынку ВС працавала група польскіх журналістаў. Дарэчы, яны адзіныя стаялі потым на плошчы Незалежнасці да самага канца, бачылі, як нас выводзілі, і гэта здымалі. Побач з імі не было ніводнага беларускага рэпарцёра. З нашых журналістаў пасля 18-й гадзіны з намі заставалася Алена Радкевіч, карэспандэнтка "Беларускай маладзёжнай" і Радыё Свабода. Яна правяла з намі некалькі гадзін, брала інтэрв'ю, здаецца, у Пазьняка. Я не памятаю, як Радкевіч трапіла ў залу. Напэўна, яе прапусцілі шараговыя міліцыянты з аховы. Пераважна сумленныя, добрыя людзі, якія слухалі ўсе выступленні дэпутатаў, на ўласныя вочы бачылі, што такое большасць і што такое апазіцыя. Нехта з міліцэйскіх начальнікаў потым спытаўся ў Алены: "Вы дэпутат?" Яна адказала, што яна журналіст, і паказала пасведчанне. Яе папрасілі пакінуць памяшканне.

Памятаю, як у адным перапынку мяне паклікалі наверх на сустрэчу з намеснікам старшыні ўправы БНФ Віктарам Івашкевічам. Ён паведаміў мне, што Управа раілася з юрыстамі і медыкамі, як трэба праводзіць галадоўкі, перадаў, што збіраюць грошы, каб набыць для нас спальнікі, і што нам прывязуць мінеральную ваду. Я памятаю, што на распараджэнне М.Грыба з Сакратарыята нам перадалі некалькі бутэлек мінералкі. У дзень, яшчэ падчас пасяджэння, З.Пазьняк прасіў М.Грыба арганізаваць медыцынскую дапамогу, каб за намі вёўся нагляд і было відаць, што мы сапраўды галадаем.

Не памятаю калі, але некалькі супрацоўнікаў Сакратарыята ВС паведамілі мне пра тэлефонны раз'ём пад адным з крэслаў, дзе сядзелі прадстаўнікі Сакратарыята і Камісіі па кантролі за электроннай сістэмай галасавання. Яны прынеслі мне тэлефон, і я мог звязвацца з вонкавым светам. Потым, апроч мяне, ім карыстаўся і Пазьняк, каб даваць інтэрв'ю. Па гэтым тэлефоне я да самага апошняга моманту перадаваў у Варшаву на Польскае радыё і польскім журналістам у Менску інфармацыю пра тое, што адбываецца ў ВС. Калі ўжо ў залу ўбеглі людзі ў чорным, я паспеў яшчэ крыкнуць у слухаўку: "Усё, яны бягуць, я потым пазваню". У польскі эфір, такім чынам, ішла наўпроставая трансляцыя, між тым як нашы журналісты спалі.

Прыйшоў начальнік аховы Міхаіл Цесавец з людзьмі ў цывільным, добрага выгляду, дагледжанымі, добра выгаленымі, з разумнымі, хоць і дастаткова спецыфічнымі службовымі тварамі. Такія бываюць толькі ў супрацоўнікаў вядомых спецыяльных службаў. Я думаю, што гэта была група афіцэраў КДБ, чалавек не меней за 20. Цесавец гаварыў нам пра бомбу, патрабаваў пакінуць залу. Мы адказалі: мы дэпутаты, галадаем у будынку парламента, і калі вам трэба, шукайце міну, мы вам замінаць не будзем. Цесавец некага з нас штурхаў, загадваў людзям у цывільным хапаць нас і выводзіць. Добра памятаю, як нехта з гэтай групы яму адказаў пры нас: "А пайшоў ты... Табе трэба — ты і выводзь сам". А спачатку відаць было, што іх нацкавалі на нас. Але як толькі мы растлумачылі, хто мы, што мы робім, чаму праводзім галадоўку, і папярэдзілі іх, што, ужыўшы супраць нас сілу, яны парушаць дэпутацкую недатыкальнасць, яны паслухаліся розуму, закона і, думаю, сумлення. У КДБ добра ведалі дэпутата А. Лукашэнку, ведалі, як ён прыйшоў да ўлады. Гэтыя афіцэры проста павярнуліся і выйшлі.

Потым шукалі міну: прыходзіў афіцэр у савецкай форме, у званні ці то палкоўніка, ці то падпалкоўніка, з ім — сапёры і кінолагі. Ён паводзіў сябе прыстойна, культурна. Відаць было, што ён выдатна ўсё разумеў і ведаў, што ніякай міны няма. Ён паведаміў нам, што прыбыў з заданнем правесці пошук міны ў будынку ВС і, калі яна выявіцца, зрабіць належныя захады. Мы адказалі жартам: "Калі ласка, толькі не падкіньце бомбу самі". Салдаты хутка праверылі залу. Яны ішлі па шэрагах дэпутацкіх крэслаў і прасілі нас вызваліць той ці іншы сектар. Мы перасаджваліся туды, дзе прайшла праверка. Нарэшце афіцэр сказаў, што міны няма, і пайшоў дакладаць. Калі не памыляюся, З.Пазьняк тэлефанаваў М.Грыбу на лецішча і паведамляў пра пошук міны. Яны пагутарылі, але пазней там, у М.Грыба, перасталі здымаць слухаўку, напэўна, старшыня ВС лёг адпачываць. Гэта было незадоўга да ўварвання ў залу ВС вайскоўцаў. Да нас яшчэ разы два ці тры заходзілі нейкія групы, прасілі ачысціць залу. Здаецца, гэта рабіў Цесавец ці нехта з Сакратарыята.

Пасля таго, як выйшлі сапёры, мы сталі ўладкоўвацца на ноч. І вось тут пачала спакваля падаць напруга ў вялікай жырандолі. Мы размаўлялі ўсё цішэй, я нават пачуў нечае пасопванне. На балконе, дзе звычайна сядзяць тэхнікі, фатографы, гукарэжысёры, работнікі сувязі, я заўважыў нечыя цені. Мы дамовіліся, што нехта будзе дзяжурыць у прэзідыуме, каля настольнай лямпы. Першым там сеў, здаецца, Лявон Дзейка. Мы верылі, што знаходзімся пад аховай міліцыі і што гэтага дастаткова.

Але было трывожна. Я прыслухаўся і тут у нейкі момант проста фізічна адчуў, як закалыхалася паветра — гэтак бывае, калі недзе побач у памяшканні ідзе вялікая маса людзей. Падобнае адчуванне ведае кожны, хто служыў у войску. А потым я пачуў гук удару аб дула аўтамата АКМ ці карабіна: "бзынь". Як і шмат хто з вайскоўцаў, гэты гук я не зблытаю ні з якім іншым. Зрабілася страшнавата. Я падняўся і рушыў да цэнтральных дзвярэй залы. Як толькі я ўзяўся за ручку, звонку мне нібы дапамаглі. Дзверы расчыніліся, і ў ярка асветленым фае я ўбачыў мноства вайскоўцаў: можа, некалькі соцень. Адразу кінуліся ў вочы іх пластмасавыя маскі, ці шлемы, нібы ў касманаўтаў. Яны стаялі гурткамі і размаўлялі. Некалькі чалавек былі з ранцамі і ў супрацьгазавых масках. У гэты момант той салдат, які дапамог мне адчыняць дзверы, ткнуў у мяне ручным кулямётам. Перапужаны, я крыкнуў: "Кулямётчыкі!" — і адскочыў ад дзвярэй. Тады ззаду за мной у зале загарэліся ўсе лямпы, і я ўбачыў на балконе трох кінааператараў. Яны стаялі наводдаль адзін ад аднога і вялі панарамныя здымкі залы зверху з трох розных пазіцый: з левага, правага боку балкона і па яго цэнтры.

Алег Трусаў падняўся і пайшоў праверыць, ці праўду я сказаў. Ён пагледзеў у дзвярную шчыліну, вярнуўся і сказаў: "Праўда — там кулямётчыкі". Усе галадоўцы ўскочылі і пачалі апранацца. Я адразу патэлефанаваў польскім журналістам. Тут у залу зайшоў Цесавец і прапанаваў усім яе пакінуць. Мы адмовіліся і селі на крэслы прэзідыума. Праз некалькі секундаў расхінуліся ўсе дзверы, і ў залу з крыкамі ўварваліся людзі ў чорных трыко і масках. За імі па перыметры залы выстраіліся аўтаматчыкі, потым спецназ. Яны нас проста хапалі, білі і прымусам выцягвалі з залы, а потым развозілі на машынах і выкідалі ў начным горадзе на розных месцах.

На наступны дзень апазіцыю ў ВС пускаць было забаронена. Уваход з правага крыла ўвогуле зачынілі. Мы зайшлі ў Дом урада з боку Савета міністраў, але і там нас не прапускалі. Больш за тое: паставілі металадэтэктар, як у аэрапорце, але мы, напружыўшыся, звалілі яго і прарваліся на сесію. Там ужо выступаў Лукашэнка. Памятаю, я ледзь не ганяў па зале М.Цесаўца, бо было за што — ужо не вытрымалі нервы. Супрацоўнікі аховы толькі бегалі і прасілі: "Не ў зале пасяджэнняў, Валянцін Фёдаравіч, толькі не ў зале пасяджэнняў". Памятаю, я выступаў, назваў арганізатара гэтых дзеянняў "фашыстам" (ішла наўпроставая трансляцыя), а ён паабяцаў, што пакажа стужку, як усё адбывалася. Схлусіў і збаяўся. Аляксандр Шут у цэнтры залы прадэманстраваў пабоі, а былы старшыня Вярхоўнага Савета і сённяшні сенатар М.Дземянцей крыкнуў: "Мала далі!"

Мечыслаў ГРЫБ

Супрацьстаянне

...Адным з фактараў неспакою ў ВС стаў даклад сябра фракцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Сяргея Антончыка адносна карупцыі ў Адміністрацыі прэзідэнта, у ягоным атачэнні. Дэпутаты рэагавалі бурліва, бо нядаўна абраны прэзідэнтам Аляксандр Лукашэнка ішоў на выбары якраз пад лозунгамі барацьбы з карупцыяй. Я не ведаю, адкуль С.Антончык браў свае звесткі і хто іх яму даваў. Фракцыя БНФ прапаноўвала стварыць камісію, каб расследаваць агучаныя С.Антончыкам факты. Але цягнік ужо адышоў, бо адразу па абранні А.Лукашэнкі прэзідэнтам паміж ім і Вярхоўным Саветам пачалося змаганне за ўладу. Тым не менш мы паспелі правесці рашэнне адносна дакументальнай рэвізіі фінансава-гаспадарчай дзейнасці Сакратарыята Вярхоўнага Савета, Савета міністраў, Кіраўніцтва справамі і Адміністрацыі прэзідэнта. Уласна кажучы, спачатку мы думалі праверыць адно Кіраўніцтва справамі. Але гэта адразу кідалася б у вочы, і таму мы вырашылі пайсці шырэй і праверыць усе органы ўлады, акрамя судоў. Сакратарыят ВС мы праверылі, знайшлі досыць дробныя парушэнні. Пачалі правяраць Савет міністраў, але А.Лукашэнка неафіцыйна забараніў гэта рабіць і папросту не пусціў кантралёраў на парог Кіраўніцтва справамі. Вярхоўны Савет ХІІІ склікання потым вярнуўся да гэтай справы, але дасюль фінансава-гаспадарчая дзейнасць ні Савета міністраў, ні Кіраўніцтва справамі і Адміністрацыі прэзідэнта ні разу не правяралася.

Тады, пасля інаўгурацыі 1994 г., прэзідэнт планамерна ішоў да адзінаўладдзя. А.Лукашэнка патрабаваў ад ВС даць яму поўную ўладу ў эканамічнай галіне, каб ягоныя рашэнні мелі сілу закона. Аднак паводле Канстытуцыі адзіным найвышэйшым заканадаўчым органам быў Вярхоўны Савет. Мы адказалі прэзідэнту, што, каб змяніць суадносіны галін улады, трэба змяняць Канстытуцыю. Лукашэнка тады моцна на нас пакрыўдзіўся, і паміж намі і ім неафіцыйна пачалася сапраўдная халодная вайна.

У такіх умовах ён ініцыяваў травеньскі 1995 г. рэферэндум. На знак пратэсту частка дэпутатаў 11 красавіка абвясціла галадоўку.

Папярэдне я пра яе нічога не ведаў. 11 красавіка 1995 г. я прыйшоў у залу пасяджэнняў ВС і ўбачыў вакол трыбуны на прыступках каля 10 дэпутатаў апазіцыі БНФ.

Я заняў сваё месца старшыні і пацікавіўся ў намеснікаў, што здарылася. Мне адказалі, што дэпутаты абвясцілі галадоўку на знак пратэсту супраць прапанаванага прэзідэнтам рэферэндуму.

Акцыя сталася нечаканасцю не толькі для мяне, але і для астатніх дэпутатаў. Кіраўніцтву ВС, г. зн. ні мне, ні маім намеснікам, папярэдне ніхто з апазіцыі пра яе не паведаміў. Мне думаецца, што прапанова аб'явіць галадоўку не абмяркоўвалася нават на пасяджэнні ўсёй фракцыі БНФ у ВС. Я ўпэўнены: гэтае спантаннае рашэнне прыняў З. Пазьняк перад самым пачаткам сесіі. Словам, тады я разгубіўся, бо ў такіх абставінах праводзіць пасяджэнні было нечакана складана. Разгубіліся і астатнія дэпутаты: яны мусілі, ідучы да трыбуны, пераступаць цераз ногі сваіх калегаў-галадоўнікаў. Тады кожны меў права выказваць свае думкі і меркаванні, кожны меў права таксама і на галадоўку.

Спачатку зала рэагавала на галадоўнікаў з прыхаванай незадаволенасцю. Я звярнуўся да дэпутатаў з пытаннем: "Шаноўныя, што нам рабіць у такіх абставінах: адкрываць пасяджэнне ці спыніць сесію?" І мы прыйшлі да высновы, што калі апазіцыянеры хочуць галадаваць проста ў зале ВС, гэта іх права, а мы працягнем працу.

Ніхто з галадоўнікаў са мною асабіста не абмяркоўваў тэхнічных дэталяў акцыі. Адно толькі перад самым абедам, у перапынку паміж пасяджэннямі, да мяне падышоў З.Пазьняк і сказаў, што, паводле ягоных звестак, улада мае намер сёння ўначы напасці на галадоўнікаў, збіць іх і выгнаць з залы пасяджэнняў. Я адказаў яму, што ў мяне падобных звестак няма, але я выклічу начальніка аховы і разбяруся.

Начальнікам аховы тады быў наш дэпутат, падпалкоўнік міліцыі Міхаіл Цесавец, які ўжо перайшоў на працу ў Адміністрацыю прэзідэнта. Я паклікаў яго і кажу: "Да мяне звярнуўся З.Пазьняк і паведаміў, што мае звесткі пра магчымы напад на дэпутатаў. Я не хачу, каб тут, у зале, што-небудзь здарылася. Вы ж разумееце: дэпутаты маюць права на галадоўку, хоць мне і не падабаецца, што яны аб'явілі яе тут, у зале, а не на плошчы і не ў сваіх кабінетах. Тым не менш трэба, каб усё было спакойна і мірна". "Мы зробім усё патрэбнае, нічога падобнага не адбудзецца", — запэўніў мяне тады М.Цесавец. Аднак потым, калі галадоўнікаў разганялі і выносілі з залы, М.Цесавец аказаўся адным з удзельнікаў збіцця.

На той момант, як апазіцыя абвясціла галадоўку, ВС яшчэ не прыняў рашэння па рэферэндуме. Былі вялікія спрэчкі. Калі б не галадоўка, то, пэўна, удалося б дамовіцца з уладамі, каб нешта змяніць. Але камень быў кінуты, адно пацягнула за сабой другое — атрымаўся эфект снежнай лавіны. Потым Вярхоўны Савет усё ж прагаласаваў за рэферэндум у траўні 1995 г. Тых дэпутатаў, якія яшчэ ваганіся, падштурхнула да гэтага галадоўка. Дарэчы, Канстытуцыя 1994 г. давала прэзідэнту права ўносіць прапановы аб правядзенні рэферэндуму і фармуляваць пытанні на рэферэндум. ВС не мог і не меў права адмовіць прэзідэнту ў ягонай ініцыятыве ці змяніць пытанні, сфармуляваныя прэзідэнтам. Найвышэйшы заканадаўчы орган меў толькі права прызначыць дату рэферэндуму.

У той дзень сесію я вёў да самага яе канца а 18-й ці 19-й гадзіне вечара. Калі я выходзіў з залы пасяджэнняў, мяне па завядзёнцы падмянялі намеснікі. Пасля закрыцця сесіі 11 красавіка я разам з іншымі дэпутатамі пакінуў залу пасяджэнняў — там засталіся толькі галадоўцы і разам з імі асобныя карэспандэнты. Дарэчы, з акрэдытацыяй журналістаў у тыя часы не было праблем. Яны зазвычай прысутнічалі на пасяджэннях парламента з дыктафонамі і камерамі, калі мелі акрэдытацыю. У той дзень да 18-й гадзіны ў зале здымалі акрэдытаваныя карэспандэнты з Расіі і нашыя, айчынныя. Чаму ў той раз у зале засталіся нейкія журналісты: ці іх запрасілі самі галадоўнікі, ці накіравала туды Адміністрацыя прэзідэнта — я не ведаю. Пэўна, яны апынуліся там з ініцыятывы апазіцыі. Відаць, яна імкнулася прыцягнуць як мага больш увагі да галадоўкі, бо інакш у ёй не было б ніякага сэнсу.

Па закрыцці сесіі 11 красавіка я паехаў у свой офіс на вул. К.Маркса, у будынку былога ЦК КПБ, дзе працавалі мае намеснікі і знаходзіўся сакратарыят ВС, які ўзначальваў А.Анціпенка. Я працаваў там прыкладна да 9-й гадзіны вечара. Усё было ціха і спакойна, і я паехаў адпачываць у сваю рэзідэнцыю ў Драздах. Я не тэлефанаваў і не цікавіўся, што адбываецца з галадоўнікамі, бо звычайна, калі што здаралася, тэлефанавалі мне. Такі быў парадак, і я сам не турбаваў службы. Нарэшце, той цяжкі дзень досыць мяне знерваваў.

Пра тое, што здарылася ўначы з дэпутатамі ў зале пасяджэнняў, я даведаўся а 8-й гадзіне раніцы наступнага дня, калі прыехаў на працу ў будынак на К.Маркса. Я ўбачыў там збітых, змучаных В.Голубева, Ю.Беленькага і, здаецца, П.Садоўскага. Я напаіў іх мінеральнай вадой, а яны мне распавялі, што здарылася ўначы і як з імі абышліся вайскоўцы. Яны казалі, што спрабавалі званіць мне, але мой тэлефон у рэзідэнцыі быў заблакаваны. Я параіў ім прайсці судова-медыцынскую экспертызу, перадусім зафіксаваць пабоі, каб не марнаваць часу, бо гэта вельмі адказная справа, і яе трэба зрабіць своечасова. Я паабяцаў ім разабрацца і выклікаў да сябе генеральнага пракурора В.Шаладонава. Пагадзіліся ўзбудзіць крымінальную справу па факце збіцця дэпутатаў ВС.

Потым я неадкладна сабраў Прэзідыум Вярхоўнага Савета і перш за ўсё прапанаваў у сувязі з тым, што ў зале ВС збілі дэпутатаў, праводзіць пасяджэнні ВС не на Мяснікова, а тут, у будынку ЦК на К. Маркса, хоць зала тут меншая, не прыстасаваная, без мікрафонаў. Некаторыя чальцы прэзідыума выказалі нязгоду. Яны гаварылі, што дэпутаты прывыклі да старой залы, што там у кожнага — сваё месца, абсталяванае для галасавання, а тут, на К.Маркса, амаль пустая, тэхнічна не абсталяваная зала. Пры галасаванні большасць падтрымала іх.

Перад пачаткам сесіі я затэлефанаваў А.Лукашэнку. Ён запэўніў мяне, што не мае дачынення да начных падзей, што ён нікога не разганяў, нічога не ведае, але ва ўсім разбярэцца. Ён быў першай асобай у дзяржаве, я — другой, і таму я не мог настойваць. Мы папрасілі ўсіх прадстаўнікоў сілавых структур даць свае тлумачэнні наконт начнога здарэння.

Што тычыцца следства пракуратуры, якое вёў Язэп Бролішс, то, як юрыст, я перакананы: ніхто з кіраўнікоў не мае права ўмешвацца ў папярэдняе следства, бо гэта пашкодзіць раскрыццю ісціны. Я нават і не мог прапанаваць нікому, каб мяне азнаёмілі з матэрыяламі папярэдняга следства, а іх, зразумела, можна выкарыстаць як хочаш.

Калі мы прыйшлі ў залу пасяджэнняў ВС на плошчы Незалежнасці, там ужо не засталося ніякіх слядоў начнога здарэння — усё пачысцілі і прыбралі. Ніхто з пацярпелых уначы не спрабаваў працягваць галадоўку. Для іх, як і для іншых дэпутатаў, дзверы ВС былі адчыненыя — яны маглі прыходзіць, займаць свае месцы, запісвацца для выступленняў і выступаць каля мікрафона. Ніхто не аспрэчваў гэтага іх права. Ніхто з іх не паведамляў мне, як старшыні ВС, што нехта іх не пускае ў залу пасяджэнняў парламента выконваць свае дэпутацкія абавязкі. Я не даваў з гэтай нагоды нікому ніякіх указанняў.

Калі пачалася сесія, практычна ва ўсіх выступах гучала тэма начнога здарэння ў зале. Ніхто з запрошаных сілавікоў не хацеў прызнавацца, што мае дачыненне да начной акцыі супраць галадоўнікаў. Усе дэпутаты былі настолькі ўзрушаныя, што гэтай тэмы не абміналі ні правыя, ні левыя. Людзі разумелі: калі сёння з залы выкінулі адных, заўтра гэтак жа могуць збіць і іншых. На гэтым прыкладзе дэпутаты ўбачылі, што яны безабаронныя перад выканаўчай уладай. І калі 11 красавіка ў вачах дэпутатаў чыталася нямое асуджэнне галадоўкі, дык 12 красавіка ўжо адчувалася спачуванне да яе ўдзельнікаў. Можа, яно зыходзіла не ад усіх дэпутатаў, аднак я памятаю па выступах, што ніхто галадоўнікаў не асуджаў, не ўпікаў ні ў чым. Ім спачувалі нават іх самыя зацятыя ворагі. Я не памятаю, каб нехта з пацярпелых дэпутатаў распранаўся проста ў зале пасяджэнняў і дэманстраваў сваю пабітую спіну. М.Цесаўца, праўда, ганялі па зале, але боек не было.

Паступіла інфармацыя, што прэзідэнт паабяцаў усё расследаваць, даручыў разабрацца, што здарылася ўначы ў зале ВС: маўляў, там Бог ведае што чынілася, быў прытон, пілі гарэлку, віно, і ў яго ёсць відэазапіс. Аднак я ў гэта не верыў, хоць бы таму, што З.Пазьняка ды іншых галадоўнікаў неяк папярэдзілі, і яны чакалі нападу. Я меў рацыю: ніякай стужкі прэзідэнт не паказаў і дасюль.

У гэты дзень прэзідэнт абвясціў, што выбары ў новы Вярхоўны Савет будуць у траўні, і паўнамоцтвы гэтага ВС скончыліся, бо першыя выбары дэпутатаў ХІІ склікання адбыліся ў сакавіку 1990 г., і пяцігадовы тэрмін дэпутацкіх паўнамоцтваў, на яго разуменне, завяршыўся 04.03.1995 г. Аднак тэрмін паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета адлічваецца з першай устаноўчай сесіі, а не з дня абрання дэпутатаў. Прэзідэнт не пажадаў слухаць нашых доказаў і заявіў, што мы ўжо сваё адпрацавалі і час разыходзіцца. Ён запрасіў усіх на банкет у сталоўку Савета міністраў, дзе звычайна харчаваліся ўсе дэпутаты разам з урадавымі службоўцамі. З'явіўся амаль увесь дэпутацкі корпус. Я пайшоў туды вымушана. Вечарына не была доўгай — без нейкай бяседы і ўрачыстых тостаў. Мы выпілі, можа, па 100—150 г віна ці гарэлкі без усялякай весялосці. Я адчуваў сябе няёмка, быццам пад прыгнётам.

Выбары ў траўні 1995 г. сумяшчаліся з рэферэндумам і праходзілі пад сцягам фактычна абвешчанай прэзідэнтам вайны супраць дэпутатаў. А.Лукашэнка неаднаразова заяўляў у электронных СМІ, што парламент не патрэбны, у выбары ён не верыць і на выбары не пойдзе. Ён практычна агітаваў выбарцаў за байкот выбараў. А ўмовы тады былі жорсткія: лічылася, што выбары адбыліся, калі ў першым і другім туры ўзялі ўдзел не менш за 50 % ад выбарцаў, унесеных у спісы для галасавання. Тады, у траўні, у ВС не абралі нікога з апазіцыі.

Сказаць, што вынікі выбараў і рэферэндуму ў траўні 1995 г. сфальсіфікаваныя, немагчыма. Тады такога, як цяпер, не было. У нас не ўзнікала сумневаў у сумленнасці Цэнтрвыбаркама і мясцовых выбарчых камісій, таму што арганізацыйна яны падпарадкоўваліся нам. На рэферэндум выносіліся прапановы, якія падтрымлівала большасць электарату. А.Лукашэнка меў на той час вельмі высокі рэйтынг. Шмат хто з кандыдатаў у дэпутаты ішоў на выбары пад лозунгам падтрымкі прэзідэнта. За іх і прагаласавалі людзі, бо ўсё, што ён рабіў, лічылі слушным, а ўсе ягоныя няўдачы прыпісвалі ягоным "ворагам".

Яшчэ не зацвердзілі вынікаў травеньскага рэферэндуму, а І.Ціцянкоў і яго каманда 17 мая залезлі на адабраны ў нас будынак на вул. К.Маркса і сцягнулі з яго даху бела-чырвона-белы сцяг, разарвалі яго на кавалкі, якія потым раздавалі з аўтографамі. Гэта быў відавочны крымінал. На знак пратэсту насупраць, у Андрэеўскім скверы, каля грамадскай прыбіральні, моладзь спаліла, здаецца, расійскі сцяг. Іх затрымала міліцыя і распачала крымінальную справу. Адзін з удзельнікаў акцыі ў 1997 г. звярнуўся да мяне па абароны. Яго асудзілі, далі ўмоўную меру пакарання. Тады ж група дэпутатаў звярнулася ці то ў органы МУС, ці то ў пракуратуру, каб следчыя органы ўзбудзілі крымінальную справу па факце апаганьвання дзяржаўных сімвалаў. Аднак яе адмовіліся разглядаць і адказалі, што Ціцянкоў выявіў звычайную халатнасць, а складу злачынства ў ягоным учынку, маўляў, зусім не відаць.

Лявонцій ЗДАНЕВІЧ

Нягнуткасць загубіла БНФ

...З памяці сцёрліся падрабязнасці абмеркавання прэзідэнцкай ініцыятывы наконт рэферэндуму 1995 г. Спачатку прапаноўваліся два пытанні, потым іх стала чатыры. Праекты сімвалаў з'явіліся звонку, а не ў камісіях ВС і не ў геральдычнай камісіі. Хутчэй за ўсё яны паходзілі ад нейкіх хаўруснікаў прэзідэнта. Я быў сярод тых, хто прымаў рашэнне пра тэрміны і сродкі пратэсту. Альтэрнатывы галадоўцы практычна не заставалася.

Наступіў момант, калі ВС здыскрэдытаваў сябе. Ён дажываў апошнія дні. Апазіцыя пасля паразы на прэзідэнцкіх выбарах перажывала не найлепшыя часы. Мы як пірагі пяклі рознага роду заявы, публікавалі іх, але эфекту ад іх было мала. Ніякія заявы ўжо не маглі паўплываць на сітуацыю. Трэба было нешта рабіць, каб ацвярозіць большасць, паказаць, якая небяспека пагражае нашай кволай дэмакратыі. Мы звярталіся не да народу, а да саміх дэпутатаў.

Пытанне пра галадоўку абмяркоўвалася цягам аднаго-двух тыдняў. Калі мы аб'явілі яе, то значная частка залы абуралася, але потым быццам бы задумалася. Перамовы з Грыбам у гэтым часе вёў З.Пазьняк.

Падчас галадоўкі мы сапраўды нічога не елі — толькі пілі мінеральную ваду. Мы меркавалі, што ўлада пойдзе на правакацыі, але фактычна нічога не маглі ім супрацьпаставіць. Напрыклад, кагосьці з нас сфатаграфавалі з узнятай і перакуленай бутэлькай. Затым здымак надрукавалі як доказ, што галадоўцы п'юць гарэлку. Саму акцыю 11 красавіка, здаецца, зверху, з балкона ў Авальнай зале ВС, здымалі дзве камеры.

Нас угаворваў разысціся Міхаіл Цесавец і яшчэ адзін, каротка падстрыжаны. Салдаты шукалі міну. Мы таксама бачылі і чулі, што робіцца ў фае. Перад хапуном мы селі ў прэзідыум шчыльна, плячом да пляча. Вайскоўцы ў залу ўрываліся адусюль з крыкам, тупатам, у чорных масках, з дубінкамі, ускоквалі нагамі проста на сталы.

Я асабіста не аказваў фізічнага супраціву. Нас хапалі, цягнулі і білі па спіне, штурхалі. У фае стаяў вялізны натоўп узброеных, у масках і са шчытамі вайскоўцаў. З кім я ехаў, ужо не памятаю. Выходзілі мы каля будынка ВС, потым падаліся ў гатэль, да нашых дэпутатаў.

Зранку мы вярталіся на пасяджэнне пешшу. Да будынка ВС нас ад гатэля суправаджала каля сотні чалавек — нешматлікія выбарцы, якія сачылі за палітычнымі падзеямі і перажывалі за нас. Міліцыя (напэўна, АМАП) спыніла людзей каля гарвыканкама і вельмі груба саштурхнула іх уніз, пад калоны.

Мы, дэпутаты, прайшлі праз плошчу і трапілі ў будынак Дома ўрада праз уваход у Саўмін. Там утварыўся затор. Нас спынілі і не пускалі на пасяджэнне. Мы паказалі ахове дэпутацкія пасведчанні, гаварылі, што парушаюцца нашыя правы. Вартавыя неяк замяліся. Добра памятаю: Валянцін Голубеў першым не вытрымаў і націснуў на міліцыянта. Разам з яшчэ некалькімі дэпутатамі я сілай прарваўся скрозь кардон.

Далей у вестыбюлі і фае нас ужо ніхто не чапаў. У зале мы селі не на свае нумарныя месцы, а ў сектар урада. Памятаю жахлівую атмасферу ў асяроддзі г. зв. большасці. Быццам наздзекаваліся не з нас, а з іх...

Працягваць галадоўку не было сэнсу, таму што яе фактычна спынілі гвалтам. Мы хацелі паўздзейнічаць на калегаў, і па-за межамі Вярхоўнага Савета ніякага эфекту ў тых умовах яна мецъ не магла.

На выбарах у траўні 1995 г. БНФ пацярпеў паразу. Я б вызначыў некалькі яе прычын. Па-першае, апантаная прапагандысцкая кампанія супраць БНФ і іншых дэмакратычных сілаў. Па-другое, нягнуткасць кіраўніцтва Фронту, невыкарыстанне тонкіх папулісцкіх PR-ходаў, без якіх немагчыма дабіцца поспеху ў палітыцы. Адсутнасць гнуткай стратэгіі і папулізму загубіла БНФ. Трэцяя прычына не менш важная. Калі нейкая палітычная структура не дасягае пастаўленых мэтаў, тады на пэўным этапе неабходна змяняць лідэраў. У нас жа адныя і тыя лідэры па-ранейшаму заставаліся каля стырна. Людзі ж, якія працавалі на агульную справу на месцах, ахвяравалі сабой, сем'ямі і працай, 10 і болей гадоў не бачылі плёну сваёй дзейнасці. Гэта ненармальна, гэтага не павінна быць...

Мікалай КРЖЫЖАНОЎСКІ

Са збіцця дэпутатаў пачалася дыктатура

...Па абранні Лукашэнкі прэзідэнтам краіны пачаўся наступ на беларушчыну, на галоўныя прыкметы беларускай дзяржаўнасці, перадусім на мову і дзяржаўныя сімвалы. Мы спрабавалі рабіць, што маглі, каб спыніць гэтую згубную палітыку, але бачылі, што нашыя намаганні марныя.

Калі на сесіі Вярхоўнага Савета ў красавіку 1995 г. Лукашэнка ўнёс прапанову аб рэферэндуме, мы адразу ўбачылі ў ім спробу знішчыць асновы нашай дзяржаўнасці: мову, дзяржаўныя сімвалы краіны.

Пазьняк 11 красавіка з трыбуны ВС сказаў, што прэзідэнт навязвае нашаму грамадству антыканстытуцыйны рэферэндум, што мы вычарпалі ўсе магчымасці і ў нас няма іншага выйсця, апроч галадоўкі, і мы аб'яўляем яе тут, у гэты час, у гэтай зале. Ён пайшоў і сеў на прыступку каля трыбуны. Мы далучыліся да яго. Усё адбылося спантанна. Нікога не трэба было пераконваць у слушнасці такога кроку. Мы былі гатовыя на ўсё, каб не дапусціць ганебнага рэферэндуму.

Зала ВС сустрэла нашу акцыю доўгім маўчаннем. Прысутныя дэпутаты не разумелі, як гэта іх калегі будуць галадаць проста ў зале пасяджэнняў. Яны спрабавалі працягваць працу, як быццам бы нічога не здарылася. Я не сумняюся, што наш учынак уразіў прысутных дэпутатаў настолькі, што яны завалілі ўсе прапановы Лукашэнкі, нягледзячы на ўсе яго намаганні. У той дзень нам удалося сарваць прыняцце рашэння пра рэферэндум.

Мы бачылі, што пачалі сваю акцыю не марна, бо першы ж дзень даў свой плён. І тады Лукашэнка і яго хаўруснікі, якія ўсё адсочвалі, зразумелі, што пакуль у сценах Вярхоўнага Савета будзе доўжыцца галадоўка, у іх нічога не атрымаецца. Таму і вырашылі любым шляхам выкінуць галадоўнікаў з парламента.

Пасля 18-й гадзіны да нас пачалі прыходзіць усякія парламенцёры менавіта з аховы прэзідэнта. Быў кіраўнік аховы са стрыжанымі хлопцамі ў скураных куртках. Яны спрабавалі нам нешта давесці, казалі, што зала замінаваная і яе трэба пакінуць.

Потым, гадзіне а 12-й ночы, заходзілі павайсковаму апрануты сапёры шукаць міну. Яны недзе за паўгадзіны праверылі залу, але нічога не знайшлі. Потым іншыя пасланцы пераконвалі нас, што ўжо позна і залу трэба вызваліць і зачыніць. Мы адказалі, што мы не пабочныя асобы, а народныя дэпутаты, што мы праводзім галадоўку на працоўным месцы. Яны пагражалі вывесці нас гвалтам і нават спрабавалі цягнуць некаторых за рукаво. Мы адказвалі: не маеце права, не забывайце, што за гэта вы будзеце несці не проста дысцыплінарную, а крымінальную адказнасць. І так цягнулася гадзіны да 2-й ночы.

Хіліла ў сон, і каля 2-й гадзіны мы задрамалі, хто дзе ўладкаваўся: проста на падлозе ці ў крэслах. Дзяжурства мы не прызначалі. Раптам скрозь сон я пачуў крык Голубева: "Уставайце, уставайце!" Мы хуценька паўскоквалі са сваіх месцаў. Загарэлася святло, і я ўбачыў, што па ўсёй Авальнай зале і наверсе шчыльна адзін да аднаго стаяць узброеныя вайскоўцы. Відаць, яны хацелі пахапаць нас соннымі. Хтосьці з іх (здаецца, Каралёў) нас яшчэ раз папярэдзіў, каб мы пакінулі залу, бо інакш яны пусцяць у ход сілу. Мы паспелі ім адказаць: добраахвотна не сыдзем. Мы паселі ў крэслы на месцы прэзідыума і ўчапіліся за рукі.

У гэты момант на кожнага з нас накінулася па 3—4 "гарылы" ў чорных масках са шчылінамі для вачэй. Яны былі без зброі, але, відаць, добра натрэніраваныя. Падскочыўшы да мяне, двое адразу закруцілі мне рукі, а адзін пачаў біць па спіне ззаду. Мяне вырвалі з месца і павалаклі тварам уніз. Яны моцна скруцілі мне рукі і білі. Я паспеў убачыць валтузню вакол Пазьняка — яму ціснулі на вочы. Я чуў, як яны раўлі. Аднаму з іх І.Гермянчук, цяпер нябожчык, паспеў сарваць маску. Нападнік затуліў твар, кінуў ахвяру.

Відэакамеры я добра бачыў. Было іх 2 ці 3, а адна наверсе, здаецца, стацыянарная. Пачалі яны здымаць гадзіны з 18-й, як толькі закончылася пасяджэнне ВС, і здымалі бесперапынна ўвесь вечар да той пары, пакуль мы не выключылі святло і не палеглі адпачываць.

Нападнікі выводзілі мяне ў дзверы направа, у вузкі двор. Я заўважыў, што ўздоўж шчыльна стаялі ўзброеныя міліцыянты. Я кажу ім: "Хлопцы, чаму вы моўчкі глядзіце?" Яны не рэагавалі. Затым мяне, як бервяно, укінулі ў міліцэйскі ўазік з металічнай падлогай. Я не разбіў галаву толькі таму, што паспеў прыкрыць яе рукамі. Доўга нас па Менску не вазілі — выкінулі недзе ў раёне вул. Казлова. Праз некалькі гадзін мы сабраліся ў гатэлі "Кастрычніцкая". Некалькі чалавек пайшлі ў пракуратуру. Мы напісалі калектыўную заяву, на падставе якой была распачатая крымінальная справа. Следчы Язэп Бройлішс асабіста дапытаў кожнага з нас, размаўляў падрабязна і доўга, затым накіраваў на медыцынскую экспертызу. У мяне да таго часу апухлі абедзве лапаткі — яны балелі яшчэ тыдні два. У Пазьняка твар быў у сіняках. У А.Шута па дыяганалі на спіне — след дубінкі. У А.Трусава — сінякі на нагах.

Назаўтра нас не пускалі на пасяджэнне Вярхоўнага Савета міліцыянты, хоць я паказваў ім дэпутацкае пасведчанне. Не пускалі нават Васіля Шаладонава — відаць, памыліліся. Памятаю, што І.Гермянчук, тады рэдактар "Свабоды", змясціў у газеце фота, як В. Шаладонава не пускалі ў будынак ВС услед за мной. Пад здымкам — подпіс: "А гэтага за што?" Праўда, хвілін праз 10 ахоўнікі атрымалі нейкую каманду і прапусцілі нас. Мы прыйшлі ў залу са спазненнем, няголеныя, змораныя і збітыя. Дэпутат Шут паказваў проста на пасяджэнні ВС сваю спіну з пісягамі ад пабояў. А з залы гучала: "Мала далі".

Жаданне працягваць галадоўку ўжо не было: калі нас выкінулі з залы ВС, дык і зноў выкінуць. Аднак мы разлічвалі на грамадскі рэзананс, на тое, што крымінальную справу давядуць да канца. Лукашэнка потым выступаў, маўляў, я вам пакажу, як яны там "галадавалі" і чым займаліся. А няхай бы паказаў. Я не сумняюся, што адпаведныя відэазапісы засталіся. Дарэчы, хтосьці з нашых дэпутатаў бачыў у двары, калі мы клаліся спаць у зале ВС, прэзідэнцкі "мерседэс".

Як толькі Лукашэнка стаў у 1994 г. прэзідэнтам, ён адразу павёў наступ на Вярхоўны Савет, каб умацаваць асабістую ўладу. Ён не хацеў дзяліцца ні з кім сваімі паўнамоцтвамі. Ён разумеў, што самастойны парламент створыць такія законы, якія абмяжуюць уладу прэзідэнта. Са збіцця дэпутатаў у Беларусі пачала замацоўвацца дыктатура А.Лукашэнкі. Сёння відавочна, што ў нашай краіне не дзейнічае прынцып падзелу ўлады, бо парламент пазбаўлены рэальных паўнамоцтваў, няма незалежных судоў.

(Працяг будзе.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
18 КРАСАВІКА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

Три революции

Общенациональные дебаты о национальной безопасности, о необходимости которых говорят уже давно, все никак не начнутся. По сути, вопросы тактики затмили самую важную проблему, с которой столкнется новая администрация США, а именно — как "вычленить" новый мировой порядок из трех революций, которые сейчас одновременно происходят на нашей планете.

Это преобразование традиционной государственной системы Европы, угроза радикального исламизма и смещение "центра тяжести" международных отношений с Атлантики к Тихому и Индийскому океанам.

По распространенному мнению, корнем разногласий между Европой и Америкой является гипотетическая доктрина однополярности, которой придерживается президент Буш. Но вскоре после смены администрации США станет очевидно, что главное разногласие между двумя сторонами Атлантики состоит в другом: Америка остается традиционным национальным государством и ее население откликается на призывы чем-то пожертвовать ради национальных интересов, понимаемых намного шире, чем в Европе.

Государства Европы, истощенные двумя мировыми войнами, согласились передать Европейскому Союзу важные аспекты своего суверенитета. Однако, как оказалось, узы политической верности, которые ассоциируются с национальным государством, автоматической передаче не поддаются. Европа переживает переходный период — она на полпути между своим прошлым, от которого стремится уйти, и будущим, которого еще не достигла.

Это видно на примере разногласий вокруг использования сил НАТО в Афганистане. Когда НАТО приступило к практической реализации обязательств, многие союзники были вынуждены, подчиняясь ограничениям в законодательстве своих стран, сократить численность воинского контингента и сузить количество миссий, сопряженных с опасностью для жизни. В результате Североатлантический альянс находится в процессе перерождения в двухъярусную систему — этакую структуру с гибкими правилами членства, потенциальная способность которой к слаженным действиям не отвечает ее общим обязательствам. Со временем произойдет трансформация либо в одну, либо в другую сторону: общие обязательства будут пересмотрены или будет формально закреплена двухъярусная система, где политические обязательства и военный потенциал будут как-то уравновешиваться путем некой системы альянсов по доброму согласию.

Сегодня угрожает радикальный ислам, что выражается в фундаменталистском понимании Корана как основы некой универсальной политической организации. Джихадистский ислам отвергает национальный суверенитет, основанный на моделях светской государственности; он стремится распространять свое влияние на все районы, где значительная доля населения — люди мусульманского вероисповедания. Поскольку в глазах исламистов не имеет законного статуса ни структура международного сообщества, ни внутренние структуры существующих государств, эта идеология почти не оставляет места для западных концепций переговоров или равновесия в регионе, который жизненно важен для безопасности и благополучия промышленно развитых государств.

Эти преобразования происходят на фоне третьей тенденции — смещения "центра тяжести" международной политики с Атлантики к Тихому и Индийскому океанам. Как это ни парадоксально, такое перераспределение мощи благоволит части мира, где страны пока сохраняют черты традиционных европейских государств. Основные государства Азии — Китай, Япония, Индия, а со временем, возможно, Индонезия — смотрят друг на друга так, как участники европейской системы сил и противовесов в былые времена: как на конкурентов по определению, даже когда изредка участвуют в совместных делах.

В прошлом подобные перемены в структуре мощи обычно влекли за собой войны; так случилось после укрепления Германии в конце XIX века. Сегодня многие встревоженные комментаторы приписывают сходную роль Китаю, который набирает мощь. Но экономическая и финансовая глобализация, срочные задачи, касающиеся окружающей среды и энергетики, а также разрушительная мощь современного оружия — все это требует активно заняться международным сотрудничеством, особенно между США и Китаем. Если эти страны будут видеть друг в друге противников, обе они окажутся в том же положении, что и Европа после двух мировых войн, когда другие страны заняли то видное место, которое стремились занять европейские страны путем саморазрушительных конфликтов друг с другом.

Еще ни одному поколению человечества не приходилось иметь дело с несколькими различными революциями, одновременно происходящими в разных частях света. Попытка разработать единый, универсальный рецепт — это погоня за химерой. В мире, где единственная сверхдержава отстаивает прерогативы традиционного национального государства, где Европа застряла на промежуточной стадии, где Ближний Восток не вписывается в модель национального государства и находится на грани революции по религиозным мотивам, — как должен выглядеть в этом мире международный порядок, способный удовлетворить все эти разнородные перспективы? Годятся ли в этих обстоятельствах уже существующие международные организации? Какие реалистичные цели Америка может поставить перед собой и перед мировым сообществом?

Вот о чем нам следует дискутировать, а не о слоганах, разработанных с расчетом на целевые группы и попадание в заголовки газет.

Генри КИССИНДЖЕР.
"Вашингтон пост".

ФОТОВЗГЛЯД

На Шри-Ланке прошел фестиваль боевых искусств, который ранее был запрещен.

В Нью-Йорке на конкурсе дизайнеров был представлен "природный" компьютер.

Сделай Великобританию чище! Об этом должен напоминать жителям и гостям Лондона огромный окурок, установленный на Трафальгарской площади.

Недалеко от Нью-Дели родилась девочка, у которой две пары глаз, два носа и два рта. Ее уже почитают как реинкарнацию индуистской богини.

КАЛЕЙДОСКОП

Пчелы отомстили

В мексиканском городе Тапачула как минимум 70 полицейских попали в больницу после встречи с пчелами-убийцами, сообщают Fox News.

Офицеры полиции проводили учения, и один из них случайно попал в улей с пчелами. Потревоженные пчелы стали защищать свой дом. По словам представителя полиции, разозленные насекомые преследовали полицейских и смогли ужалить около 70 из них. Состояние 10 пострадавших врачи оценивают как серьезное.

Попугай по имени Барни

В Великобритании попугай по имени Барни научил двух своих друзей ругаться матом, сообщает портал Ananova.

Семилетний Барни был известен своей привычкой нецензурно выражаться. Как рассказал владелец попугая Джефф Грюкок, Барни не отказался от своих манер, несмотря на наказания, и даже консультации со специалистом-зоологом. Более того, однажды он посоветовал зашедшим в гости к Грюкоку жене мэра, священнику и двум полицейским офицерам отправиться в известном направлении и присовокупил к этому предложению нелестный эпитет.

Недавно у Барни открылся преподавательский талант. Он научил двух своих друзей, попугаев Сэма и Чарли, использовать известные ему слова. Теперь все три попугая, живущие вместе, проводят время, соревнуясь, кто громче произнесет тот или иной мат.

Грюкок, владелец попугаев, признается, что ему приходится постоянно включать телевизор на полную громкость, потому что слушать разговоры своих питомцев он больше не может.

Термиты съели

Трейдер из индийского штата Бихар потерял все свои сбережения из-за термитов, которые съели его деньги, хранящиеся в банковской ячейке, сообщает BBC.

По словам Дварики Прасада, в сентябре 2005 года он положил в банковскую ячейку государственного Центрального банка Индии 450 тысяч рупий (11 тысяч долларов) в валюте, 232 тысячи рупий (5660 долларов) ценными бумагами, а также золотые и серебряные украшения. Трейдер признался, что пребывает в конфликте с женой и хотел обезопасить свои сбережения, положив их в банковский сейф. Однако когда он открыл ее в январе 2008 года, внутри он обнаружил только пыль и объедки ценных бумаг.

"Я разорен. Я просто не знаю, что делать, ведь я копил эти деньги, чтобы обеспечить себе старость", — признался пострадавший.

В банке утверждают, что вывесили предупреждение о термитах 8 мая 2007 года и рекомендовали забрать ценные бумаги из сейфов. В то же время там признают, что не связывались с каждым клиентом индивидуально.

По словам представителя банка, когда от клиентов стали поступать жалобы на муравьев, помещение было обработано инсектицидом. По его мнению, клиенту не в чем винить банк, ведь ячейка осталась целой и невредимой.

"Банк не несет ответственности за сохранность депозитов внутри сейфа, он отвечает, только если ячейка была взломана", — сказал менеджер банка. Жалобу клиента передали в более высокие инстанции, однако в банке считают, что ему вряд ли стоит надеяться на получение компенсации.

Ведро змей

Житель литовского Шяуляя пришел в городское самоуправление с ведром змей, сообщает Delfi.lt. По информации агентства, речь идет о гадюках.

Литовец решил навестить чиновников, после того как некий представитель горсовета позвонил ему и высказал претензии в связи с тем, что тот держит дома опасных животных.

Хозяин змей объяснил, что они нужны ему для получения лекарств. Тем не менее он не стал спорить с чиновниками, сложил своих питомцев в ведро и понес их в горсовет, чтобы узнать, где их можно выпустить.

Представитель самоуправления проводил посетителя до того места, где змеи были пойманы. В итоге животные были отпущены на свободу. А их бывшему хозяину за прогулку с ведром змей грозит штраф.

СТИЛЬ ЖИЗНИ

Подцепить олигарха

Елена проходит 4-й курс лекций, ей остается еще шесть, чтобы закончить обучение, которое обходится ей достаточно дорого: 12 тысяч рублей, почти 500 долларов.

Но она готова даже продать серебряную подвеску, принадлежавшую прабабушке, настолько ей нравится обучение тому, как заставить олигарха потерять голову и жениться на ней.

"Он может быть толстым, страшным и даже пьяницей. Важно, чтобы он был богат. Пусть даже он будет стариком", — признается она корреспонденту газеты LA STAMPA.

Елене 23 года, и она поразительно красива. У нее высшее образование, она разговаривает очаровательно раскованно, работает в сфере информатики. Зачем же тогда посещать эти курсы? "Потому что конкуренция сильнейшая, потому что Москва и Россия переполнены яркими девушками", — отвечает она.

Елена не единственная, кто изучает технику завоевания миллиардеров. Сотни тысяч таких же молодых женщин, как она, пытаются "подцепить олигарха" — выражение, ставшее в Москве обиходным. Рынок растет: каждую неделю появляются новые интернет-сайты и открываются "школы" для девушек, ищущих очень богатых мужей. "Вы хотите выйти замуж за принца? Нет ничего легче, — можно прочесть в учебнике для современных золушек, по которому преподают на курсах, и автор этого учебника — Ксения Собчак. — В России достаточно олигархов, чтобы удовлетворить все ваши мечты. Вам будет достаточно научиться правильно улыбаться, шутить, демонстрировать оптимизм и порыв".

О таком же стиле жизни рассказывается в фильме "Глянец". Елена говорит о нем с энтузиазмом: молодая женщина, родившаяся и выросшая в русской деревне, приезжает в Москву, работает горничной в доме владельца агентства знакомств для богачей, знакомится благодаря ему с олигархом. Последняя сцена — "самая эмоциональная": супруги идут под руку на "Ярмарку миллионеров", которая проводится в Москве зимой, — блестящая метафора мечты об изобилии и элегантности: "Почему такое не может произойти и со мной?"

Потому что олигархи не делают тайны из того, что предпочитают актрис и моделей пусть даже красивым, но, на их взгляд, обычным девушкам.

Елена не ходила голосовать. Ей нет дела до Путина или Медведева. Она ходила "практиковаться" на дискотеку, где вспомнила учебное пособие курса и и испытывала содержащиеся в нем советы на присутствующих мужчинах.

У СОСЕДЕЙ

Станция варшавского метрополитена — самая красивая в мире

Станция варшавского метрополитена "Plac Wilsona", в переводе "Площадь Вильсона", признана самой красивой в мире. Такое решение приняли архитекторы, принимающие участие в конференции MetroRail 2008 в Копенгагене.

Варшавский метрополитен несмотря на то, что насчитывает всего 17 станций и имеет протяженность 19 км, получил мировое признание. Победившая станция удивляет всех огромной системой цветной подсветки в форме эллипса, которая в зависимости от времени дня меняет цвет от голубого до красного или желтого. Как сказала мэр Варшавы Ханна Гронкевич-Валц, эта станция победила благодаря своему современному стилю и хорошей сочетаемости с архитектурой города.

Варшавский метрополитен соревновался с подземными железными дорогами Ванкувера, Мадрида и Копенгагена.

Один процент — общественным организациям

В Польше с 2004 г. налогоплательщики — физические лица, то есть просто рядовые граждане, могут предназначать один процент от суммы вычисленного налога на поддержку деятельности любой общественно полезной организации. Такая возможность появилась после вступления в силу Закона "Об общественно полезной деятельности и волонтерстве", который стал одним из основных законов, касающихся неправительственных организаций в Польше.

Согласно сообщениям Министерства финансов, в первом году действия закона, то есть в 2004 году, около 700 тысяч поляков передало общественным организациям порядка 11 миллионов евро. А за 2006 год польские налогоплательщики перечислили в счет неправительственных организаций более 105 миллионов польских злотых, то есть почти 30 миллионов евро.

Польский сезон в России

Торжественным концертом в Большом театре в Москве открылся Польский сезон в России. Программа этой масштабной акции рассчитана почти на целый год, в течение которого российскую публику ждут многочисленные встречи с польским театром, кинематографом, музыкой, изобразительным искусством, литературой. Причем не только в Москве и Санкт-Петербурге, но и в самых отдаленных от центра России уголках. В планах Польского сезона также несколько научных конференций и творческих встреч.

Министр культуры и национального наследия Польши Богдан Здроевский подчеркнул, что программа мероприятий составлялась с учетом вкусов россиян.

Главным координатором Сезона польской культуры в России является Институт Мицкевича. По мнению его директора Збигнева Салека, этот проект еще больше укрепит творческие связи художественной интеллигенции Польши и России. Збигнев Салек выразил надежду, что сближение в области культуры положительно отразится также на политических и экономических отношениях обеих стран: "В настоящий момент те несколько лет тишины, которая царила между Польшей и Россией, заканчивается. Мы "с шумом входим" и надеемся, что за этим последуют шаги по сотрудничеству в других областях между двумя большими народами, внесшими огромный вклад в культуру Европы".

Подготовил к печати Сергей ИВАНОВ.

ОБРАТИТЕ ВНИМАНИЕ

Если вы не можете оторваться от компьютера?

Если компьютерные игры заставляют вас забыть об отдыхе и еде, если вы не можете ни на минуту прервать интернетную переписку, вам стоит подумать о походе к психиатру. Так считает американский психиатр Джеральд Блок, который внес компьютерную зависимость в число психиатрических расстройств, передает Радио Свобода.

Существуют четыре основных критерия интернет-зависимости. Прежде всего чрезмерно долгое — 30 и более часов в неделю — просиживание в сети с целью развлечься. Часто встречаются те, кто по 8 часов подряд играет в компьютерные игры. Другой признак в том, что пристрастие к компьютеру порождает у человека конфликты с окружающими, проблемы в семье, невыполнение рабочих и учебных заданий. Еще один компонент: если человека отлучить от компьютера, у него появляются симптомы мучительного беспокойства, агрессивности, депрессии. Наконец, пациент проводит у монитора все больше времени, постоянно стремится технически усовершенствовать свой компьютер, устанавливает на него все новые и новые программы.

К тому же долгое сидение за компьютером вредит здоровью. Так, в Южной Корее десять человек умерли от тромбоза, вызванного многочасовым сидением за компьютером. Наконец, специфика заболевания такова, что человек склонен переносить его наедине с собой, живя в виртуальной действительности, и это значительно затрудняет лечение.

Доктор Блок в качестве одного из методов преодоления интернет-зависимости предлагает создавать больше клубов людей, основанных не на виртуальном, а на живом общении.

Министр обороны — на седьмом месяце беременности

Министром обороны Испании впервые в истории страны стала женщина — 37-летний юрист Карме Чакон.

"Назначение Чакон, которая в прошлом кабинете была министром жилья, на пост военного министра стало для многих неожиданностью. Тем более что она находится на седьмом месяце беременности", — пишет близкая к правительству газета Pais, отмечая также, что в новом правительстве впервые стало больше женщин, чем мужчин.

Как объявил глава правительства Родригес Сапатеро, в задачу нового кабинета входит "преодоление переживаемого Испанией экономического кризиса, забота о социальных нуждах населения и борьба с баскской террористической группировкой ЭТА". Испанская социалистическая рабочая партия победила на парламентских выборах 9 марта 2008 года, после чего король поручил ее лидеру Сапатеро сформировать новое правительство, сообщает РИА Новости.

Войны из-за воды?

В будущем не исключены войны из-за воды, если ничего не предпринять, заявил Гарет Томас, министр международного развития в правительстве Великобритании.

Предостережение министра совпало со Всемирным днем воды и обращением коалиции из 27 международных благотворительных организаций к Гордону Брауну -- они потребовали принять меры для обеспечения пресной водой 1,1 млрд человек, страдающих от ее дефицита. "Если мы не возьмемся за эту проблему, то в ближайшие годы водные ресурсы могут стать объектом международных конфликтов, -- отметил Томас. -- Нам нужно сейчас вложить средства и силы -- иначе в будущем придется дорого заплатить за свое бездействие".

Рассказывая об этом, газета "Independent" продолжает, что министерство Томаса предостерегает: к 2025 году две трети населения планеты будут проживать в странах, испытывающих дефицит воды. Это мрачное пророчество прозвучало после того, как премьер-министр Великобритании упомянул, излагая свою стратегию национальной безопасности, что нагрузка на водные ресурсы -- один из факторов, которые могут способствовать "скатыванию государств к нестабильности, краху существующего режима или конфликтам".

Коалиция благотворительных организаций призвала весь мир предпринять усилия для обеспечения развивающихся стран водопроводными сетями, а также охвата очистными сооружениями еще 2,6 млрд человек. Согласно заявлению коалиции, международному сообществу следует предотвратить соперничество за источники воды, поскольку оно влечет к дестабилизации общин и перерастает в конфликты.

В письме коалиции сказано: "Разрешение водного и санитарно-гигиенического кризиса необходимо для того, чтобы "Призыв к действиям по осуществлению программы развития "Тысячелетие" увенчался успехом. Иначе будет подорван прогресс в здравоохранении, образовании и экологической стабильности. Когда школьники пропускают занятия из-за диареи, в мировом масштабе эти потерянное время составляет 443 млн человеко-дней в год. 1,8 млн детей умирает от болезней, вызванных проблемами с водой, хотя этих смертей можно избежать".

"Капиталовложения в канализационно-очистные сооружения и водоснабжение -- самая эффективная мера для улучшения здоровья населения, они дают колоссальные экономические дивиденды. Большой восьмерке следует брать пример со стран Восточной Азии, которые выдвинули решение этих проблем на первое место в своих национальных программах развития".

В стратегии безопасности, предложенной Брауном, отмечается: "Рост температуры воздуха вкупе с экстремальными метеорологическими явлениями усилит нагрузку на водные ресурсы". "От дефицита воды страдает уже значительно более 1 млрд человек, а 30 стран получают более трети своей воды из источников за их пределами. В результате климатических изменений эти цифры наверняка вырастут, что усилит вероятность конфликтов".

Чарли Кроник, старший консультант по вопросам климата в организации Greenpeace, сказал: "Если глобальное потепление продолжится, вся территория Африки южнее Сахары, большая часть Южной Африки и западная часть Южной Америки могут столкнуться с нехваткой воды. От 2 до 3 млрд человек в потенциале будут страдать от нехватки воды. Это очень серьезное дело".

Народная Воля http://www.nv-online.info
18 КРАСАВІКА 2008 г.

ГАСЦЁЎНЯ «НАРОДНАЙ ВОЛІ»

Генадзь МУРАЎЁЎ:

Анколаг з душою літаратара

Адзіны ў Беларусі прафесар анколаг-патамарфолаг Генадзь Мураўёў 15 красавіка адзначыў сваё 70-годдзе.

У шматлікіх выпадках пацвердзіць ці абвергнуць дыягназ "рак" у Беларусі можна толькі пасля таго, як ён паставіць свой подпіс па выніках даследавання. 47 гадоў Генадзь Мікалаевіч Мураўёў працуе ў НДІ анкалогіі і радыялогіі — з першага дня існавання гэтай установы.

"Чалавек, улюбёны ў прафесію", — кажуць пра Мураўёва ягоныя калегі. Генадзь Мікалаевіч сапраўды некалькі гадзін запар можа расказваць пра медыцыну, сучасныя метады лячэння і дыягностыкі раку. Прычым выключна на беларускай мове, якой карыстаецца паўсюдна.

Але не толькі працаю насычана жыццё прафесара Мураўёва. Ён піша вершы (толькі ніколі не прызнаецца ў гэтым публічна), ганарыцца сваім сяброўствам з беларускімі літаратарамі. Захапленні, пра якія гаворыць не тоячыся, — турызм і альпінізм. У маладосці Генадзь Мікалаевіч пакарыў Карпаты, горы Каўказа, у 27 гадоў ажыццявіў узыходжанне на вяршыні Цянь-Шаня.

«Тое, што назапашваў, адгукаецца нядрэнным самаадчуваннем»

— Я заўсёды лічыў, што жыццё — не тыя дні, якія працяклі, а якія запомніліся, — гартае самаробны альбом з фотаздымкамі з Цянь-Шаня Генадзь Мікалаевіч. — Горы — гэта якраз той самы выпадак. А ўсё пачалося з дзяцінства. Гадоў у 10 трапіла ў рукі кніга Янкі Маўра "Палескія рабінзоны". Праглынуў яе, не заўважыў. Самога таксама ў лес пацягнула. У 8-м класе прапанаваў сябрам пешшу ісці ў Бярэзінскі запаведнік. Прызначылі дату — 1 ліпеня. А 30 чэрвеня пахаладала, ноччу ўдарылі замаразкі, і прыйшлося разбіраць заплечнікі: бацькі ў паход не пусцілі. Гэта быў 1953 год...

Потым у медінстытуце была секцыя турызму і альпінізму, трэніроўкі. Пачаліся вандроўкі, горы. Мне патрапілі добрыя інструктары, вабіў экстрым, песні ля вогнішча. У гарах сітуацыі ўзнікалі розныя, і на валаску ад смерці пабываў. Але гэта не спыняла: "лучше гор могут быть только горы, на которых еще не бывал".

— Зараз таксама спортам займаецеся?

— У футбол гуляю, у нашай камандзе аматараў самы старэйшы. Лічу, што спорт — самая лепшая прафілактыка захворванняў. А яшчэ не п'ю, хіба што келіх шампанскага за святочным сталом, і не палю. Тытунь, я перакананы, самая дрэнная звычка чалавека.

Усё жыццё любіў спорт. Някепска гуляў у футбол, плаваў, займаўся боксам, хадзіў у вандроўкі. На байдарках прайшоў усе рэкі Беларусі: Днепр, Прыпяць, Нёман, Заходнюю Дзвіну і г.д. Шкада, што з гадамі праца забірала ўсё больш часу і прыйшлося развітацца з некаторымі захапленнямі. Думаю, тое, што столькі назапашваў у тыя гады, зараз адгукаецца нядрэнным самаадчуваннем.

— Узрост свой адчуваеце?

— Шчыра кажучы, не. І гэта вельмі кепска. Баюся пераступіць тую рысу, калі добрае самаадчуванне будзе глядзецца з боку як нейкая спроба прымаладзіцца. Можа, толькі мае сівыя валасы не дазваляюць выглядаць смешным.

«Рак быў спрадвеку»

— Генадзь Мікалаевіч, усё жыццё вы займаецеся навукай, даследуеце клеткі. Праўда, што ў нашым арганізме штодня выпрацоўваецца вялікая колькасць злаякасных клетак?

— Праўда. Імунная сістэма іх вельмі хутка распазнае і знішчае. А калі імунная сістэма чымсьці пашкоджана — тытунём, іншымі асаблівасцямі ладу жыцця, фізічнымі ўздзеяннямі, радыяцый, ракавыя клеткі могуць дзяліцца і спрыяць разбурэнню тканіны, з якой яны паходзяць. Акрамя знешніх фактараў, узнікненне хваробы можа быць генетычна абумоўлена. Калі бабуля альбо маці хварэла на рак малочнай залозы, то існуе вялікая верагоднасць таго, што захварэць можа і дачка, і ўнучка. Рак страўніка, рак печані — таксама маюць унаследаваную схільнасць.

— Чалавек можа абараніць сябе ад раку?

— Ён можа весці здаровы лад жыцця, не паліць, добра харчавацца. Чалавек мусіць ведаць свой радавод, і калі бабуля альбо дзядуля хварэлі на рак, то больш уважліва ставіцца да свайго здароўя.

— Рак — старадаўняя хвароба?

— Ад чаго памёр фельдмаршал Суворaў — герой Расіі і крывавы кат беларускага народа? Ад раку стрававода. Усё жыццё ён ужываў кіпень, гэта была хімічная і фізічная траўма стрававода, што і прывяло да раку. Тургенеў памёр ад раку. Рэмбрандт на адным са сваіх лепшых твораў адлюстраваў хворую на рак малочнай залозы жанчыну. Мастак, напэўна, не ведаў гэтага, на карціне вельмі добра акрэслена пухліна на адной з грудзей. А гэта XVII стагоддзе. Увогуле рак быў спрадвеку, у шкілетах егіпецкіх мумій яго знаходзяць.

— Чаму менавіта зараз павялічылася колькасць хворых на рак?

— Сапраўды, яшчэ ў 1960—1970-я гады мы вельмі рэдка дыягнаставалі рак у людзей маладога ўзросту — 40-, 50-гадовых. А сёння ў Беларусі створаны цэлы цэнтр дзіцячай анкалогіі, і вельмі цяжкае ўражанне застаецца, калі там пабываеш... Кожны год у краіне амаль у 39 тысяч чалавек выяўляюцца новыя выпадкі пухлін.

На мой погляд, перш-наперш рост захворвання звязаны з ужываннем дрэнных прадуктаў харчавання, тых, якія ўтрымліваюць вялікую колькасць канцэрагенаў, малаактыўным ладам жыцця, нервовымі абставінамі, якія спадарожнічаюць усё жыццё, генетычнымі наступствамі і знешнімі ўмовамі — траўмамі, фізічнымі ці хімічнымі ўздзеяннямі, тытунём, алкаголем.

У Беларусі рэзка павялічылася колькасць самай злаякаснай пухліны скуры — меланомы. У пэўнай ступені гэта звязана з тым, што людзі пачалі распранацца і загараць да чорнага колеру, пачалі карыстацца салярыямі. Трэба больш уважліва ставіцца да любых пігментных, цёмных плямаў на скуры, асабліва, калі яны траўміруюцца.

— Даводзілася чуць меркаванне ўрачоў, што дыягностыка — самае слабае месца беларускай анкалагічнай службы.

— Зразумела, што чым раней распазнаецца рак, тым лягчэй ён лечыцца. Спрошчана можна сказаць, што 1-я стадыя раку — гэта пухліна максімум 1 см, без метастазаў, яна лечыцца на 100 адсоткаў. Але тое, што на Захадзе рак дыягнастуецца лепш, чым у нас, не зусім адпавядае рэчаіснасці. Там таксама процьма прыкладаў, калі выяўляюць рак ужо ў 4-й стадыі, хвароба запушчана. І ў ЗША, і ў Нямеччыне памыляюцца ў пастаноўцы дыягназу. Сярод краін СНД дыягностыка раку лепшая ў Беларусі.

Увогуле беларускія анколагі сёння працуюць на сусветным узроўні. Чаго нам нестае — добрых лекаў, хіміяпрэпаратаў новага пакалення. Абсталяванне маем сучаснае, метады лячэння выкарыстоўваем таксама сучасныя, маем добрую навуковую школу. Толькі б гэта не разгубіць! У паслясавецкія часы вучоныя анколагі працавалі на энтузіязме, заробак у навуковых супрацоўнікаў быў мізэрны. Яшчэ некалькі гадоў таму малады доктар, працуючы ў клініцы і не займаючыся навукай, меў амаль такі даход, як і прафесар. І моладзь не ішла ў навуку. Дай Бог, каб я не стаў адзіным у Беларусі прафесарам анколагам-патамарфолагам. Зараз, праўда, гэты перакос пакрысе выпраўляецца, заробкі ў медыцыне і медыцынскай навуцы сталі крыху большымі, але гэта яўна недастаткова, каб палепшыць сітуацыю. Нагрузкі растуць шалёна, толькі ў нашай паліклініцы ўрачы прымаюць па 60—70 пацыентаў у дзень.

— Колькі зараз зарабляе прафесар Мураўёў?

— Мала. Урач маёй кваліфікацыі, вучоны майго статусу ў Вялікабрытаніі, дзе таксама дзяржаўная медыцына, атрымлівае 200 тысяч фунтаў у год.

«47 гадоў я працую ў інстытуце без перапынку»

— Рак вучоныя здолеюць пераадолець?

— Мяркуючы па тых публікацыях, якія прыходзяць з-за мяжы, праз 15—20 гадоў амерыканскія, а таксама японскія, заходнееўрапейскія вучоныя будуць паспяхова лячыць рак. Гэтыя краіны маюць сёння вялікія дасягненні ў распрацоўцы метадаў лячэння раку. Менавіта гэтыя метады змогуць паўплываць на сапраўднае спыненне росту пухлін у хворых на рак і дапамогуць ім пасля лячэння заставацца здаровымі шмат гадоў, а не 5 і нават не 10, як зараз.

— Генадзь Мікалаевіч, якую ролю адыгрывае праца патамарфолага ў дыягностыцы і лячэнні раку?

— Пакуль патамарфолаг не паставіць дыягназ, не вызначыць ступень дыферэнцыяцыі пухліны, ніхто нічога рабіць не можа. На любым працоўным кансіліуме апошняе слова заўсёды за патамарфолагамі, ужо потым хірургі, радыёлагі, хіміятэрапеўты і іншыя распрацоўваюць тактыку і стратэгію лячэння. Згодна з законам, павінна быць марфалагічная верыфікацыя пухліны.

47 гадоў я працую ў інстытуце без перапынку, і ў гэтым сэнсе з'яўляюся адзіным прафесарам, які столькі год працаваў у анкалогіі на адным месцы. Я прыйшоў у Навукова-даследчы інстытут анкалогіі і радыялогіі адразу пасля заканчэння Медыцынскага інстытута 28 чэрвеня 1961 года, калі НДІ толькі ствараўся. Разам з Мікалаем Мікалаевічам Аляксандравым — першым дырэктарам НДІ, цягаў цэглу на будаўніцтве першых карпусоў. А ідэя стварэння інстытута пачыналася з выступу ў ААН у 1959 годзе былога міністра замежных спраў Беларусі Кузьмы Венядзіктавіча Кісялёва і яго прапановы па арганізацыі супрацьракавай барацьбы. Тады было прынята рашэнне стварыць у Мінску НДІ анкалогіі і радыялогіі.

— Прапановы працаваць з іншых медыцынскіх устаноў не паступалі?

— Чаму ж не, і за мяжу запрашалі. Але я лічу, што больш карысны на сваёй Радзіме.

— Праца вам падабаецца?

— Цяжкае пытанне. З узростам пачаў разумець, што, на жаль, усе мы працоўныя рабы і залежым ад тых, хто дае нам працу. Праца, напэўна, можа падабацца тады, калі ідзе ад свабоды. Напрыклад, мастак піша карціну, калі ёсць натхненне — можа ўсхапіцца ў 4 гадзіны раніцы і сесці за мальберт, можа тварыць ноччу. А наёмныя працаўнікі вымушаны хадзіць на работу штодня, каб зарабіць на кавалак хлеба.

Ад самага пачатку я разумеў, што працаваць трэба чэсна, рабіць сваю працу сумленна і ні ў якім разе не разлічваць, што табе за гэта скажуць дзякуй.

Шчыра скажу, працаваць у анкалогіі маральна вельмі цяжка. Дзякуй Богу, што не было ў маім жыцці выпадкаў, калі б тыя, каму я дапамагаў, пры выпадковай сустрэчы пераходзілі на другі бок вуліцы. У цудоўнейшага рускага паэта Аляксандра Твардоўскага ёсць вельмі добрыя радкі: "Я знаю, никакой моей вины в том, что другие не пришли с войны, в том, что они — ни кто старше, ни кто моложе остались там. И не о том ведь речь, что я их мог, но не сумел сберечь. Речь не о том. Но все же, все же, все же..."

Вось гэтае "все же, все же" мяне таксама ўсё жыццё не адпускае. Часам ноччу прачнешся і думаеш, а ці ўсё зрабіў, што мог; дай Бог толькі б не памыліцца.



АСАБІСТАЯ СПРАВА

Генадзь Мікалаевіч Мураўёў — доктар медыцынскіх навук, прафесар. З 1961 года працуе ў НДІ анкалогіі і радыялогіі імя М.М.Аляксандрава. Працаваў навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзялення і кіраўніком аддзела марфалагічных метадаў даследавання. Выдатнік аховы здароўя Беларусі. Шмат гадоў быў членам Праблемнай камісіі "Анкамарфалогія" пры Прэзідыуме АМН СССР. Прымаў удзел ад Беларусі ў пасяджэннях анколагаў па лініі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Працяглы перыяд з'яўляўся членам Міжнароднага кансультацыйнага цэнтра па марфалагічнай дыягностыцы пухлінаў апорна-рухальнага апарата.

Аўтар больш як 100 навуковых артыкулаў. Пад яго кіраўніцтвам выканана 8 кандыдацкіх дысертацый.

Жанаты. Мае дарослых сына і дачку.

Другі курс медінстытута, з сябрам Анатолем Буглаевым (на здымку справа).

Падчас пасяджэння Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Ліпень 1975 г.

«На беларускай мове пішу ўсе заключэнні»

— Мураўёў — рускае прозвішча. Адкуль такое валоданне беларускай мовай?

— Я карэнны менчук. Мой дзед Васіль Фёдаравіч Мураўёў сапраўды рускі. А бабуля, ягоная жонка, — беларуска. Дзядуля з боку маці — Герасім Нестаравіч з вёскі Азярычына з-пад Рудзенска — беларус болей няма куды, усё жыццё ён размаўляў толькі па-беларуску. Ягоная жонка — Уладзіслава Міхайлаўна — напалову полька, напалову літоўка. Атрымліваецца, што я і беларус, і рускі, і паляк, і літовец. Але сам сябе заўсёды адчуваў беларусам і лічу беларускую мову роднай.

— Размаўляеце на ёй з дзяцінства?

— У школе, не ведаю на якой падставе, настаўніца беларускай мовы заўсёды ставіла мне пяцёркі. Напэўна, нейкім чынам разглядзела ўва мне беларускасць. У студэнцкія гады гаварыў па-беларуску першыя тры тыдні, бо зразумеў, што гэта можа каштаваць мне студэнцкага білета. У тыя часы стаўленне да беларускай мовы было вельмі кепскае. Але ў душы любоў да беларускай мовы, беларускасць захаваліся. Можа, нясціпла так казаць, але пачуццё патрыятызму для мяне — не пусты гук.

Былі ў маім жыцці моманты, калі і ў нашым інстытуце мне ў вочы казалі: "Размаўляйце на рускай мове". Але я ўжо дастаткова здзейсніў у сваім жыцці, каб жыць так, як лічу патрэбным. На беларускай мове пішу ўсе заключэнні, усе афіцыйныя паперы, рэцэнзіі і г.д. І ведаеце, усе ўсё разумеюць... Дысертацыі — і кандыдацкую, і доктарскую, праўда, прыйшлося пісаць па-руску, бо абараняўся ў Маскве.

— Хатняя мова ў вас таксама беларуская?

— З дачкой звычайна размаўляем па-беларуску. А з жонкай і сынам — парознаму. Увогуле, мы дома карыстаемся трыма мовамі — беларускай, рускай, англійскай. Жонка — прафесар, доўгі час працавала загадчыцай кафедры англійскай мовы БДУ. Валоданне такой інтэрнацыянальнай мовай — вельмі зручная рэч, дапамагае ведаць усе навіны сусветнай анкалогіі. Доўгі час я ўзначальваю беларускае аддзяленне Міжнароднай акадэміі паталогіі, атрымліваю карысныя часопісы па анкалогіі, якія, дарэчы, рассылаю па ўсіх анкалагічных дыспансерах краіны.

— На ваш погляд, чаму беларусы не карыстаюцца сваёй мовай у паўсядзённым жыцці?

— Адзін з самых горкіх і балючых маіх успамінаў: вячэра пасля пасяджэння ў Навукова-анкалагічным цэнтры ў Маскве, выпадкова гаворка заходзіць пра Беларусь, і прафесар з Масквы, карэнная масквічка, выдатны вучоны, інтэлігентная жанчына, ціха, але цвёрда кажа: "Ненавижу белорусов, холуйская, рабская нация. Даже язык свой и тот предали". Балюча было гэта пачуць з яе вуснаў. Але ж яна мела рацыю. Баюся, што сваю мову мы згубілі канчаткова... Вельмі хацелася б памыліцца. Васіль Уладзіміравіч Быкаў таксама быў вельмі песімістычна настроены наконт будучага беларускай мовы. Мы шмат размаўлялі з ім апошнія два тыдні ягонага жыцця, у тым ліку і на гэтую тэму.

— У кнізе ўспамінаў сяброў "Наш Быкаў", якую склаў Генадзь Бураўкін, ёсць і ваш аповед пра Васіля Уладзіміравіча...

— Не думаю, што маю права называць яго сваім сябрам. Сёння так многа людзей прымазваюцца да Быкава. Я скажу так: мы былі знаёмыя доўгі час. І я ўдзячны Генадзю Мікалаевічу Бураўкіну за запрашэнне ўдзельнічаць у гэтай кнізе.

— А пра гады сяброўства з Уладзімірам Някляевым узгадаеце?

— Не хочацца, каб мяне абвінавацілі ў тым, што я прымазваюся да чужой славы. Уладзімір Някляеў — вялікі паэт. На ягоным юбілеі Леанід Дранько-Майсюк сказаў, што XX стагоддзе пачыналася з паэмы "Курган" Янкі Купалы і "Новай зямлі" Якуба Коласа, а скончылася "Прошчай" Някляева, а XXI стагоддзе пачалося з ягоных "Паланеза" і "Ложа для пчалы". Я думаю, што гэта слушна.

— Якія кнігі, на ваш погляд, мусіць пачытаць кожны беларус?

— Немагчыма назваць толькі адзін твор. Я б параіў кожнаму грамадзяніну Беларусі прачытаць п'есу Янкі Купалы "Тутэйшыя", паэму Якуба Коласа "Новая зямля", "Людзі на балоце" Івана Мележа, "Знак бяды" Васіля Быкава і паэмы Уладзіміра Някляева "Прошча" і "Паланез".

— У дзень народзінаў што сабе пажадалі?

— Здароўя сабе і сваім родным.

Марыя ЭЙСМАНТ.

Успаміны дзяцінства

***

Першыя ўспаміны дзяцінства — Чырвоны касцёл. Мы жылі ў Менску на рагу Ленінградскай і Базарнай вуліц, на тым месцы, дзе зараз будынак юрфака БДУ.

Памятаю 25 снежня 1941 года. Ражство Хрыстова, акупіраваны Менск. Бабуля вядзе мяне ў Чырвоны касцёл хрысціць і просіць Бога, каб ён выратаваў мне жыццё.

Чырвоны касцёл — мой талісман.

Быў перыяд, калі я жыў не побач з касцёлам. Было кепска мне, было кепска касцёлу. Я не бачыў штодня касцёльных крыжоў, касцёл перарабілі ў кінастудыю, потым ператварылі ў склад.

Сёння я жыву на вуліцы Свярдлова, і, калі выходжу на балкон, бачу касцёл. Добра мне, і касцёлу вярнулі жыццё.

***

Бабуля Уладзіслава Міхайлаўна нарадзілася ў горадзе Ліепа, на балтыйскім узбярэжжы. А там вельмі шмат людзей някепска размаўлялі па-нямецку. І ў часы вайны гэта выратавала нам усім жыццё. Мы жылі на мяжы менскага гета, і дзядуля хаваў дома двух габрэяў. Неяк падчас аблавы да нас прыйшлі два паліцаі і два немцы, вельмі злосныя, па ўсім адчувалася, рашуча настроеныя на шчыльны вобыск. Бабуля пачала размаўляць з імі па-нямецку, і яны супакоіліся. А мы ўсе засталіся жыць.

Дарэчы, адзін з тых габрэяў пасля вайны стаў добрым цырульнікам і бясплатна стрыг мяне да самай сваёй смерці.

***

У памяці назаўсёды засталіся 21 чэрвеня 1941 года і 3 ліпеня 1944-га. Калі пачалася вайна і на Менск паляцелі першыя нямецкія бомбы, з дзядулем мы былі на адкрыцці Камсамольскага возера, на якім, дарэчы, потым правёў шмат часу ў сваім жыцці.

Памятаю 3 чэрвеня 1944 года, вызваленне Менска, спякотны летні дзень.

Надоўга ўрэзаўся ў памяць пах амерыканскай тушонкі. Пасля вайны ў Менску быў страшэнны голад, у чэргах за прадуктамі людзі гублялі прытомнасць. А сем'ям, як наша, дзе былі малыя дзеці, выдавалі амерыканскія харчы, у тым ліку і тушонку. Якой смачнай яна была, як пахла...

Шчыры беларус Алесь Камоцкі заспяваў расійскія хіты

Новы альбом Камоцкага мае назву "З бацькоўскай кружэлкі". У яго ўвайшлі дзевяць песень, перакладзеных з расійскай мовы. Сярод іх "Черный ворон", "Шумел камыш" і іншыя.

— Ідэя заспяваць вядомыя расійскія песні на беларускай мове ў мяне ўзнікла даўно, — сказаў карэспандэнту "Народнай волі" Камоцкі. *— Аднак я доўга да гэтай мары падступаўся. Не так проста аказалася напісаць якасныя пераклады расійскіх песень на беларускую мову. Потым быў запіс гэтых песень. Шчыра кажучы, мне не вельмі спадабалася, як я іх выканаў. Таму прыйшлося цягам месяца браць урокі вакалу. Са мной працавала педагог Іна Перасецкая".*

Камоцкі наўмысна не называе, якім тыражом выйшаў і ў якую суму яму абышоўся запіс новага дыска: "Гэта ўсё другаснае", — упэўнены ён.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ИНИЦИАТИВА

Состоится ли съезд ученых России и Беларуси?

Подобные предложения от ученых двух стран поступают в Постоянный комитет Союзного государства уже второй год подряд. Однако финансировать форум союзная структура не торопится, опасаясь превращения ученого форума в парадное мероприятие.

— Нет ни одного госзаказчика ни со стороны России, ни со стороны Беларуси, который был бы готов взять на себя функции организатора, — заявила на встрече с журналистами заместитель начальника Департамента социальной политики и информационного обеспечения Постоянного комитета Союзного государства Ольга Виноградова. *— Кроме того, Парламентскому собранию необходимо внимательно изучить опыт Беларуси в проведении съезда. Когда мы рассматривали предложения некоторых российских организаций о проведении подобного большого форума в рамках Союзного государства, то нам пришлось ответить отказом. Мы не поддержали подобную инициативу из чисто практических соображений. Сложно представить, какая будет практическая польза от съезда, на который соберутся ученые самых разных направлений, смогут ли они обсудить конкретные проблемы. Будет это мероприятие эффективным или станет парадным?*

К слову, первый съезд ученых Беларуси, который прошел в нашей стране осенью прошлого года, по официальным данным обошелся республиканскому бюджету почти в 500 тысяч долларов. Академик Александр Войтович после проведения съезда высказал мнение, что тратить такие суммы смысла не было. Съезд стал очередным пропагандистским мероприятием, которое никак не сказалось на развитии науки и инновационной деятельности в стране.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

НУ И НУ!

За жизнь пенсионерки именные часы

Ученик 11-го класса барановичского лицея №1 Женя Воронко спас жизнь одинокой пенсионерке. Пожар вспыхнул в доме 77-летней пенсионерки, перенесшей инсульт. Дым из окна увидела сестра Жени, и юноша, не раздумывая ни на миг, помчался туда. В доме была открыта входная дверь, школьник вошел в задымленную комнату и разыскал в ней пожилую женщину. Вывести больную женщину ему помогла сестра.

Женя, к слову, не стал дожидаться пожарной команды, а стал самостоятельно тушить пожар. На помощь парню подоспел взрослый сосед. Вдвоем они быстро ликвидировали огонь.

Позже юному герою вручили грамоту Барановичского горрайотдела МЧС и именные часы с гравировкой. Женя признался, что давно мечтает о профессии спасателя и после окончания лицея намерен поступать в Гомельский командно-инженерный институт МЧС.

Народная Воля http://www.nv-online.info
18 КРАСАВІКА 2008 г.

Міхаіл ПАСТУХОЎ: «Мне напрарочылі стаць кіраўніком Канстытуцыйнага суда Беларусі»

Днямі сябра "Народнай волі", экс-суддзя Канстытуцыйнага суда Міхаіл Пастухоў адзначыў 50-гадовы юбілей.

Міхаіл Іванавіч з жонкай Валянцінай Іванаўнай.

У адным са сталічных кафэ Міхаіла Іванавіча віншавалі сябры Беларускай асацыяцыі журналістаў, членам якой ён з'яўляецца ўжо больш за дзесяць гадоў. Да таго ж Міхаіл Іванавіч узначальвае Цэнтр прававой абароны сродкаў масавай інфармацыі пры гэтай арганізацыі.

"50 гадоў — гэта даволі знамянальная падзея ў жыцці кожнага чалавека, — *гаворыць Міхаіл Іванавіч.* — У гэтым узросце можна падвесці вынікі пройдзенага шляху, азірнуцца і ўбачыць, хто побач з табой, а хто застаўся збоку.

Я часта ўспамінаю тыя гады, калі працаваў у Інстытуце філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі. Перыяд той быў нядоўгім, але якія людзі былі побач — **Віктар Ганчар, Мікалай Пухонта, Сяргей Леўшуноў, Уладзімір Ізотка** (яго, дарэчы, нядаўна абралі суддзёй Канстытуцыйнага суда). Потым была выкладчыцкая праца на Вышэйшых курсах КДБ (цяпер гэта — Інстытут нацыянальнай бяспекі КДБ Беларусі) — дзевяць з паловай гадоў. Пачынаў з лейтэнанта і скончыў гэтую працу ў званні падпалкоўніка. Адтуль накіраваўся ў Канстытуцыйны суд. Для гэтага былі падставы — шмат займаўся законапраектнай працай, удзельнічаў у падрыхтоўцы Канстытуцыі 1994 года, канцэпцыі судова-прававой рэформы, закона аб Канстытуцыйным судзе Беларусі, праекта УПК і іншых. За гэта ў 35 гадоў атрымаў званне "Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь".

Праца ў Канстытуцыйным судзе была самай памятнай і надзвычай шырокай па сваім аб'ёме. Яна закранала, бадай, усе галіны дзяржаўнага жыцця, і тут трэба было праявіць у поўнай ступені сваю грамадзянскую прынцыповасць. Рашэнне суда самым непасрэдным чынам уплывала на жыццё краіны, таму трэба было заўсёды мець сваю цвёрдую пазіцыю. Кульмінацыяй гэтай працы стаў лістапад 1996 года, калі Канстытуцыйны суд мог неяк паўплываць на далейшы лёс Беларусі. На вялікі жаль, гэтага не здарылася. Канстытуцыйны суд першага складу сышоў у гісторыю. Мяркую, што гэтая гісторыя яшчэ павінна быць вывучана і даведзена да шырокай грамадскасці.

Потым выкладаў у прыватных вышэйшых навучальных установах. Аднак галоўнай для мяне стала праца ў ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў", дзе я адказваю за абарону незалежных сродкаў масавай інфармацыі. Самай памятнай для мяне была грамадская абарона журналіста Паўла Шарамета ў Ашмянскім судзе. Практычна кожны дзень мне прыходзілася ездзіць за 90 кіламетраў на суд, які з перапынкамі цягнуўся амаль два месяцы. На жаль, мы не здолелі дамагчыся апраўдальнага прысуду для Паўла Шарамета і Дзмітрыя Завадскага. Аднак гэта справа стала вядомай не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце.

Вядома ж, пасля 50-гадовага юбілею жыццё не заканчваецца. Не хаваю: у мяне ёсць планы на будучыя 50 гадоў. Хочацца дажыць да таго дня, калі я займу пачэсную пасаду ў дэмакратычнай незалежнай Беларусі. Дарэчы, калі я завітаў да вас, у рэдакцыю "Народнай волі", то некаторыя супрацоўнікі, віншуючы мяне з паўвекавым юбілеем, напрарочылі мне стаць у будучым кіраўніком Канстытуцыйнага суда Беларусі. Я — не супраць. І калі так атрымаецца, то абяцаю выконваць абавязкі з усёй адказнасцю і прынцыповасцю. Беларусь павінна як мага хутчэй стаць прававой дзяржавай, дзе будзе забяспечвацца вяршэнства закона і паважацца правы чалавека...

Марына КОКТЫШ.

SOS!

Ліцэнзіі на браканьерства

На Пастаўшчыне налічваецца 115 азёраў, 160 вадасховішчаў, 86 рэчак і ручаёў. Гадоў пяцьдзесят таму рыба вадзілася ледзь не ў кожнай сажалцы. Але ў 60—70-х гадах мінулага стагоддзя пачалася суцэльная хімізацыя, палеткі сталі апрацоўваць штучнымі ўгнаеннямі і гербіцыдамі, якія разам з дажджавой вадой траплялі ў рэкі і азёры, знішчаючы там усё жывое.

Хімічная атака на прыроду аслабела толькі напрыканцы 80-х гадоў. Не заўважыць гэта было немагчыма, бо ў рэчкі зноў пачала заходзіць на нераст рыба. Пабольшала яе і ў азёрах. Аднак, на жаль, адначасова павысілі сваю актыўнасць браканьеры, якія ўзброіліся суперсучаснымі прыладамі для здабычы рыбы—электравудамі, электрасеткамі ды іншай зброяй масавага знішчэння насельнікаў вады. Гэтыя прылады ўжо не першы год завозяцца з-за мяжы, і за 15—20 долараў на базары можна купіць што хочаш — ад электравуды да сацень метраў лескавай сеткі, якая лёгка хаваецца ў звычайны поліэтыленавы хатулёк.

Праваахоўныя органы не ў стане перашкодзіць гэтаму гандлю. Таму колькасць рыбы, асабліва ў малых рэках і азёрах, катастрафічна скарацілася.

Праўда, дзяржаўныя службы аховы прыроды пачалі ўводзіць розныя штрафныя санкцыі, якія пастаянна растуць. Але ўсяго гэтага мала. Трэба займацца развядзеннем рыбы, папаўняць яе запасы ў натуральных і штучных вадаёмах, паляпшаць яе спажывецкія вартасці.

Відаць, менавіта з гэтымі мэтамі са складу рэспубліканскага фонду рыбалоўных угоддзяў вывелі частку азёр і пачалі здаваць іх у арэнду прадпрыемствам і прыватным асобам.

Тут адразу ж узнікаюць пытанні. Правілы арэнды прадугледжваюць, што арандатар абавязаны зарыбляць вадаём і весці ўлік рыбы. А як гэта рабіць, калі арандуецца, скажам, толькі адрэзак ракі даўжынёй у 10—15 кіламетраў? Зразумела, што важнейшая ўмова арэнды не выконваецца, арандатар, атрымаўшы доступ да ракі, выбірае з яе столькі рыбы, колькі захоча, не займаючыся яе аднаўленнем. Затое ён, пераўтварыўшыся ў часовага ўласніка вадаёма, спаганяе немалыя грошы з рыбаловаў-аматараў за магчымасць пастаяць ля вады з вудой або палавіць рыбу з чоўна.

Тэма арэнды рыбалоўных угоддзяў з яе хібамі ўсё часцей абмяркоўваецца ў грамадстве. З аднаго боку, быццам бы і добра, калі вадаём атрымае гаспадара, які будзе рупіцца аб ахове і памнажэнні "сваёй" рыбы, частку яе прадаючы дзяржаве, а частку за памяркоўную плату дазваляючы лавіць аматарам, каб выручанымі грашыма пакрыць свае выдаткі. А з другога боку, усё атрымліваецца не так, як мусіць быць. Я прыйшоў да такой высновы пасля таго, як вырашыў дэталёва разабрацца ў асаблівасцях нацыянальнай арэнды вадаёмаў на прыкладзе двух бліжэйшых да Паставаў і найбольш улюбёных рыбаловамі азёраў—Мажэйкі і Ольсы. Абодва здаюцца ў арэнду і неўзабаве зробяцца платнымі для рыбаловаў-аматараў.

Сярэдні кошт пуцёўкі на дзень рыбалкі ў нашым раёне — 7—12 тысяч рублёў. Людзей вельмі палохае такая перспектыва, бо для большасці аматараў рыбалка—не толькі адпачынак, а і здабытак ежы. Узгадаю, што на асобных пастаўскіх прадпрыемствах заробкі не перавышаюць 300 тысяч.

Наколькі я ведаю і помню гісторыю нашай краіны, беларусы ніколі не жылі надта заможна. Не назавеш іх заможнымі і сёння, асабліва вяскоўцаў ды пенсіянераў. Магчыма, з-за гэтага аматарскае рыбалоўства было і застаецца папулярным адпачынкам суайчыннікаў.

Каб лепш зразумець, што такое арэнда вадаёмаў, я вывучыў "Правілы вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства" з дадаткамі, што ўведзены Указам прэзідэнта РБ №580 у 2005 годзе. Гэтыя правілы з'яўляюцца падмуркам для арганізацыі арэнды рыбалоўных угоддзяў. Але правілы — адно, а рэальная практыка — іншае. Я, напрыклад, дужа здзівіўся, даведаўшыся, што афармленнем азёраў у арэнду займаецца землеўпарадкавальная і геадэзічная служба райвыканкама. А яшчэ я даведаўся, што цяпер у нашым раёне на арэндзе і на стадыі яе афармлення знаходзяцца каля 15 азёраў. Паколькі ні ў райвыканкама, ні на прадпрыемствах-арандатарах няма спецыяліста па рыбаводстве, усе гэтыя справы даручылі землямерам і геадэзістам. На прадпрыемствах, што арандуюць вадаёмы, рыбаводствам займаюцца ўсе, хто захоча, а ў выніку — ніхто.

Якім жа чынам выконваецца дамова на арэнду паміж райвыканкамам і арандатарам, дзе прапісаны абавязкі апошняга па ахове і памнажэнні рыбы? Хто здольны праверыць, напрыклад, як выконваюцца пазначаныя ў дамове мерапрыемствы па ахове нерасцілішчаў, калі ў раёне няма ніводнага кваліфікаванага рыбавода?

Безумоўна, жыццё прымусіць займець такіх спецыялістаў у кожным раёне Беларусі. Бо для нашай краіны адсутнасць рыбаводаў у раёнах — тое ж, што адсутнасць аграномаў і ветэрынараў.

Не магу не распавесці яшчэ аб адной цікавай акалічнасці. Не раз ужо ў Паставах ладзіліся аўкцыёны на права вядзення рыбалоўнай гаспадаркі. Але, мяркуючы па адсутнасці ў мясцовым друку абвестак пра гэтыя мерапрыемствы і пра іхнія вынікі, жадаючых браць удзел у аўкцыёнах няшмат. А справа тут, лічу, у тым, што кожны, хто пазнаёміўся са згаданымі раней правіламі, разумее, як цяжка іх выканаць, не маючы адпаведнай адукацыі і досведу.

У тых правілах вызначана, што юрыдычная асоба для падрыхтоўкі абгрунтавання сваёй працы мае права запрошваць у НАН Беларусі ды іншых міністэрствах і ведамствах інфармацыю аб рыбных угоддзях, якія гэтае прадпрыемства або прыватнік маюць намер арандаваць. Інфармацыя такога кшталту неабходная, бо арандатар у абгрунтаванні абавязаны пазначыць тып, катэгорыю арандаванага вадаёма, ягоную плошчу і віды рыбы, што там жыве...

У Мінску, праўда, ёсць спецыялісты, якія за немалыя грошы падрыхтуюць адпаведны дакумент нават з пячаткамі ўсіх патрэбных міністэрстваў і ведамстваў.

Зразумела, што патрэба ў гэтай нятаннай бюракратычнай цяганіне адбівае ахвоту арандаваць вадаём. Дый каму патрэбны гэты дакумент? Мне давялося пазнаёміцца з абгрунтаваннямі гаспадарання па двух добра вядомых мне азёрах — Ольсы і Мажэйкі. Дужа здзівіла, што яны аднесены да лешчава-шчупаково-плоткавых. Але ж гэта лухта! Гэтыя азёры перыядычна перажываюць заморы рыбы. На возеры Ольса апошні замор быў у 2004 годзе, на Мажэйках — у 2001 годзе. Азёры глеістыя, неглыбокія, там найлепш выжываюць карась і лінь. А плотка і лешч тут якраз рэдкія госці.

Узнікае слушнае пытанне: калі сталічныя спецыялісты за грошы зрабілі памылковы дакумент, ці зробяць гэта лепш недасведчаныя ў рыбагадоўлі арандатары?

Няправільна, лічу, патрабаваць ад арандатара, каб ён ужо ў першы год арэнды аддаваў дзяржаве дзве і болей тоны рыбы. Адкуль возьмецца тая рыба, калі арандатар не паспеў аглядзецца, не зарыбіў вадаём? Каб выканаць патрабаванне па здачы рыбы і мець колькі яе на ўласным стале, арандатар мусіць паспешліва, за лічаныя дні, выбраць з вады ўсю рыбу і збыць, пакуль яна не сапсавалася. Так ён з няўмелага рыбавода пераўтворыцца ў браканьера з дзяржаўнай ліцэнзіяй. Такіх "браканьераў у законе" робіцца ўсё больш, а рыбы — усё менш.

Яе не застанецца зусім, калі не спыніць бязглуздую кампанію па здачы вадаёмаў у арэнду, не перагледзець яе прынцыпы ў адпаведнасці з законамі прыроды і патрэбамі грамадства...

Уладзімір БАРОЎКА, жыхар г.Паставы.

ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ...

Што ні помнік, то — анекдот

"Леніны" працягваюць "упрыгожваць" плошчы беларускіх гарадоў, у тым ліку і плошчу Незалежнасці ў Мінску. Цікава, што ідэю пад назвай "манументальная прапаганда" прапанаваў сам Ленін у 1918 годзе, гэта была адна з чарговых задач Савецкай улады.

Сваёй ідэяй Ленін падзяліўся з Луначарскім. "Манументальнае мастацтва — мастацтва дарагое", — засумняваўся Луначарскі. А Ленін супакоіў: "Калі ласка, не думайце, што я пры гэтым уяўляю сабе мармур, граніт і залатыя літары. Пакуль мы ўсё мусім рабіць сціпла. Хай гэта будуць якія-небудзь бетонныя пліты, а надпісы на іх па магчымасці больш выразныя. Па вечнасць ці хаця б доўгатэрміновасць я пакуль не думаю".

Але пасля з'явіліся мармуровыя помнікі Леніну з залатымі літарамі, можа, і не вечныя, але дакладна — доўгатэрміновыя.

Амаль пра кожнага з іх ёсць анекдоты. Самы распаўсюджаны — пра помнік Леніну з дзвюма кепкамі — адна на галаве, другая ў руцэ. Быццам бы такога Леніна вырабіла брыгада цыганоў-шабашнікаў, якая вельмі хутка вырабляла гэтыя помнікі па начах, вандруючы з горада ў горад. Ці пра "павешаны" помнік Леніну ў Оршы... Рабочыя доўга думалі, як падчапіць скульптуру так, каб не пашкодзіць. Чапляць пад руку — можна руку адламаць. І знайшлі простае рашэнне — зачапілі пятлёй проста за шыю ды сталі падымаць. У гэты час ішоў супрацоўнік гаркама партыі. Чалавек, напэўна, ідэйны... "Вы што? Леніна вешаеце!!!" З паўгадзіны Ленін з пятлёй на шыі боўтаўся на кране, пакуль партыйны работнік тлумачыў рабочым: вы не тое робіце. У гэты час з гаркама партыі ішоў яшчэ адзін партработнік, убачыў, што Ленін вісіць у пятлі, падышоў і сказаў свайму калегу: "Ды што ты робіш? Праз цябе ЁН ужо колькі ў пятлі вісіць!"

А падчас масавых святаў ды народных гулянняў пастамент аршанскага Леніна цяпер выкарыстоўваюць як барную стойку — выстаўляюць там "батарэі" бутэлек. Гэта "спадчына" савецкай імперыі. Ці мы развітаемся з ёй, альбо яна застанецца нашым нашчадкам?

На мітынгу 7 лістапада 1990 года на плошчы Незалежнасці (а тады яшчэ Леніна) у Мінску народ, які сабраўся на плошчы, вярнуў "правадыру" яго "дары" — фуфайку, якая была ў 30-я гады амаль што "нацыянальным адзеннем" савецкага чалавека, ды калючы дрот. Гранітны ідал спакойна прыняў "дары" і застаўся на сваім пастаменце ў цэнтры беларускай сталіцы.

Пасля 1917 года бальшавікі пераназвалі ўсё, што нагадвала пра ранейшы, дарэвалюцыйны лад жыцця, — вуліцы, гарады. Толькі рэкі захавалі свае назвы. Гэта рабілася з мэтай пазбавіць аўтарытэту "старую" ўладу, а таксама сцвердзіць у свядомасці людзей новыя каштоўнасці і арыенціры. У незалежнай Беларусі савецкая манументальная прапаганда працягвае сцвярджаць, што ўсё спакойна — арыенціры, каштоўнасці застаюцца ранейшымі, і шлях у будучыню нам дагэтуль паказвае Ільіч — з нязменнай мятай кепкай у руцэ.

Паліна КАЧАТКОВА.

ОФИЦИОЗ

Оппозицию пригласят на БТ?

Не секрет, что Белорусское телевидение пока не отличается широким разнообразием мнений. И представители оппозиции на БТ практически не появляются. А если и появляются, то, как правило, без права на ответное слово.

"Народная воля" поинтересовалась у председателя Белтелерадиокомпании **Александра Зимовского**, получат ли представители демократической общественности приглашение на участие в онлайн-конференциях, которые регулярно проводит официальный интернет-портал телерадиокомпании www.tvr.by.

"Не скажу, что у нас в жестком плане на каждую неделю стоит, кто из представителей власти или оппозиции будет принимать участие в онлайн-конференции, — ответил Александр Леонидович. — *Такого нет. Что касается вопроса их участия, то я этого не исключаю и никогда не исключал. Не вижу ничего дурного в том, что кто-то из них придет и будет в онлайне отвечать на вопросы скорее всего даже своих сторонников. Я уверен, что основную аудиторию составят именно их сторонники..."*

Чужой кошелек

На пресс-мероприятии, посвященном презентации экономического отчета о деятельности Белтелерадиокомпании в 2007 году, расширению вещания телеканала "Беларусь-ТВ" и обновлению официального Интернет-портала телерадиокомпании А.Зимовский сказал: *"Главным результатом минувшего года для нас стало увеличение поступлений от рекламно-коммерческой и иной деятельности и завоевание внушительной доли зрительской аудитории".*

Отразилась ли столь успешная коммерческая деятельность на зарплатах сотрудников Белтелерадиокомпании?

"На зарплатах не сказалось, потому что сотрудники телерадиокомпании имеют фиксированные оклады, — пояснил Александр Зимовский "Народной воле". — *У нас есть определенное штатное расписание, в едином классификаторе есть все наши профессии, и там написано, сколько должен по окладу получать ведущий, режиссер первой категории, высшей категории, системотехник и так далее. Поэтому на зарплатах это не отразилось никак. На зарплатах у нас всегда отражается изменение базовой величины. Что касается премиальных, то отразилось. И весьма внушительно для тех, кто зарабатывает нам деньги".*

ЗА КАДРОМ

Кого снимают кинодокументалисты?

Людей, составляющих протестную часть белорусского общества, в поле зрения кинематографистов студии "Летопись" нет.

Таковых можно увидеть только в неподцензурном кино, создаваемом вне государственного кино.

Нет среди героев и официальных политических деятелей и государственных мужей — не положено еще с советских времен (разве что в хронике — в качестве персон, сопровождающих президента, или сообщающих цифры и факты в вверенной им отрасли).

Уже по этим двум "вычитаниям" можно понять, что экранный портрет белоруса создается в обстановке тщательной избирательности и осмотрительности. Потому и неполный этот групповой портрет. В журналистике и литературе он куда объемнее и многообразнее.

В портретную галерею студии "Летопись" 2007 года попали: бывший председатель колхоза, ученый, работающий в области космонавтики, священнослужитель, директор цирка, известная театральная актриса, спортивный тренер, парашютист-рекордсмен, парень и девушка "из толпы", а также десять молодых специалистов, выпускников белорусских вузов, удостоившихся благодарности президента на балу во Дворце Республики в 2001 году.

В этом перечне есть те, кто словно сошел с республиканской Доски почета и ничего, кроме профессионального занятия и места работы о нем не узнать (фильм о выпускниках "Мечты сбываются" режиссера Владимира Цеслюка). Но есть и те, чей жизненный путь полон драматизма, поскольку в советские времена к духовному сану пришлось идти через сопротивление (картина "Айцец Сергій" Станислава Гайдука — о священнике Свято-Духова собора в Минске Сергии Гардуне). Кинолента Анатолия Алая "Владимир Бедуля" сочетает черты традиционного кинопортрета положительного героя и проблемного фильма. Большое место здесь занимают откровенные высказывания односельчан о скоропалительно-приказной и несправедливой, по их мнению, отставке старейшего колхозного вожака, дважды Героя Социалистического Труда Владимира Леонтьевича Бедули.

В отдельную группу следует выделить героев тех фильмов, чей образ жизни не укладывается в привычные рамки. Именно они оставляют след в душе, потому что создатели прикасаются к их внутреннему миру, выявляют то, что отличает одну индивидуальность от другой.

В фильме Михаила Ждановского "Во все дни" поначалу неясно, кто этот человек с рюкзаком, взобравшийся на валуны. Геолог? Путешественник? Потом увидим его крупный план, когда он топит печь в доме — длинные волосы уложены под ремешок или ленточку, а лепка лица напоминает черты Паганини. Позже он появится в лесном массиве с крестами, где с самосвала сбрасывают валуны и где, как оказывается, находится что-то вроде музея валунов, на которых герой, художник Анатолий Кузнецов, изображает лики святых. Одновременно он и плотник, заменяющий подгнившие или вырванные вандалами кресты, и ремесленник-дизайнер, смастеривший часы с кукушкой (приспособил их на сосне), и смотритель территории, где... покоятся убиенные. Место не названо, но узнается урочище Куропаты под Минском. И потому-то деяния Анатолия Кузнецова обретают расширительный смысл: человек добровольно, в одиночку, избрал то, что можно назвать гражданско-религиозным служением. Тонко, без назидания и слов (в фильме отсутствует дикторский текст), М.Ждановский приблизил к нам и особенности конкретной личности, и представил обобщенный образ творца-созидателя, чей кропотливый труд противостоит как разрушителям, малюющим на валунах свастику, так и равнодушию людей, проходящих мимо.

В иной точке Беларуси велось наблюдение за героем фильма "Вальс" (режиссер Виктор Аслюк, автор сценария Ольга Дашук, оператор Анатолий Казазаев). Кинематографисты отыскали в Верхнедвинском районе пожилого сельского врача Петра Петровича Кветинского и поездили с ним по деревенским дорогам и улицам к одиноким старикам, которым тот измеряет давление, делает уколы, выдает таблетки. Как и в предыдущей картине, мыслительное пространство фильма шире, чем показанные встречи и разговоры в хатах. Петр Кветинский интересен документалистам прежде всего как целитель человеческих душ. Благодаря его приезду, старушки и старики хоть на несколько часов избавляются от одиночества и дум о смерти, высказывая врачу и свои страхи, и обиды, и секреты. В одной из бабуль, которая, видимо, и ходить-то уже разучилась, Петр Кветинский, что называется, заводит жизненный мотор — водит ее по половицам в ритме вальса. Эпизод поставлен в конце картины как мажорное завершение темы уходящей Беларуси, а весь фильм напоминает о существовании бескорыстия и его необходимости в наше прагматичное время.

Ограниченные рамки статьи не позволяют подробнее представить героев других интересных фильмов, а они есть. В частности, режиссер Ольга Дашук и оператор Анатолий Казазаев в фильме "Адзінаццаць манетак" совершили путешествие вместе с сельчанином Владимиром Золотарем на его малую родину, в результате которого у человека произошло внутреннее обновление.

В документальном кино появилось новое режиссерское имя — Алла Вольская. Работая над картиной "Найти себя", кинематографистка в цепи эпизодов-наблюдений (вместе с оператором Андреем Воскресенским) выслушивает и дает выслушать нам житейские воззрения 78-летнего Владимира Денисовича Филипповича с Брестчины, человека чудаковатого и одновременно убеждающего выработанной им самим системой здорового образа жизни. ("Земля в одну сторону крутится, а я в другую, так можно избежать инсульта" — утверждает он).

Известная документалистка Галина Адамович с оператором Татьяной Логиновой сняли и вовсе неординарный фильм "Мама придет!" — о социализации ребенка. Они вглядываются в жизнь ясельных детей, где одни адаптируются в коллективе без проблем и даже находят выгоду, другие остаются в одиночестве и испытывают первые жизненные драмы.

Таким образом, вереница людей, зафиксированных кинодокументалистами, вряд ли при наложении совпадет с моделью белорусского общества начала первого десятилетия XXI века, но отдельные типы людей в нее войдут.

Алла БОБКОВА, кинокритик.

КСТАТИ

Александр Зимовский рад, что «не перестукивается» с Егором Рыбаковым

Во время неофициальной части презентации Александр Зимовский упомянул экс-руководителя Белтелерадиокомпании **Егора Рыбакова**, которого в 2005 году Верховный суд Беларуси приговорил к 11 годам лишения свободы с конфискацией имущества и лишением права занимать должности, связанные с выполнением организационно-распорядительных обязанностей сроком на 5 лет.

Отбывает наказание бывший телевизионный начальник в исправительной колонии усиленного режима в Шклове.

В 2006 году А.Лукашенко своим указом "помиловал" Рыбакова, уменьшив ему наказание на два года.

"Народная воля" поинтересовалась, не переписывается ли Александр Зимовский с Егором Рыбаковым.

"Хорошо, что не перестукиваемся", — то ли в шутку, то ли всерьез со смехом ответил Александр Леонидович...

Марина КОКТЫШ.

ТЕННИС

До лучших времен!

Сборная Беларуси по теннису проиграла на родном корте в матче за выход в плей-офф команде Швейцарии, и теперь будет играть в 1-й группе Евро-Африканской зоны с поляками.

Уж сколько раз твердили миру, что основные игроки нашей сборной — Максим Мирный и Володя Волчков — не вечны в спорте. Залюбовавшись одно время победами этих теннисистов, наши спортивные чиновники и тренеры как-то незаметно для себя и для болельщиков образовали целую пропасть между двумя поколениями теннисистов. И когда пришло время ставить на замену молодых, вдруг оказалось — некого.

"У нас много хороших ребят, но где-то в 18-летнем возрасте все они дружно пропадают, как в том Бермудском треугольнике, — рассказывал "Народной воле" бывший капитан нашей мужской сборной по теннису **Андрей БЕССОНОВ**. — *Теннис требует сумасшедших денег, чтобы оставаться в нем. Чтобы привести ребенка заниматься теннисом, для этого много денег не надо. Средненькая ракетка — 50—70 долларов, струны — 10 долларов, кроссовки, костюм. Это для начинающего. А вот когда ваше чадо переваливает 14-летний рубеж, раскрывайте кошелек пошире. Нормальная игровая практика для 14—16-летнего теннисиста — два соревнования в месяц. Средний выезд на соревнование с папой или мамой обходится примерно в 500 долларов. Вот и набегает за год что-то около 10 тысяч. Потянут родители такую сумму — их ребенок будет продолжать заниматься теннисом. На нет, как говорится, и суда нет. Неудивительно, что за две пятилетки наши тренеры и не подготовили ни одного игрока, кроме Макса Мирного, Володи Волчкова и Александра Швеца, которые могли бы похвастаться хоть одним рейтинговым очком АТП. А чтобы завоевать одно рейтинговое очко, надо поучаствовать в добром десятке профессиональных турниров. Ведь почему в свое время не раскрылись в полной мере таланты Сергея Васина, Сергея Самосейки, Василия Кожеро, Максима Бельского. Ребята хорошие, но им не хватило средств. Плюс многие не выдерживают психологический стресс. Володе Волчкову сейчас 30 лет. Следующее поколение за ним — на десять лет младше. 10 лет пустоты! Дыра!"*

Слова экс-капитана еще раз подтвердил матч со швейцарцами. Юный Владимир Игнатик, конечно, очень старался, но противостоять опытным швейцарцам не мог. Порадовал Владимир Волчков, который неожиданно вышел играть с опытным Станиславом Вавринкой (30-е место в мировом рейтинге). Разочаровал Макс Мирный, который в последнее время показывает не самую лучшую свою игру. Но, повторюсь, обвинять здесь никого не надо. Перед этими теннисистами можно только снять шляпу за все то, что они сделали.

Что касается самой организации матча, то здесь тоже не обошлось без проколов. Накануне администрация Футбольного манежа не скрывала, что билеты (стоимость от 30 до 80 тысяч рублей) продаются очень слабо. Но выход, как всегда, был найден.

— Знаю, что предприятия заставляли выкупать билеты на теннис, — рассказывал мне представитель славного минского завода "Кристалл". — Кажется, профком и покупал билеты.

Были замечены и молодые люди с множеством национальных флагов. Их обычно тоже привозят на все мероприятия, где должен появиться Александр Лукашенко. Последний, кстати, появился только в последний день матча (в воскресенье), но ничем помочь команде не смог. Швейцарцы уверенно победили — 4:1.

Алесь СИВЫЙ.
Фото photo.bymedia.net

МЕРКАВАННЕ

Уладзімір Парфяновіч: «Чыноўнікі спрабуюць пабудаваць дом, пачынаючы з даху...»

Да Алімпіяды ў Пекіне застаюцца лічаныя месяцы. Спартыўныя чыноўнікі рапартуюць Аляксандру Лукашэнку аб тым, што праблем з падрыхтоўкай спартсменаў няма. Маўляў, падрыхтоўка спартсменаў добра фінансаваная, а ім застаецца толькі адно — рыхтавацца і заваёўваць медалі.

Нагадаем, што на мінулай летняй Алімпіядзе, якая прайшла ў Афінах, на рахунку беларусаў было 15 узнагарод. Зараз міністр спорту і турызму Аляксандр Грыгараў сцвярджае, што з Кітая беларусы прывязуць не менш за 15 узнагарод. Аптымісты ўвогуле называюць лічбу ў 20—22 медалі.

Трохразовы алімпійскі чэмпіён Уладзімір Парфяновіч заявіў карэспандэнту "Народнай волі", што не падзяляе аптымізму тых, хто гаворыць, што беларусы прывязуць з Пекіна хаця б тыя ж 15 узнагарод:

"Я прагназую, што ў Кітаі нашы спартсмены возьмуць 12—13 узнагарод. Гэта рэальнае становішча рэчаў на сённяшні дзень. Вы паглядзіце, з кожнай Алімпіядай медальнае становішча беларусаў толькі пагаршаецца. Да таго ж апошнім часам у нас вялікія допінгавыя скандалы... Бяда чыноўнікаў ад спорту ў тым, што яны спрабуюць пабудаваць дом, пачынаючы з даху. Разлік ідзе на імгненны вынік, без працы на перспектыву... Няма дастатковага фінансавання дзіцяча-юнацкіх школ, адсюль і няма вынікаў.

Паглядзіце, якія віды спорту развіваюцца сёння ў Беларусі — хакей з футболам. Усё ад таго, што адзін вядомы дзеяч вельмі любіць хакей, а яго атачэнне, напэўна, паважае футбол... Пры гэтым у Беларусі ніколі не было моцных традыцый у гэтых відах спорту. Вось і атрымліваецца, што грошай на астатнія, алімпійскія віды спорту не застаецца. Алімпіяда ў Пекіне толькі пацвердзіць гэты тэзіс".

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

В Минске пройдет чемпионат Европы по тяжелой атлетике

На заседании исполкома Европейской федерации тяжелой атлетики в Италии 12 апреля было единогласно принято решение о том, что чемпионат Европы по тяжелой атлетике в 2010 году пройдет в Минске. Об этом БелаПАН сообщила пресс-служба Государственного таможенного комитета, председателем которого является Александр Шпилевский, возглавляющий Белорусский тяжелоатлетический союз.

"Членами исполкома был отмечен высокий уровень развития спортивной инфраструктуры Беларуси, зрительский интерес к данному виду спорта, а также высокие достижения белорусских тяжелоатлетов. Кроме того, Беларусь уже имеет опыт проведения подобных соревнований на высоком международном уровне. В 2004 году в Минске прошел чемпионат мира по тяжелой атлетике среди юниоров. В преддверии принятия решения состоялось три визита делегации Европейской федерации тяжелой атлетики во главе с генеральным секретарем Марино Эрколани Касадеем", — отмечается в сообщении.

ШАХМАТЫ

Находка Юдит Полгар

Замечательная венгерская шахматистка Юдит Полгар вот уже более 15 лет уверенно возглавляет рейтинг-лист ФИДЕ среди женщин. Более того, и среди мужчин Полгар, единственная из шахматисток, входит в число элитной группы гроссмейстеров, располагаясь, как правило, в сильнейшей двадцатке. Последнее время Юдит заинтересовалась и составлением этюдов. Один из них, получивший специальный приз на международном конкурсе, предлагаем вниманию наших читателей.

Ю.Полгар

Белые: Крh8, пп.a4, b2 (3).
Черные: Крh1, пп. a6, b7 (3).
Выигрыш.

На почти пустой доске, кроме королей, у белых и черных всего по две пешки. Ну что, казалось, можно найти в этой пустыне? Но не спешите с выводами. Сначала, естественно, идет сближение королей. 1.Крg7 Крg2 2.Крf6 Крf3 3.Кре5 Кре3 (Не помогает 3...a5 ввиду 4.Крd6 Кре3 5.Крс7 Крd4 6.Кр:b7 Крс5 7.Кра6 Крb4 8.b3, и белые выигрывают.) 4.a5! Крd3 5.Крd5 Крс2 6.Крd6! Квинтэссенция замысла белых. Напрашивающееся 6.Крс5? после 6...Крb3! 7.Крb6 Кра4! 8.b3+ Крb4 приводила к позиции взаимного цугцванга, который оказывался в пользу черных. (6...Крb3 7.Крс5!) Но не 7.Крс7? Крb4! 8.Крb6 Кра4 9.b3+ Крb4 с ничьей ввиду очереди хода белых (7...Кра4 8.Крb6 Крb4 9.b3!, и взаимный цугцванг теперь в пользу белых.)

Призеры "Аэрофлот-опен-2008"

В Москве прошел традиционный международный шахматный фестиваль "Аэрофлот-опен-2008", в котором приняли участие несколько сотен шахматистов. Соревнования проводились в четырех группах, укомплектованных в соответствии с рейтинговыми показателями.



В главном турнире "А" играли гроссмейстеры с высоким рейтингом. Турнир проводился по швейцарской системе в 9 туров. Сенсационную победу одержал 17-летний российский шахматист Ян Непомнящий. В 9 встречах он набрал 7,5 очка. Вместе с призом в 30.000 долларов Непомнящий завоевал право выступить на супергроссмейстерском турнире, который состоится летом в немецком Дортмунде. На пол-очка от победителя отстали элитные российские гроссмейстеры Александр Мотылев и Алексей Дреев, разделившие 2-3-е места. По 6 очков в активе гроссмейстеров М.Родштейна (Израиль), А.Волокитина (Украина), Б.Грачева (Россия), Г.Гусейнова (Азербайджан) и Ф.Амонатова (Туркмения), разделивших 4-8-е места. В число призеров (призовыми были первые 30 мест) вошел минчанин международный гроссмейстер Сергей Азаров. Он набрал 5,5 очка, это принесло ему 14-е место. Слабее результаты у других наших шахматистов. Андрей Жигалко набрал 4,5 очка и занял 38-е место, у Сергея Жигалко 4 очка, 42-е место, у Алексея Александрова — 3 очка из 8, соответственно, 64-е место.

В турнире "А-2" минчанин международный мастер Сергей Михайловский набрал 4,5 очка из 9 и занял 45-е место, у гроссмейстера Юрия Тихонова (Минск) — 4 очка, 68-е место.

Успешнее выступили белорусские шахматисты в турнире "Б". Здесь отличился гроссмейстер Виктор Купрейчик, который с 7 очками разделил 1—7-е места. По дополнительным показателям минчанин получил пятый приз. Международный мастер Дмитрий Новицкий (Минск) финишировал с результатом 6 очков из 9, 19-е место, международный мастер Герман Кочетков (Бобруйск) набрал 5,5 очка, что принесло ему лишь 25-е место.

М.Карлсен рвется к олимпу

Традиционный супергроссмейстерский турнир Морелия—Линарес вызвал большой интерес любителей шахмат во всем мире. В турнире приняли участие чемпион мира Вишванатан Ананд (Индия), экс-чемпион мира Веселин Топалов (Болгария), гроссмейстеры из первой мировой десятки Василий Иванчук (Украина), Алексей Широв (Испания), Петер Леко (Венгрия), Магнус Карлсен (Норвегия), Теймур Раджабов (Азербайджан), Левон Аронян (Армения). Соревнования прошли в два круга. Первый из них состоялся в городе Морелия (Мексика). Его выиграл чемпион мира, набравший 4,5 очка из 7 возможных. Всего на пол-очка меньше было в активе В.Топалова и А.Широва. Решающие сражения продолжались в испанском Линаресе. В.Ананд сумел удержать лидерство, набрав во втором круге 4 очка в 7 встречах. Таким образом чемпион мира подтвердил свой класс, завоевав первый приз. Весь турнир Ананд провел без единого поражения. Но главной сенсацией стал результат вундеркинда из Норвегии, 17-летнего Магнуса Карлсена. Во втором круге он показал абсолютно лучший итог — 4,5 очка из 7. В результате он финишировал вторым, отстав от чемпиона мира всего на пол-очка. Если вспомнить, что месяцем ранее Карлсен стал победителем супертурнира в голландском Вее-ан-Зее, где опередил чемпиона мира, экс-чемпиона В.Крамника и других сильнейших гроссмейстеров, то напрашивается вывод, что, несмотря на юный возраст, норвежец уже сейчас может рассматриваться как реальный претендент на шахматную корону. На пол-очка от Карлсена отстали Веселин Топалов и Левон Аронян, разделившие 3—4-е места. У Теймура Раджабова 7 очков, 5-е место. На шестом — Василий Иванчук — 6,5 очка, 7—8-е. Алексей Широв и Петер Леко — по 5,5 очка.

ШАШКІ

"Турэцкі" ўдар

Яго паказвае наш чытач Іван Наўроцкі (Мінск) у заданні № 4 нашага бліцконкурсу-55:

Белыя: a1, a7, e7, f2, f4 (5).
Чорныя: b2, c3, c5, d4, d6, f8 (6).

Выйгрыш.

Пераможца конкурсу будзе заахвочаны. Тэрмін для адказаў звычайны — два тыдні. Чакаем іх па адрасе: **220030, Мінск, вул. Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля", "Шашкі".**

Чэмпіянат Еўропы

Ён прайшоў у Чэлябінскай вобласці па шашках-64 сярод мужчын. У ім удзельнічалі 24 ігракі, у тым ліку 15 гросмайстраў на чале чэмпіёна свету Мікалая Стручкова з Якуціі. Але ж перамогу атрымаў чэмпіён свету па шашках-100 масквіч Аляксандр Шварцман. Другі прыз заваяваў міжнародны гросмайстар Іван Такусараў (Якуція), трэці — гросмайстар Расіі з Чэлябінска Пётр Чарнышоў. У бліцтурніры мацнейшымі былі экс-чэмпіён свету Алег Дашкоў (Самара), А.Шварцман і І. Такусараў.

Беларусь прадстаўлялі Сяргей Бурко (Орша) і Яўген Кандрачэнка (Гомель). У галоўным турніры першы з іх заняў высокае сёмае месца і выканаў норму для прысваення яму звання майстра ФМЖД, другі — восьмае і ўжо будзе міжнародным майстрам, а ў бліцы ён быў нават чацвёртым. Дарэчы, С. Бурко і Я. Кандрачэнка неаднойчы прымалі ўдзел у нашых конкурсах рашэнняў шашачных кампазіцый.

Пастаянны карэспандэнт нашай рубрыкі "Шашкі" Я. Кандрачэнка перадаў нам па тэлефоне найцікавейшы момант з гэтых спаборніцтваў:

Белыя (М.Стручкоў): a3, b2, d2, f2, f4, g3, h2, h4 (8).
Чорныя (міжнародны гросмайстар Сяргей Белашэеў, Еўпаторыя): a5, c5, c7, d4, d6, e5, f6, h6 (8).



Ход чорных. Яны прадэманстравалі невераготны ўзровень гульні і выйгралі партыю. Пераканайцеся ў гэтым самі.

Вышэйшая ліга

Яна адбылася ў першынстве краіны па тых жа шашках-64, але сярод жанчын. Вікторыю ў ім святкавала сталічная гімназістка Дар'я Федаровіч. Яна заваявала права выступіць у складзе каманды Беларусі на першых Сусветных інтэлектуальных гульнях у Пекіне, якія чакаюцца ў кастрычніку. Другая ўзнагарода ўручана вопытнай Марыне Навіцкай (Мар'іна Горка), трэцяя —Алене Шпакавай (Мінск).

Вам будзе карысна пазнаёміцца з прыкладамі гульні ўдзельніц гэтага форуму:

1.**Белыя** (А.Шпакава): a3, f4, g3, h2, h4, дамка f8 (6).
Чорныя (М.Навіцкая): a5, e5, g7, h6, дамка e1 (5).
1 ... gf6! 2. f:d6 fg5 3. h:f6 e:c5 4. f:b4 a:c3x.
2.**Белыя** (Ганна Крашко, Слонім): c1, f4, g5 (3).
Чорныя (Марыя Лічко, в.Возера Уздзенскага раёна): b4, d4, g7 (3).
1. gh6 dc3! 2. h:a3 cb2=.

Нам прыемна падкрэсліць, што М.Лічко і зараз з'яўляецца ўдзельніцай нашых конкурсаў.

Самаправерка

Давайце зробім яе на папярэдніх заданнях.

Бліц-55/3 (С.Грэбень): 1. fg5 h6:b4 2. fg7 3. cd2 4. de3 5. e:g7 ef6 6. g:e5 de7 7. fg3 8. g:e3 ab6 9. ed4x.

"Аналітык Пятровіч": № 5. 1. cb4! hg3A 2. de3 3. ab6 ae5 4. ba7 b8 5. bc5 gf2 6. ab4 fe1 7.cd6! b:h2 8. ab8 9. ba7=. A1... fa7 2. bc5 a:c1 3. ab6 cf4 4. ba7 fb8 5. ab4! hg3 6. bc5=.

Практычныя пазіцыі

Іх даслалі нашы чытачы і яны заслугоўваюць вашай увагі:

1 (Аляксандр Іванькоў, в.Мормаль Жлобінскага раёна). **Белыя:** a3, a5, f2, h4 (4).
Чорныя: d4, e5, f6 (3).

Заканчэнне аматарскай партыі: 1. ab4 ef4 2. bc5 3. a:c7 fg3 4. fe3 gh2 5. hg5! 6. cb8 hg3 7. ba7 hg1 8. ed4x.

2 (Дзмітрый Слясарчык, Гродна). **Белыя:** b2, g7, дамка h6 (3).
Чорныя: b4, дамка g1 (2).

Своеасаблівы "слупняк" на вялікай дарозе: 1. hd2 gd4! 2. d:a5! d:h8 3. ac3x.

3—4 (Анатоль Пярхальскі, Глыбокае, сааўтар Мікалай Грушэўскі, Мінск). **Белыя:** a5, b2, c3, f2, g3 (5).
Чорныя: c5, d4, e5, f6 (4).
1. gf4 2. a:g7 cd4 3. gh8 de3 4. gd4! 5. bc3x.
Белыя: a5, b2, d2, f2, h4 (5).
Чорныя: c5, d4, e7, f6, f8, g3, g5 (7).
1. dc3 2. a:g7 3. h:d8 cd4 4. db6!x.

5 (Уладзімір Мазанік, Мінск). **Белыя:** a1, a7, d4, e5, f4, g3, h6 (7).
Чорныя: a3, a5, b2, b4, c3, c7, d6 (7).

Перавагу дае ахвяра дзвюх дамак. Пашукайце механізм камбінацыі самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Мікалай ГЛАДКІ.

ВНЕ ИГРЫ

Мы за ценой не постоим

В Минске побывал канадский тренер Джон ПЭДДОК, который, скорее всего, возглавит новый белорусский хоккейный суперклуб.

Мечты становятся реальностью. В Москве прошла жеребьевка участников чемпионата Континентальной лиги, в которой будет играть в новом сезоне и белорусский клуб. Последнему название путем голосования определили наши болельщики и, надо сказать, оригинальностью они не блеснули — "Динамо" (Минск).

А сама жеребьевка разбила команды на четыре дивизиона. Дивизион Тарасова: "Металлург" (Магнитогорск), ЦСКА (Москва), СКА (Санкт-Петербург), ХК МВД (Московская обл.), "Трактор" (Челябинск), "Автомобилист" (Екатеринбург). Дивизион Чернышева: "АК Барс" (Казань), "Динамо" (Москва), "Нефтехимик" (Нижнекамск), "Витязь" (Чехов), "Торпедо" (Нижний Новгород), "Барыс" (Астана). Дивизион Харламова: "Авангард" (Омская обл.), "Локомотив" (Ярославль), "Лада" (Тольятти), "Сибирь" (Новосибирск), "Амур" (Хабаровск), "Динамо" (Рига). Дивизион Боброва: "Салават Юлаев" (Уфа), "Атлант" (Московская обл.), "Северсталь" (Череповец), "Металлург" (Новокузнецк), "Спартак" (Москва), "ДИНАМО" (Минск).

Итак, в новом проекте под названием КХЛ представлены все российские команды, за исключением трех "иностранных" — минского и рижского "Динамо" и казахского "Барыса". Надо сказать, что эти представители ближнего зарубежья при жеребьевке смотрели не только на силу соперников, которые им достались, но и на географию. И в этом смысле белорусам повезло больше. Потому что летать в Москву и даже Новокузнецк не так накладно, как за 9 тысяч километров в Хабаровск, что рижанам и "подфартило".

"Сейчас мы заявляем в КХЛ одну команду, — рассказал в Москве российским журналистам председатель Федерации хоккея Беларуси Владимир НАУМОВ. — *А года через три, надеюсь, в лиге будет уже три наших клуба... Бюджет клуба составит 15—17 миллионов долларов, а тренера подыскиваем. Из кандидатур — Джон Пэддок, в этом сезоне уволенный из "Оттавы". Еще один кандидат — Пол Гарднер, тренировавший "Локомотив".*

Отметим, что в этой дуэли преимущество отдают Джону Пэддоку. Подтверждением этому стало то, что он точно в день жеребьевки прибыл в белорусскую столицу.

Джон Пэддок был отправлен в отставку с поста главного тренера клуба НХЛ "Оттава Сенаторз" вместе со своим помощником Роном Лоу в конце февраля этого года за серию неудач команды. Генеральный менеджер клуба Брайан Мюррэй, который, будучи наставником "сенаторов", в прошлом сезоне вывел их в финал Кубка Стэнли. Кроме того, Джон Пэддок с 1991-го по 1995 годы руководил командой "Виннипег Джетс".

Как стало известно, Пэддока посоветовал нашей Федерации главный тренер белорусской сборной Курт Фрэйзер. Сам Пэддок пока скромно говорит, что контракт еще не подписывал и добавляет: "Мне его, в принципе, еще не предлагали". Но не скрывает, что был бы рад поработать в Минске.

Что касается 50-летнего Пола Гарднера, то до недавнего времени он был главным тренером ярославского "Локомотива". И, наверное, более известен как центральный нападающий, чем талантливый тренер. До Ярославля Гарднер работал помощником главного тренера в "Нэшвилле", а затем в его тренерской работе был двухлетний тайм-аут.

Кому будет отдано предпочтение — неизвестно. Вчера Джон Пэддок был на встрече с председателем Федерации хоккея Владимиром Наумовым, на которой белорусская сторона, надо полагать, предложила свои условия. Старт КХЛ только осенью, поэтому время подумать еще есть.

Алесь СИВЫЙ.

КОММЕНТАРИЙ ПО ДЕЛУ

Святослав КИСЕЛЕВ, генеральный менеджер Федерации хоккея Беларуси:

— Встреча Джона Мэддока с председателем нашей Федерации состоялась, еще до этого тренеру было сделано конкретное предложение. Сейчас шло знакомство Мэддока с бытовыми условиями. Потому что, если он сюда приедет, то приедет с семьей. Прошли консультации, вроде всем доволен.

— А что слышно по второй кандидатуре Гарднера?

— Почему только Гарднера? Я вам более того скажу! Есть еще очень много кандидатур... Но Джон Мэддок чуть предпочтительнее для нас. Ведь его предложили Курт Фрэйзер и экс-наставник нашей сборной Глен Хэнлон.

Юрый РАМАНАЎ: «Хачу быць мацнейшым на планеце»

Малады беларускі баксёр Юрый Раманаў у трэці раз запар адстаяў званне чэмпіёна Еўропы. У Лондане нашаму спартсмену супрацьстаяў брытанскі баксёр Джонатан Такстан.

Раманаў атрымаў перамогу над англічанінам у шостым раундзе з дапамогай тэхнічнага накаўта. На сустрэчы з журналістамі Раманаў выглядаў цалкам шчаслівым чалавекам. Праўда, было прыкметна, што нядаўна малады чалавек моцна біўся — пад левым вокам Раманава "красаваўся" сіняк: *"Бокс — не шахматы,* — усміхаецца Юрый. — *Для таго, каб адстаяць тытул у трэці раз, даводзілася шмат трэніравацца. Але тое, што англічанін мне цалкам па сіле, я канчаткова зразумеў у шостым раундзе нашага бою, калі і перамог саперніка".*

Зараз у планах Раманава — падрыхтоўка да наступнага паядынку: *"Паспрабую замахнуцца на тытул чэмпіёна свету. Хачу быць мацнейшым на планеце,* — кажа Юрый. — *Кандыдатура будучага саперніка пакуль не вызначана. Хаця, верагодна, што паядынак пройдзе ў канцы гэтага года".*

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 16.04.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №